Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«ГРОДЗЕНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ
ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ»

# ТЭМАТЫКА ПРАКТЫЧНЫХ ЗАНЯТКАЎ І МЕТАДЫЧНЫЯ ПАРАДЫ ПА КУРСЕ «ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ»

для студэнтаў негістарычных
спецыяльнасцей

Гродна 2002

УДК 947.6(076)
ББК 63.3(4Беі)
Т96

Складальнікі: І.П.Крэнь, В.А.Белазаровіч, С.У.Сілава, І.В.Соркіна,
В.В.Калюта, С.У.Амелька

Пад агульнай рэд. заг. кафедры гісторыі Беларусі прафесара І.П.Крэня.

Рэцэнзенты: кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі славянскіх дзяржаў ГрДУ В.Э.Працэнка;

кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін Гродзенскага аграрнага універсітэта А.І.Шаланда.

Рэкамендавана саветам факультэта гісторыі і культуры ГрДУ імя Я. Купалы.

Т96 **Тэматыка** практычных заняткаў і метадычныя парады па курсе «Гісторыя Беларусі» /Пад агульн. рэд. праф. І.П.Крэня / Склад. І.П.Крэнь і інш. — Гродна: ГрДУ, 2002. – 95 с.

Прапануюцца тэматыка і планы семінарскіх (практычных) заняткаў, крыніцы і літаратура да іх, тэмы рэфератаў, праверачныя тэсты, спіс рэкамендуемай літаратуры.

**УДК 947.6(076)**
**ББК 63.3(4Беі)**

© Афармленне.
ГрДУ імя Я.Купалы, 2002

# ПРАДМОВА

Адной з найбольш важных і істотных рысаў нацыянальнай гістарыяграфіі з’яўляецца разуменне айчыннай гісторыі як арганічнай часткі еўрапейскай і сусветнай гісторыі, аналіз падзей нацыянальнай гісторыі ў кантэксце сусветнага гістарычнага працэсу. Гэты падыход дазваляе найбольш поўна і дакладна паказаць супярэчлівасць, шматварыянтнасць і разам з тым адзінства і цэласнасць гістарычнага працэсу, месца і ролю ў ім Беларусі. Узнікла неабходнасць увядзення ў праграмы ВНУ інтэграванага курса айчыннай гісторыі «Гісторыя Беларусі (у кантэксце сусветнай цывілізацыі)», які прадугледжвае асвятленне нашай мінуўшчыны на фоне і ў цеснай сувязі з агульнаславянскай, еўрапейскай і сусветнай гісторыяй з шырокім выкарыстаннем гістарычна-параўнальнага метаду.

Складальнікі імкнуліся не пазбягаць складаных і дыскусійных пытанняў, бачылі сваю задачу ў стварэнні ўмоваў для спробы студэнтаў самастойна даць ацэнку тым ці іншым падзеям нашай гісторыі. Шмат якія праблемы далёкія яшчэ ад канчатковага вырашэння. Галоўнае, на нашу думку, што шэраг матэрыялаў дадзенага выдання прымусіць студэнтаў разважаць, задумвацца, уважліва ўглядацца ў здабыткі і праблемы нашай гісторыі.

Выданне складзена на аснове дзеючай праграмы «Гісторыя Беларусі» для студэнтаў негістарычных спецыяльнасцей ВНУ (зацверджана Міністэрствам адукацыі РБ 24 студзеня 2000 г., № ТД-67/тып.). Яно ўтрымлівае тэматыку і планы семінарскіх (практычных) заняткаў, крыніцы і літаратуру да іх. Для паглыбленага вывучэння прапануюцца прыкладныя тэмы рэфератаў па асобных праблемах і пытаннях гісторыі Беларусі. Да кожнай тэмы заняткаў ёсць праверачныя тэсты, разлічаныя як на веданне фактычнага матэрыялу, так і на яго аналіз. Адказваючы на іх, студэнты могуць ацаніць ступень засваення і разумення той ці іншай тэмы айчыннай гісторыі. Такім чынам, праз комплекс гэтых складальных частак раскрываюцца сістэма і методыка самастойнай працы. Складальнікі бачылі сваю задачу ў тым, каб дапамагчы студэнтам замацаваць і паглыбіць матэрыялы лекцый па курсе «Гісторыя Беларусі (у кантэксце сусветнай цывілізацыі)», навучыць іх рацыянальным метадам працы з першакрыніцамі, вучэбнай і навуковай літаратурай.

Тэматыка семінарскіх (практычных) заняткаў распрацавана ў адпаведнасці з вызначанай колькасцю гадзін для іх – 30 гадзін (ці 15 заняткаў). Складальнікі імкнуліся дэталёва акрэсліць кола вывучаемых пытанняў да кожнай тэмы. Таму планы заняткаў аб’ёмныя, структура іх складаецца пераважна з ключавых праблем, якія ў сваю чаргу падзяляюцца на шэраг пытанняў і падпытанняў. Дзякуючы гэтаму раскрываецца паслядоўнасць вывучэння матэрыялу, акцэнтуецца ўвага на вузлавых момантах кожнай тэмы, якія студэнты абавязкова павінны засвоіць. Неабходна адзначыць, што ўсе заняткі пачынаюцца з разгляду агульных тэндэнцый развіцця еўрапейскай і сусветнай цывілізацый у адпаведны перыяд, пасля чаго адбываецца пераход да вывучэння непасрэдна пытанняў айчыннай гісторыі. Такі падыход да распрацоўкі пла-

наў практычных заняткаў дазваляе ўявіць падзеі і працэсы гісторыі Беларусі ў кантэксце сусветнага гістарычнага працэсу, убачыць месца і ролю нашага краю ў той прасторы, якую мы называем «сусветная гісторыя». Пры гэтым складальнікі прытрымліваліся зместу вучэбнай праграмы па дадзеным курсе і імкнуліся не выходзіць за рамкі акрэсленага ў ёй кола пытанняў і праблем, а таксама набору асноўных дыдактычных адзінак, згрупаваных у канцэптуальна-лагічныя блокі.

Змяшчаецца пералік неабходнага мінімуму гістарычных крыніц і літаратуры. Студэнты спачатку павінны прагледзець канспект лекцый выкладчыка, прысвечаных вывучаемай тэме, затым неабходна звярнуцца да адпаведнага матэрыялу ў падручніку ці вучэбным дапаможніку. Пасля гэтага студэнтам трэба пераходзіць да вывучэння крыніц. Іх пералік даецца па кожнай прапануемай у выданні тэме. Рэкамендаваныя крыніцы змешчаны ў зборніках дакументаў, хрэстаматыях па гісторыі Беларусі, ў энцыклапедыях і г.д. Яны, як правіла, ужо апрацаваныя, што палягчае працу студэнтаў над канкрэтнымі дакументамі, іх успрыняцце і выкарыстанне, але не пазбаўляе ад крытычных адносін да іх зместу і трактоўкі. Прапанаваныя выданні крыніц не заўсёды свабодныя ад пэўнага ідэалагічнага ўздзеяння на іх аўтараў і складальнікаў. Трэба ўлічваць час выдання гістарычных крыніц і крытычна ставіцца да іх зместу. Ад умення крытычна ацаніць і правільна выкарыстаць крыніцы залежыць якасць вывучэння тэмы. Таму студэнтам рэкамендуецца, у асобных выпадках, звярнуцца да крыніцазнаўчай літаратуры, а на занятках пад кіраўніцтвам выкладчыка надаць увагу методыцы і прыёмам працы з гістарычнымі крыніцамі.

Заключным момантам у падрыхтоўцы да семінарскіх (практычных) заняткаў з'яўляецца вывучэнне рэкамендуемай літаратуры. У спіс яе складальнікі ўключылі падручнікі, курсы лекцый, вучэбныя дапаможнікі, абагульняючыя навуковыя працы, манаграфічныя і навукова-папулярныя выданні, навуковыя артыкулы.

Матэрыял з падручніка ці вучэбнага дапаможніка прачытваецца студэнтамі, а навуковая літаратура і, у асобных выпадках, некаторыя крыніцы вывучаюцца і канспектуюцца ў спецыяльных сшытках для практычных заняткаў па курсе. Пры падрыхтоўцы да заняткаў неабходна выкарыстоўваць краязнаўчы матэрыял. Актыўнае яго ўжыванне мае дзве мэты. Па-першае, ён выкарыстоўваецца ў якасці ілюстрацыі і канкрэтызацыі вядомых палажэнняў, агульнапрынятых у гістарычнай літаратуры. Па-другое, многія матэрыялы краязнаўчага характару дазваляюць выйсці за рамкі ілюстрацыйнага метаду, пертвараюцца ў крыніцу атрымання новых ведаў, пашыраюць навуковы кругагляд студэнтаў.

Станоўчую ролю пры падрыхтоўцы студэнтаў да практычных заняткаў адыгрываюць кансультацыі. Кожны студэнт пры неабходнасці можа атрымаць яе ў выкладчыка. Патрэбную дапамогу акажуць і супрацоўнікі міжфакультэцкага кабінета гісторыі Беларусі.

Прапануемае выданне, зразумела, не пазбаўлена недахопаў. Складальнікі прымуць з удзячнасцю ўсе заўвагі, прапановы і парады, накіраваныя на яго паляпшэнне.

ТЭМА 1

# СПАДЧЫНА СТАРАЖЫТНАГА СВЕТУ І ЯЕ ЎПЛЫЎ НА БЕЛАРУСЬ

## План

1. Фарміраванне эйкумены ў палеаліце і мезаліце. Першыя цывілізацыі ў свеце.

2. Даіндаеўрапейскі перыяд этнічнай гісторыі Беларусі. Жыццё людзей ва ўмовах каменнага веку.

3. Тэрыторыя Беларусі ў старажытных геапалітычных, эканамічных і культурных умовах. «Вялікае перасяленне народаў» і Беларусь. Балцкі этап этнічнай гісторыі Беларусі.

4. Славянізацыя Усходняй і Цэнтральнай Беларусі. Грамадскі лад, заняткі і рэлігія ўсходніх славян на беларускіх землях у VI–VIII ст.

## Крыніцы

1. Белоруссия в эпоху феодализма: Сборник документов и материалов: В 3 т. – Мн.: АН БССР, 1959. – Т. 1. – С. 23 – 34.

## Асноўная літаратура

1. История: Учебное пособие для вузов. – Ростов-на-Дону: Феникс, 2000. – С. 31 – 101.

2. Альдебер Ж., Бендер Й., Груша И. и др. История Европы. – Мн.: Выш. шк., 1996. – С. 32 – 91.

3. Гісторыя Беларусі: У 2 ч. – Мн., 2000. – Ч. 1. – С. 12 – 35.

4. Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т.1: Старажытная Беларусь: Ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст./Рэдкал.: М.Касцюк (гал. рэд.) і інш. – Мн.: Экаперспектыва, 2000. – Т. 1. – С. 21 – 148.

5. Гісторыя Беларусі: Вучэбны дапаможнік: У 2 ч. /Пад рэд. Я.К.Новіка, Г.С.Марцуля. – Мн.: Універсітэцкае, 1998. – Ч.1. – С. 17 – 44.

6. Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 ч. / М.П.Касцюк, У.Ф.Ісаенка, Г.В.Штыхаў і інш. – Мн.: Беларусь, 1994. – Ч.1. – С. 9 – 50.

7. Пашуто В.Т., Флоря Б.Н., Хорошкевич А.Л. Древнерусское наследие и исторические судьбы восточных славян. – М.: Наука, 1982. – 263 с.

8. Загорульский Э.М. Древняя история Белоруссии: Очерки этнической истории и материальной культуры (до IX в.). – Мн.: БГУ, 1977. – 136 с.

9. Штыхов Г.В. Археологическая карта Белоруссии. Вып. 2: Памятники железного века и эпохи феодализма. – Мн.: Полымя, 1971.

10. Пілецкі В. Першабытны лад у гісторыі Беларусі // Гісторыя: праблемы выкладання. – 1999. – № 3. – С. 6; № 4. – С. 3.

11. Археалогія і нумізматыка Беларусі: Энцыклапедыя. – Мн.: БелЭн, 1993. – С. 7 – 11, 47 – 48, 70 – 72, 237 – 238, 344 – 345, 494 – 496, 531.

12. Лойка Л. Этнагенез беларусаў на фоне гісторыі і геапалітыкі // Беларуская мінуўшчына. – 1997. – № 4. – С. 23 – 28; № 5. – С. 28 – 32; № 6. – С. 20 – 26.

## Тэмы рэфератаў

1. Навука і рэлігія аб паходжанні чалавека на Зямлі.
2. Побыт першабытнага чалавека, яго духоўны свет.
3. Старажытныя вераванні насельніцтва Беларусі.
4. Першабытнае мастацтва на тэрыторыі Беларусі.

Гісторыя сусветнай цывілізацыі налічвае шмат стагоддзяў. Існуюць розныя гіпотэзы аб паходжанні чалавека на Зямлі. Сярод іх можна выдзеліць наступныя:

1) рэлігійную;
2) антрапалагічную і касмагенныя міфы;
3) эвалюцыйную.

Раскрыйце змест кожнай з гіпотэз, карыстаючыся вучэбнай літаратурай, паразважайце, вызначце свае адносіны да іх.

Згодна з апошнімі археалагічнымі раскопкамі першыя людзі на Зямлі з'явіліся ў Афрыцы прыкладна 5 млн. гадоў таму (адкажыце, як называліся старажытныя чалавекападобныя істоты на працягу сваёй эвалюцыі, знайдзіце на карце свету тэрыторыю іх рассялення).

Прыкладна мільён гадоў таму людзі засялілі Міжземнамор'е, потым Каўказ і поўдзень Украіны. Найбольш працяглым перыядам станаўлення і развіцця чалавека быў палеаліт, які працягваўся звыш 2 мільёнаў гадоў (прыгадайце археалагічную перыядызацыю сусветнай гісторыі, назавіце асноўныя яе перыяды).

Людзі на тэрыторыі Беларусі з'явіліся ў перыяд верхняга палеаліта (назавіце, колькі ён доўжыўся, дзе знаходзіліся стаянкі старажытных людзей).

Разглядаючы этнічную гісторыю Беларусі, неабходна ўлічыць, што яе можна ўмоўна падзяліць на 2 перыяды:

1) даіндаеўрапейскі (40 тыс. да н.э. – 3–2 тыс.);
2) індаеўрапейскі (3-2 тыс. да н.э. – да нашых дзён):

а) балцкі этап (3-2 тыс. гг. да н.э. – 4-5 ст.)

б) славянскі этап (4-5 ст. н.э. – да нашага часу).

Ахарактарызуйце кожны перыяд па наступнаму плану.

1. Стаянкі (вызначце іх на карце).

2. Умовы жыцця.

3. Прылады працы, заняткі.

4. Вераванні старажытных людзей.

Трэба ўлічыць, што Беларусь, вядома, не з'яўляецца прарадзімай чалавецтва, але яна ўваходзіць у айкумену-тэрыторыю, якая ў палеаліце была заселена людзьмі.

Прыкладна 10 000 тыс. да н.э. Паўночная Еўропа вызваляецца ад ільда. Перыяд земляробчай супольнасці з'яўляецца ў розных частках свету, у тым ліку ў Кітаі, Афрыцы і Цэнтральнай Амерыцы. Разглядаючы старажытныя цывілізацыі Бліжняга Усходу (Міжрэчча, з якога ўзнік Шумер і Месапатамія), Старажытнага Егіпта, Старажытнай Грэцыі і Старажытнага Рыма, звярніце ўвагу на эвалюцыйны характар гістарычнага працэсу і на тыя здабыткі, якія пакінулі нам гэтыя цывілізацыі, асобна спыніцеся на антычнай спадчыне.

Вялікае перасяленне народаў змяніла твар Еўропы. Успомніце, якое па этнічнай прыналежнасці насельніцтва жыло на тэрыторыі Беларусі да з'яўлення там індаеўрапейцаў. Прасачыце на карце асноўныя хвалі вялікага перасялення народаў.

З'яўленне на тэрыторыі Беларусі славян было вынікам апошніх хваляў вялікага перасялення народаў. Пытанне аб паходжанні славян вельмі складанае. Назавіце асноўныя канцэпцыі паходжання славян і паразважайце над гэтым.

Вызначце на карце славянскія плямёны на тэрыторыі Беларусі (дрыгавічы, крывічы, радзімічы). Характарызуючы славянскія плямёны Беларусі, спыніцеся на:

1) тэрыторыі іх рассялення;

2) занятках;

3) грамадскім ладзе, ролі веча;

4) веры (язычніцтве).

Для больш глыбокага раскрыцця тэмы мэтазгодна выкарыстанне відэафільмаў: «Мастацтва старажытных людзей на Беларусі», «Беларусь – краіна ў цэнтры Еўропы», «Усходнія славяне на тэрыторыі Беларусі»; дыяпазітываў з музычным суправаджэннем: «Міфы беларуса» (у 2 частках); дыяфільма «Жизнь людей при первобытном обществе»; картаў «Первобытный строй на территории нашей страны», «Восточная Римская (Византийская) империя и славяне в V – XI в.».

## Праверачны тэст

**I.** Дайце тлумачэнне наступных паняццяў:
а) рэфлексія;
б) гістарычная свядомасць;
в) цывілізацыя;
г) неалітная рэвалюцыя;
д) матрыярхат;
е) патрыярхат.

**II.** Падбярыце правільны адказ:
1. Каменны век – гэта:
а) перыяд у развіцці чалавецтва, калі з'яўляюцца жалезныя прылады працы;
б) перыяд у развіцці чалавецтва, калі зброя і прылады працы выраблялiся з каменя, часткова косці і дрэва, у гэты перыяд узнікаюць мастацтва і рэлігія;
в) перыяд у развіцці чалавецтва, калі з'яўляюцца машыны.

2. Айкумена (Эйкумена):
а) геаграфічна акрэсленая тэрыторыя кампактнага пражывання насельніцтва;
б) рай;
в) тэрыторыя ў палеаліце, заселеная чалавекам.

3. Краманьёнец з'явіўся ў:
а) палеаліце;
б) мезаліце;
в) неаліце.

4. На тэрыторыі Беларусі першыя людзі з'явіліся прыкладна:
а) 200 – 300 т. г.т.;
б) 100 – 35 т. г.т.;
в) 70 – 60 т. г.т.

5. 26 – 23 т. г.т. – гэта стаянкі на тэрыторыі Беларусі ў:
а) Абідавічах;
б) Свяцілавічах;
в) Бердыжжы;
г) Юравічах.

***Адказы***

II. 1 – б; 2 – в; 3 – а; 4 – б; 5 – в, г.

ТЭМА 2

# БЕЛАРУСЬ У ЧАС СТАНАЎЛЕННЯ ХРЫСЦІЯНСКІХ ЦЫВІЛІЗАЦЫЙ

## План

1. Станаўленне хрысціянскіх цывілізацый свету і ўплыў гэтага працэсу на Беларусь.

2. Асаблівасці ўтварэння княстваў на тэрыторыі Беларусі і палітыка іх князёў.

3. Узнікненне гарадоў. Рамяство.

4. Духоўнае жыццё ўсходніх славян. Язычніцтва. Хрысціянізацыя Беларусі. Значэнне прыняцця хрысціянства.

5. Культура Беларусі (IX – XII ст.) у кантэксце развіцця еўрапейскай культуры.

## Крыніцы


1. Беларускія летапісы і хронікі. – Мн.: АН РБ, 1997.

2. Белоруссия в эпоху феодализма: Сборник документов и материалов: В 3 т. – Мн.: АН БССР, 1959 – 1972, – Т. 1. – С. 35 – 79.


## Асноўная літаратура


1. История: Учебное пособие для вузов. – Ростов-на-Дону: Феникс, 2000. – С. 106 – 131.

2. Сусветная гісторыя ад старажытных часоў да канца XVIII ст.: Вучэбны дапаможнік для вучняў 10 кл. – Мн.: Народная асвета, 1994. – С. 93 – 113, 125 – 133, 150 – 155.

3. Альдебер Ж., Бендер Й., Груша И. и др. История Европы. – Мн.: Выш. шк., 1996. – С. 103 – 156.

4. Гісторыя Беларусі: У 2 ч. Ч. 1. – Мн., 2000. – С. 36 – 144.

5. Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 1: Старажытная Беларусь: Ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст. /Рэдкал.: М.Касцюк (гал. рэд.) і інш. – Мн.: Экаперспектыва, 2000. – Т. 1. – С. 123 – 330.

6. Гісторыя Беларусі: У 2 ч. / Пад рэд. Я.К.Новіка, Г.С.Марцуля. – Мн.: Універсітэцкае. – Ч. 1. – 1998. – С. 44 – 73.

7. Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 ч. / М.П.Касцюк, У.Ф.Ісаенка, Г.В.Штыхаў і інш. – Мн.: Беларусь, 1994.

8. Рыбакоў Б.А. Киевская Русь и русские княжества X – XIII в. – М.: Наука, 1982. – 120 с.

9. Алексеев Л.В. Полоцкая земля. Очерки истории Северной Белоруссии в IX – XIII в. – М.: Наука, 1966. – 296 с.

10. Ластоўскі В.Ю. Кароткая гісторыя Беларусі. – Мн.: Універсітэцкае, 1992. – 126 с.

11. Лыч Л., Навіцкі У. Гісторыя культуры Беларусі. – Мн.: Экаперспектыва, 1996. – 126 с.

12. Тарасаў К.І. Памяць пра легенды. Постаці беларускай мінуўшчыны. – Мн.: Полымя, 1990. – 270 с.

13. Грибковский В. А Первые ли Кирилл и Мефодий? Когда возникла у славян письменность? // Бел. думка. – 2000. – № 10. – С. 5 – 12.

14. Ермаловіч М.І. Старажытная Беларусь. Полацкі і Новагародскі перыяды. – Мн.: Маст. літ., 1990. – 366 с.

## Тэмы рэфератаў

1. Прыняцце хрысціянства на Беларусі.
2. Уклад у еўрапейскую культуру Е.Полацкай і К.Тураўскага.
3. Полацкая княжацкая дынастыя.
4. Усяслаў Полацкі, яго асоба і дзейнасць.
5. Праблема Старажытнарускай дзяржавы – Кіеўскай Русі ў гістарычнай літаратуры.
6. Палітычны трохкутнік Кіеў – Полацк – Ноўгарад у другой палове IX – XII ст.

У сярэднія вякі чалавецтва значна крочыла наперад у развіцці матэрыяльнай і духоўнай культуры. Прыгадайце, што тэрмін «сярэднія вякі» ўзнік у Італіі ў XV – XVI ст. у коле гуманістаў. Сярэднявечча, у сваю чаргу, падзяляецца на:

1) ранняе сярэднявечча (канец V – сярэдзіна XI ст.);
2) высокае сярэднявечча (сярэдзіна XI – XV ст.);
3) позняе сярэднявечча (канец XV – XVII ст.).

Распаўсюджанне хрысціянства змяніла твар Еўропы (успомніце, дзе і калі з'явілася гэтая рэлігія, яе асноўныя дагматы і запаветы). У IV ст. у Рымскай імперыі хрысціянства становіцца дзяржаўнай рэлігіяй. Грэка–рымская культура яшчэ існуе, але яна пачынае страчваць свае пазіцыі (растлумачце, чаму так адбывалася, прыгадайце, што пачынае існаваць тэрмін «адна дзяржава – адна рэлігія»). Царква на працягу доўгага часу заставалася звязанай з тым, што прынята называць «хрысціянска-антычнай» культурай, у якой пераплятаюцца духоўныя каштоўнасці новай веры і каштоўнасці рымскай традыцыі (прывядзіце прыклад).

У V – VII ст. германскія плямёны стварылі на захопленых тэрыторыях дзяржавы вандалаў, вест-готаў, остготаў, англаў, саксаў, франкаў (вызначце на карце межы гэтых дзяржаўных аб’яднанняў).

У 486 г. правадыр племені франкаў Хлодвіг з роду Меравея стварыў Франкскую дзяржаву. За гады кіравання Карла Вялікага (768 – 814 г.) Франкская дзяржава стала адной з буйнейшых дзяржаў у Еўропе (вызначце межы дзяржавы, растлумачце, чаму час кіравання Карла Вялікага называюць Каралінчскім Адраджэннем, успомніце, што ў 800 г. папа рымскі абвясціў Карла Вялікага імператарам і галоўным абаронцам хрысціянскай веры ў Еўропе).

Прыгадайце, на якія часткі падзялілася імперыя Карла Вялікага па Вердэнскаму дагавору 843 г.

Трэба ўлічваць, што ў тыя часы, калі Захад перажывае глыбокія змены, Усходне-Рымская імперыя працягвае сваё існаванне. Выбраўшы з IV ст. сваім цэнтрам Канстанцінопаль, імперыя змяніла сваю назву на «Візантыйская імперыя». Ахарактарызуйце яе па схеме:

1) тэрыторыя;
2) заняткі і гаспадарчае жыццё;
3) форма дзяржаўнага кіравання;
4) роля царквы ў дзяржаве;
5) палітыка імператара Юсцініана;
6) кірунак знешняй палітыкі.

Падкрэсліце, што ў 1453 г. туркі захапілі Канстанцінопаль і Візантыйская імперыя перастала існаваць.

У VIII – IX ст. рымская дзяржава распалася, грамадства пачынае грунтавацца на асабістых адносінах паміж людзьмі як у грамадстве, так і ў прыватным жыцці. Узнікае сувязь «гаспадар-васал». Сусвет уступае ў эпоху феадалізму, які быў больш прагрэсіўным грамадскім укладам, які абумовіў больш высокі ўзровень развіцця гаспадаркі, набыло вялікую ролю хрысціянства, складваюцца новыя адносіны паміж людзьмі. Назавіце, што было асновай феадалізму.

Параўнайце гэтыя працэсы ў Заходняй Еўропе з тым, што адбывалася на тэрыторыі Беларусі.

Неабходна ўлічыць і тое, што да VII ст. родаплемянное грамадства на тэрыторыі Беларусі знаходзілася на стадыі ваеннай дэмакратыі. І нельга знайсці межы, дзе пачынаецца феадалізм, утвараецца шматукладнае грамадства, дзе феадалізм паступова перамагаў. Ахарактарызуйце функцыі сялянскай абшчыны («верв», «грамады»). Назавіце формы феадальнага землеўладання і катэгорыі залежных

сялян. Паразважайце над прычынамі ўзнікнення маёмаснай няроўнасці. Вызначце функцыі старабеларускіх гарадоў. Назавіце першыя беларускія гарады.

На землях Усходняй Еўропы працэс утварэння дзяржаўнасці адбываецца ў VIII – X ст. (прыгадайце, калі гэтыя працэсы мелі месца ў Заходняй Еўропе). Падкрэсліце, што крывіцкі Полацк, палянскі Кіеў і славянскі Ноўгарад былі цэнтрамі кансалідацыі ўсходнеславянскіх племянных саюзаў. Назавіце, калі ўпершыню ў летапісах прыгадваецца Полацк. У X – XI ст. Полацкае княства з'яўлялася адным з буйнейшых і магутных на тэрыторыі Усходняй Еўропы і сапернічала з Кіевам і Ноўгарадам у аб'яднанні вакол сябе зямель (прыгадайце гісторыю Рагвалода і Рагнеды, паразважайце аб гэтым).

Асвятляючы Полацкае, Тураўскае княствы, прытрымлівайцеся наступнай схемы:

1) тэрыторыя;
2) гаспадарчае жыццё;
3) форма кіравання:
   а) функцыі князя, дружыны;
   б) роля веча;
4) развіццё гарадоў;
5) кірункі знешняй палітыкі;
6) культурнае развіццё.

З прыняццем хрысціянства беларускія землі ўключыліся ў хрысціянскую цывілізацыю Еўропы (прыгадайце, як і калі было прынята хрысціянства на Беларусі, у якой форме). Вызначце, якую ролю адыграла хрысціянства ў грамадскім, духоўным і культурным жыцці Беларусі і параўнайце гэтыя працэсы з аналагічнымі ў Заходняй Еўропе. Назавіце асветнікаў беларускай зямлі (Е.Полацкая, К.Тураўскі), падрыхтуйце рэфераты аб іх дзейнасці.

Мэтазгодна выкарыстанне відэафільмаў: «Храм» (к 1000-летию крещения Руси), «Древняя Беларусь», «Полацкае княства – першая дзяржава на беларускай зямлі», «Е.Полацкая і яе жыццё», «Тураўскае княства», «Старажытныя беларускія гарады», «Рэлігія і культура стара-беларускіх зямель у X – XII ст.», «Полацкая Сафія»; дыяпазітываў з музычным суправаджэннем «Беларуская ікона»; дыяпазітываў «Архитектура Белоруссии IX – XIII в.»; картаў «Русские княжества IX – XII в.»; «Борьба народов нашей страны против иноземных захватчиков в XIII в.»; «Восточная Римская (Византийская) империя и славяне в VI – XI в.».

## Праверачны тэст

**I.** Дайце тлумачэнне наступных паняццяў:
1) хрысціянства;
2) сярэднявечча;
3) місіянерства;
4) феод;
5) язычніцтва;
6) саслоўе.

**II.** Падбярыце правільны адказ:

1. Падзенне Рымскай імперыі адбылося ў:
а) 476 г.;
б) 584 г.;
в) 332 г.

2. Асветнікі, якія перакладалі на славянскую мову свяшчэннае Пісанне:
а) Уладзімір;
б) Кірыла Тураўскі;
в) Кірыл і Мефодый.

3. Самую магутную франкскую сярэдневяковую дзяржаву ў VIII ст. стварыў:
а) Піпін Кароткі;
б) Карл Вялікі;
в) Эйнгард.

4. Падзел хрысціянства на каталіцтва і праваслаўе адбыўся ў:
а) 1054 г.;
б) 882 г.;
в) 992 г.;
г) 1132 г.

5. Пачаткам утварэння беларускага этнасу з'яўляецца:
а) славянізацыя балтаў у міжрэччы Прыпяці, Дняпра, Зах. Дзвіны;
б) адасабленне Верхняга і Сярэдняга Панямоння ад палачан;
в) аб'яднанне крывічоў, радзімічаў і дрыгавічоў у адзіную супольнасць.

6. Агульны сход гараджан, які вырашаў пытанні вайны і міру, запрашаў князёў, ажыццяўляў вышэйшы суд і кантраляваў дзейнасць князя:

а) магістрат;
б) сойм;
в) веча.

7. Першая згадка аб Полацку:

а) 862 г.;
б) 934 г.;
в) 735 г.

8. У адпаведнасці з сэнсам паняццяў «язычніцтва» і «хрысціянства» неабходна размеркаваць наступныя паняцці на дзве групы: жрэц, святар, капішча, манах, варог, Хрыстос, Велес, Іуда, Пярун, Зеўс, Пасейдон, Апалон, ідал, епіскап, царква, Парнас, крыж, анёл, абраз, Купалле, Макоша, Зюзя, Цётка.

9. Ізяслаў, Брачыслаў, Усяслаў – гэта князі дынастыі ... .

10. У «Слове аб палку Ігаравым» гаворыцца пра князёў беларускіх зямель ... .

11. Кірылічная азбука ў Полацкай зямлі пачала асвойвацца ў :

а) X ст.;
б) XI ст.;
в) XIII ст.

12. Першая жанчына, беларуская асветніца, якая была кананізавана:

а) Рагнеда;
б) Брыгіта;
в) Ефрасіння Полацкая.

13. «Златавустам» называлі:

а) Кірылу Тураўскага;
б) Кліменція Смаляціча;
в) Міколу Гусоўскага.

**III.** Ці згодны вы з наступнымі сцвярджэннямі:

а) галоўная каштоўнасць сярэднявечча – зямля;

б) асноўнымі абавязкамі князя былі арганізацыя войска і збор даніны;

в) Гародня ўпершыню згадваецца ў «Аповесці мінулых гадоў» у 1132 г.;

г) Полацкая епархія была заснавана ў 992 г., і гэты год лічыцца датай прыняцця хрысціянства на Беларусі.

***Адказы***

II. 1. а; 2. в; 3. б; 4. а; 5. а; 6. в; 7. а; 9. Рагвалодавічаў; 10. Ізяслаў; Усяслаў; Чарадзей; 11. б; 12. в; 13. а; III. а) да; б) да; в) не; г) не; 8. 1) жрэц, капішча, Вялес, Пярун, Зеўс, Пасейдон, Апалон, ідал, Парнас, Купалле, Макоша, Зюзя, Цетка; 2) святар, манах, Хрыстос, Іуда, епіскап, царква, крыж, анел, абраз.

## ТЭМА 3

## ВЯЛІКАЕ КНЯСТВА ЛІТОЎСКАЕ, РУСКАЕ І ЖАМОЙЦКАЕ, ЯГО РОЛЯ І МЕСЦА Ў ГІСТОРЫІ ЕЎРОПЫ (2-я ПАЛОВА XIII – 1-ая ПАЛОВА XVI ст.)

### План

1. Прычыны і наступствы феадальнай раздробленасці ў сярэдневяковай Еўропе. Нарастанне тэндэнцый да стварэння цэнтралізаваных шматнацыянальных дзяржаў.
2. Сацыяльна-эканамічныя і палітычныя перадумовы і працэс утварэння ВКЛ. Шляхі ўключэння беларускіх зямель у склад ВКЛ.
3. Унутрыпалітычная сітуацыя ў ВКЛ у апошняй трэці XIV – сярэдзіне XVI ст.
4. Асаблівасці дзяржаўнага і саслоўнага ладу ВКЛ, яго эвалюцыя ў XIV – XVI ст.
5. Сацыяльна-эканамічнае развіццё ВКЛ.
6. Напрамкі знешняй палітыкі ВКЛ.
7. Месца і роля ВКЛ у еўрапейскай гісторыі.

### Крыніцы

1. Белоруссия в эпоху феодализма: Сборник документов и материалов: В 3 т. – Мн.: АН БССР, 1959. – Т.1. – С. 79 – 138.

2. Помнікі старажытнай беларускай пісьменнасці. – Мн.: Беларусь, 1975. – С. 18 – 28.

3. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 г. Тэксты. Даведнік. Каментарыі. – Мн.: Беларуская Савецкая Энцыклапедыя, 1989. – С. 5 – 57.

## Асноўная літаратура

1. Альдебер Ж., Бендер Й., Груша И. и др. История Европы. – Мн.: Выш. шк., 1996. – С. 128 – 156.
2. Гісторыя Беларусі: Вучэбны дапаможнік: У 2 ч. / Пад рэд. Я.К.Новіка, Г.С.Марцуля. – Мн.: Універсітэцкае, 1998. – Ч. 1. – С. 75 – 167.
3. Гісторыя Беларусі: У 2 ч. Ч. 1.: Са старажытных часоў да канца XVIII ст.: Курс лекцый / І.П.Крэнь, І.І.Коўкель, С.В.Марозава, С.Я.Сяльверстава, І.А.Фёдараў. – Мн.: РІВШ БДУ, 2000. – С.187 – 259, 276 – 280, 289 – 330, 387 – 422.
4. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. /Рэдкал: Б.І.Сачанка (гал. рэд.) і інш. – Мн.: БелЭн, 1991 – 1994. – Т. 2. – С. 387 – 422.
5. Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 ч. / М.П.Касцюк, У.Ф.Ісаенка, Г.В.Штыхаў і інш.: – Мн.: Беларусь, 1994. – С. 114 – 166.
6. Насевіч В.Л. Пачаткі Вялікага княства Літоўскага: Падзеі і асобы. – Мн.: Полымя, 1993. – 160 с.
7. Тарасаў К. Памяць пра легенды: Постаці беларускай мінуўшчыны. – Мн.: Полымя, 1993. – С. 43 – 96.
8. Ермаловіч М. Старажытная Беларусь: Полацкі і Наваградскі перыяды. – Мн.: Маст. літ., 1990. – С. 307 – 352.
9. Ермаловіч М. Беларуская дзяржава Вялікае княства Літоўскае. – Мн.: Беллітфонд, 2000. – 448 с.
10. Пашуто В.Т. Образование Литовского государства. – М.: АН СССР, 1959. – 530 с.
11. Аповесць пра Міндоўга і Войшалка // Спадчына. – 1990. – № 3. – С. 50 – 59.
12. Чаропка В. Князь, ваяр, манах // Спадчына. – 1990. – № 1. – С. 37 – 39.
13. Станкевіч А. Вітаўт Вялікі і беларусы // Спадчына. – 1990. – № 4. – С. 14 – 20.
14. Вячорка В. «Кроў лягла чырвонай паласой» // З гісторыяй на «Вы»: Публіцыстычныя артыкулы. – Мн.: Беларусь, 1991. – С. 355 – 369.
15. Сімволіка на Беларусі: учора і сёння // На скрыжаванні думак. Вучоныя аб «белых плямах» гісторыі Беларусі. – Мн.: Маст. літ., 1990. – С. 99 – 118.

16. Цітоў А. Гарадская геральдыка Беларусі. – Мн.: Полымя, 1989. – 205 с.
17. Юхо Я. Уніі Вялікага княства Літоўскага з Польшчай // Полымя. – 1972. – № 1. – С. 207 – 226.
18. Краўцэвіч А.К. Стварэнне Вялікага княства Літоўскага. – Rzeszow. – 2000. – 238 с.

## Тэмы рэфератаў

1. Асноўныя канцэпцыі ўтварэння ВКЛ.
2. Крэўская унія і яе вынікі.
3. Месца ВКЛ у еўрапейскай гісторыі.
4. Давыд Гарадзенскі і яго след у гісторыі нашага краю.
5. Грунвальдская бітва – славутая старонка айчыннай гісторыі.

Для дзяржаўнага жыцця сярэдневяковай Еўропы, нягледзячы на велізарнасць яе межаў і розны ўзровень жыцця яе народаў, характэрна адносная дакладнасць і паслядоўнасць формаў. Ва ўмовах бясспрэчнага панавання манархічнай формы кіравання дзяржавы гэтага тыпу прайшлі наступныя, вядома, умоўныя стадыі сваёй эвалюцыі:

1) «варварскія каралеўствы»;
2) раннефеадальныя дзяржавы;
3) дзяржавы феадальнай раздробленасці;
4) дзяржавы саслоўнай манархіі;
5) абсалютнай манархіі.

Барацьба каралеўскай улады і знаці завершылася распадам сярэдневяковай дзяржавы і рассейваннем палітычнага суверэнітэту, стаўшага асновай раздробленай дзяржавы (вызначце хparty гічныя рамкі феадальнай раздробленасці ў Еўропе, знайдзіце на карце дзяржавы, якія існавалі ў гэты час на еўрапейскім кантыненце).

У выніку распаду Старажытнарускай дзяржавы беларускія землі ўступілі ў перыяд феадальнай раздробленасці (вызначце храналагічныя рамкі гэтага працэсу на Беларусі і параўнайце з аналагічнымі падзеямі ў Еўропе, выдзяляючы агульнае і асаблівае, а пры разглядзе наступстваў феадальнай раздробленасці – станоўчае і адмоўнае).

У VIII ст. вызначаліся два цэнтры кансалідацыі ўсходніх славян: старажытнарускія гарады Навагародак, Вільня і Масква (растлумачце, чаму менавіта гэтыя гарады ўзвышаюцца на землях усходніх славян, абгрунтоўваючы свае высновы крыніцамі [1, с. 79 – 138; 2, с. 18 – 28].

Пры разглядзе сацыяльна-эканамічных і палітычных перадумоў і працэсу ўтварэння ВКЛ мэтазгодна прытрымліваецца наступнага плана.

1. Тры навуковыя падыходы да праблемы ўзнікнення ВКЛ.

2. Знешняя небяспека з боку нямецкіх рыцараў і татара-мангол.

3. Тэндэнцыі да аб'яднання старажытнарускіх зямель сталі ўсеагульнымі, але раней гэта праявілася на заходніх землях.

4. Праблема месцазнаходжання «летапіснай Літвы».

Працэс утварэння ВКЛ быў працяглы і меў складаны характар. Ён доўжыўся больш за стагоддзе – з другой чвэрці XIII да трэцяй чвэрці XIV (паразважайце, чаму гэта так адбывалася, параўнайце з працэсам утварэння цэнтралізаваных дзяржаў у Еўропе і Маскоўскай дзяржаве).

Трэба ўлічваць, што ВКЛ – поліэтнічная дзяржава чатырох асноўных народаў – беларускага, літоўскага, рускага і ўкраінскага, дзе славяне складалі каля 80 % насельніцтва. Вылучыце, якім чынам уваходзілі землі сучаснай Беларусі ў склад ВКЛ і якія князі прымалі ў гэтым удзел.

Па форме свайго кіравання ВКЛ – феадальная манархія з федэралісцкімі пачаткамі, і гэта прывяло да таго, што вялікакняжацкая ўлада ў XIV – XVI ст. не раз знаходзілася ў палітычным крызісе. Аналізуючы гэты працэс, неабходна звярнуць увагу на:

а) прычыны палітычнага крызісу:

- узмацненне літоўскіх феадалаў на беларускіх землях праз зямельныя падараванні (узгадайце, што Гедэмін яшчэ пры жыцці раздаў сынам нанова далучаныя землі на правах удзельнага княжання, а пасля яго смерці ўсё ВКЛ было падзелена на 8 удзелаў. Якія наступствы гэтага працэсу вы можаце вызначыць для заходнерускіх князёў? );

- каталіцкая царква становіцца з цягам часу буйным землеўладальнікам;

- узвышэнне часткі беларускіх феадалаў (Сапегі, Валовічы, Тышкевічы) і ўкраінскіх (Астрожскія, Хадкевічы), якія даказалі сваю лаяльнасць да цэнтральнай улады;

- існаванне тэндэнцый да федэралізацыі пад уплывам літоўскай экспансіі і імкненне вялікакняжацкай улады да цэнтралізацыі;

б) крызісы дзяржаўнай улады:

- першы крызіс – пасля смерці Гедэміна (1341 г.);

- 1377 г. – пасля смерці Альгерда;

- 1381 г. – захоп Кейстутам улады.

У 1385 г. была заключана Крэўская унія, якая прадугледжвала інкарпарацыю ВКЛ у Карону Польскую на «ўсе часы». Самастой-

нае існаванне княства перапынялася, што выклікала незадаволенасць беларускіх феадалаў, якая яшчэ больш узмацнілася пасля прывілея Ягайлы 20 лютага 1387 г. Пачалася каталіцкая экспансія на беларускіх землях. Адначасова ўзнік буйны грамадска-палітычны рух, які быў скіраваны супраць польска-літоўскай уніі і палітыкі Ягайлы. Ахарактарызуйце гэты рух.

У 1413 г. была прынята Гарадзельская унія, якая юрыдычна аформіла палітычную самастойнасць ВКЛ пад уладай польскага караля.

Вызначце прычыны і гістарычныя абставіны, якія прывялі да грамадскай вайны 1432 – 1436 г., якая скончылася ўраўнаваннем у правах беларускіх феадалаў з літоўскімі (правядзіце гістарычныя паралелі і вызначце, ці была такая барацьба ў іншых краінах Еўропы ў адзначаны перыяд).

Як ва ўсёй сярэдневяковай Еўропе, у ВКЛ грамадства падзялялася на саслоўі. Пабудуйце феадальную саслоўную «лесвіцу» ВКЛ і параўнайце яе з аналагічнай «лесвіцай» Еўропы, выдзяляючы агульнае і асаблівае, паразважайце над гэтым. Аналагічны аналіз зрабіце па катэгорыях сялянства і гараджан.

Рост вялікакняжацкай улады ў канцы XIV – пачатку XVI ст. не прывёў да ўсталявання спадчыннай і неабмежаванай манархіі як у Расіі, так ў краінах Заходняй Еўропы (найперш у Францыі, дзе ўтварылася класічная мадэль абсалютнага самадзяржаўнага кіравання). Вялікае княства Літоўскае пастулова набывала статус абмежаванай, канстытуцыйнай манархіі (дайце вызначэнне гістарычным тэрмінам «абсалютызм» і «канстытуцыйная манархія» і паразважайце аб тым, якая мадэль дзяржаўнага будаўніцтва, на ваш погляд, больш прагрэсіўная). Узвышэнне вялікакняжацкай улады адбылося ў ВКЛ пасля заключэння уніі з Польшчай. У той час была закладзена аснова выбарнай вялікакняжацкай улады. Трэба ўлічваць і тое, што, пачынаючы з XV ст., шляхецкае саслоўе пачынае ўзвышацца палітычна (успомніце, якімі юрыдычнымі актамі гэта было замацавана). Пры вялікіх князях літоўскіх існавалі дарадчыя органы, куды ўваходзілі прадстаўнікі найбольш магутных і ўплывовых родаў. Звесткі аб падобных органах адносяцца да часу Міндоўга, Гедэміна, Альгерда, Кейстута, Ягайлы, Вітаўта. Прывілей 1492 г. вялікага князя Аляксандра падзяліў уладу ў краіне паміж вялікім князем і вялікакняжацкай Радай (вызначце, якія функцыі выконвалі Рада і вялікі князь, дайце гістарычную ацэнку гэтым падзеям). На працягу з сяр. XV да сярэдзіны XVI ст. членамі гаспадарскай Рады былі прадстаўнікі 50 знатных родаў, сярод якіх былі і беларускія. Трэба

ўлічваць, што ў канцы XV ст. канчаткова аформіўся і другі вышэйшы орган дзяржаўнай улады ВКЛ – Сойм (Сейм). Асвятляючы яго дзейнасць, прытрымлівайцеся наступнага плана.

1. Прычыны з'яўлення Сойма.

2. Склад Сойма.

3. Функцыі Сойма.

4. Значэнне Сойма для палітычнага жыцця дзяржавы.

Вызначце на карце асноўную адміністрацыйна-тэрытарыяльную адзінку ВКЛ – ваяводствы і паветы. Назавіце іх, акрэсліце іх межы (успомніце адміністрацыйную рэформу 1565 г., назавіце, якія ваяводствы былі створаны на беларускіх землях). Як называліся пасады мясцовых кіраўнікоў?

У XV – XVI ст. на беларускіх землях складвалася двухпрыступная сістэма судзебных органаў. Вышэйшай судовай уладай ВКЛ быў вялікакняжацкі суд, а таксама суд паноў-рады і Сойма. Трыбунал Вялікага княства Літоўскага быў створаны ў 1581 г. (вызначце самастойна, якія суды дзейнічалі на мясцовым узроўні па рэформе 1565 г., асобна выдзеліце суды ў гарадах, якія мелі магдэбургскае права). Суды ў сваёй дзейнасці абапіраліся на дзяржаўнае заканадаўства – Статуты ВКЛ (назавіце, што было базай для статутаў і колькі рэдакцый статута вядома).

Асновай эканамічнага развіцця беларускіх зямель у перыяд сярэднявечча была сельская гаспадарка, якая з 2-й паловы XV ст. перажывала некаторы ўздым (вызначце яго прычыны, прыгадаўшы, якія працэсы адбываліся ў прамысловасці Заходняй Еўропы таго часу).

Зямля ў ВКЛ манапольна належала шляхецкаму саслоўю, частка зямлі была дзяржаўнай, частка належала вялікаму князю і царкве. У XIV – XV ст. у сельскай гаспадарцы ВКЛ узнікае новы від гаспадарання – фальваркава-паншчынная сістэма. Ахарактарызуйце яе.

Кажучы пра эканамічнае развіццё ВКЛ XIV – 1-й паловы XVI ст., трэба ўлічваць, што ў Заходняй Еўропе прыгоннае права амаль знікае ў XIV – XV ст., але там застаецца феадальная залежнасць у выглядзе грашовай рэнты, а таксама натуральны аброк (растлумачце, чаму ў ВКЛ у гэты час ішоў працэс запрыгоньвання сялян, у якіх дзяржаўных актах гэта было замацавана, якая катэгорыя сялян з'яўляецца).

Параўнайце развіццё гарадоў у ВКЛ і ў Заходняй Еўропе па схеме:

1) колькасць гарадоў і іх насельніцтва;

2) каму належалі гарады;

3) колькі гарадоў мелі магдэбургскае права;
4) функцыі гарадоў;
5) гаспадарчае жыццё гарадоў;
6) культурнае і рэлігійнае жыццё гарадоў.

Складанай і супярэчлівай была знешняя палітыка ВКЛ. У ёй можна выдзеліць наступныя этапы:

1) XIV – XV ст.
– барацьба з нямецкімі ордэнамі;
– барацьба з крымскімі ханствамі (Залатой Ардой, Вялікай Ардой, Крымскім ханствам);
– пашырэнне сваёй тэрыторыі;

2) канец XIV – XVI ст.
– праблема літоўска-польскага саюза;
– адносіны з Маскоўскай дзяржавай.

Ахарактарызуйце кожны з этапаў, назавіце буйныя бітвы, гістарычных асоб, якія ў іх удзельнічалі (падрыхтуйце аб гэтым рэфераты), вызначце вынікі намаганняў у знешняй палітыцы і дайце ім гістарычную ацэнку.

Пажадана выкарыстанне відэафільмаў: «Асноўныя погляды гісторыкаў на працэс і прычыны ўтварэння ВКЛ», «Культура Беларусі ў XIV – XVI ст.»; дыяпазітываў «Вялікае княства Літоўскае»; кнігі з дыяпазітывамі: «Культура Белоруссии в XIV – второй половине XVI в.», «Генезис феодализма»; картаў «Беларускія землі ў складзе Вялікага княства Літоўскага».

## Праверачны тэст

**I.** Дайце тлумачэнне наступных паняццяў:
1) феадальная раздробленасць;
2) васал;
3) крыжовыя паходы;
4) манархія;
5) унія.

**II.** Падбярыце правільны адказ:

1. Узнікненне ВКЛ у выніку аб’яднаўчай дзейнасці князя Міндоўга (1200 – 1283 г.) са сталіцай у Наваградку:
   а) канец XII ст.;
   б) 30 – 50-я гады XIII ст.;
   в) сярэдзіна XI ст.
2. Беларускія землі ўвайшлі ў склад ВКЛ у цэлым:

а) шляхам войн;

б) праз дагаворы, шлюбныя саюзы пры захаванні ранейшых ільгот і прывілеяў і пэўнага самакіравання;

в) шляхам поўнага падпарадкавання.

3. Першым князем, які каранаваўся, быў:

а) Войшалк;

б) Міндоўг;

в) Віцень;

г) Трайдзень.

4. Перанёс сталіцу з Наваградка ў Вільню:

а) Альгерд;

б) Віцень;

в) Гедымін;

г) Ягайла.

5. Полацкае княства ўвайшло ў склад ВКЛ падчас кіравання:

а) Міндоўга;

б) Войшалка;

в) Віценя;

г) Ягайлы.

6. Паспяхова ваяваў з крыжакамі і разбіў татараў на р.Сінія Воды:

а) Альгерд;

б) Гедымін;

в) Войшалк;

г) Трайдзень.

7. Крэўская унія з Польшчай была заключана ў:

а) 1410 г.;

б) 1281 г.;

в) 1385 г.;

г) 1430 г.

8. Крэўская унія – гэта:

а) персанальная унія паміж ВКЛ і Польшчай;

б) персанальная унія паміж ВКЛ і Расіяй;

в) персанальная унія паміж ВКЛ і Рымам.

9. На чале абедзвюх дзяржаў станавіўся:

а) вялікі князь Вялікага княства літоўскага Ягайла;

б) вялікі князь Вялікага княства літоўскага Вітаўт.

10. Унія:

а) садзейнічала працэсу русіфікацыі;

б) перапыняла анямечванне Польшчы і садзейнічала акаталічванню насельніцтва Беларусі.

11. Барацьба паміж імі ў многім абумовіла ў канцы XIV – пачатку XV ст. гісторыю ВКЛ:

а) Ягайла і Вітаўт;

б) Міндоўг і Войшалк;

в) Альгерд і Віцен.

12. Грунвальдская бітва адбылася ў:

а) 1410 г.;

б) 1385 г.;

в) 1484 г.;

г) 1510 г.

13. Саслоўна-прадстаўнічы орган ВКЛ і Польшчы, які выбіраў Вялікага князя, вырашаў пытанні вайны і міру і г.д.:

а) магістрат;

б) Сойм;

в) ратуша.

14. Структура і характар дзейнасці Сойма юрыдычна былі замацаваны ў:

а) указах князя;

б) уніях;

в) статутах ВКЛ.

15. Адміністрацыйна-адасобленыя часткі гарадоў ці прыгарадаў, якія былі пад уладай феадала, царквы або манастыра, на якіх не пашыралася судовая і адміністрацыйная ўлада гарадскога самакіравання:

а) юрыдыкі;

б) ратушы;

в) паветы.

16. Права горада на самакіраванне:
а) юрыдыкі;
б) магдэбургскае права;
в) ратуша.

17. Адміністрацыйны орган самакіравання горада, які размяшчаўся ў спецыяльным будынку:
а) ратуша;
б) магістрат;
в) веча.

18. У горадзе рамеснікі аб'ядноўваліся ў:
а) прафсаюзы;
б) цэхі;
в) мануфактуры.

19. Камандаваў узброенымі сіламі дзяржавы, калі на чале іх не стаяў вялікі князь:
а) канцлер;
б) гетман найвышэйшы;
в) польны гетман.

20. Кіраваў дзяржаўнай канцылярыяй, рыхтаваў законапраекты, прывілеі:
а) маршалак;
б) гетман;
в) канцлер.

21. У 1-й палове XIV ст. найбольш буйныя старажытныя княствы (Полацкае, Віцебскае, Берасцейскае, Навагародскае) былі пераўтвораны ў:
а) паветы;
б) губерні;
в) ваяводствы;
г) аднаўлены княствы.

22. Канчатковае ўраўнаванне ў правах праваслаўнай і каталіцкай шляхты адбылося ў:
а) 1434 г.;
б) 1508 г.;
в) 1563 г.

23. Канчаткова запрыгоньваў сялян (вызначаў 20-гадовы тэрмін пошуку збеглых сялян):

а) І Статут ВКЛ;
б) ІІ Статут ВКЛ;
в) ІІІ Статут ВКЛ.

24. Феадальна залежныя сяляне, галоўнай формай зямельнай рэнты якіх была паншчына:

а) агароднікі;
б) цяглыя;
в) асадныя.

25. Сяляне, якія мелі права пераходзіць ад аднаго феадала да другога, якіх нельга было перадаваць па спадчыне, дарыць:

а) цяглыя;
б) асадныя;
в) пахожыя;
г) непахожыя.

26. Князь, які атрымаў тытул Вялікі:

а) Альгерд;
б) Вітаўт;
в) Ягайла;
г) Гедымін.

27. Дзяржаўнай мовай і мовай Статутаў была:

а) руская;
б) старабеларуская;
в) польская.

28. Пра каго вядзецца гаворка:

«Адзін з найбагацейшых і ўплывовых ліцвінскіх магнатаў, усемагутны фаварыт вялікага князя Аляксандра, тонкі дыпламат, аднак «грашыў» палітычным авантурызмам; славуты герой Клецкай бітвы 1506 г., у 1508 г. стаў здраднікам Айчыны, узняўшы мяцеж супраць Жыгімонта Старога»?

***Адказы***

ІІ.1. б; 2. б; 3. б; 4. в; 5. в; 6. а; 7. в; 8. а; 9. а; 10. б; 11. а; 12. а; 13. б; 14. а; 15. а; 16. б; 17. б; 18. б; 19. б; 20. в; 21. в; 22. в; 23. в; 24. б; 25. в; 26. б; 27. б; 28. Міхал Глінскі.

ТЭМА 4

# КАНСАЛІДАЦЫЯ БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАСЦІ. РЭЛІГІЯ І КУЛЬТУРА БЕЛАРУСІ Ў XVI – 1-й ПАЛОВЕ XVII СТ.

## План

1. Кансалідацыйныя працэсы ў Еўропе. Узнікненне агульнасці лёсу паўночна-заходняга еўрапейскага свету і кантынентальнай Еўропы.

2. Фарміраванне беларускай народнасці:

а) азначэнне паняцця «народнасць»;

б) этнаўтваральныя фактары: фармаванне этнічнай тэрыторыі; грамадска-палітычныя, сацыяльна-эканамічныя, культурныя фактары кансалідацыі беларускага этнасу;

в) складванне важнейшых этнічных прыкмет беларускай народнасці.

3. Рэлігія і царква ў духоўным жыцці Заходняй Еўропы. Рэфармацыя і контррэфармацыя ў Еўропе.

4. Развіццё царкоўна-рэлігійных адносін у ВКЛ:

а) праваслаўе і каталіцызм да сярэдзіны XVI ст.;

б) рэфармацыйны рух: перадумовы, асаблівасці, этапы;

в) контррэфармацыя;

г) Берасцейская царкоўная унія.

5. Рэнесанс (Адраджэнне) у Еўропе: сацыяльная база, тыпалагічныя рысы, асноўныя дасягненні, перыядызацыя.

6. Асаблівасці і праявы культуры Адраджэння на Беларусі:

а) перадумовы і працэс станаўлення рэнесансавай культуры на Беларусі, яе асаблівасці;

б) пачатак усходнеславянскага і беларускага кнігадрукавання;

в) літаратура і мастацтва.

## Крыніцы

1. Белоруссия в эпоху феодализма: Сборник документов и материалов: В 3 т. – Мн.: АН БССР, 1959. – Т. 1. – С. 57, 99, 101, 382.

2. Францыск Скарына і яго час: Энцыклапедычны даведнік / Рэдкал. І.П.Шамякін (гал. рэд.) і інш. – Мн.: БелСЭ, 1988. – 608 с.

## Асноўная літаратура

1. История: Учебное пособие для вузов. – Ростов-на-Дону: Феникс, 2000. – С. 102 – 239.

2. Альдебер Ж., Бендер Й., Груша И. и др. История Европы. – Мн.: Вышэйшая школа, 1996. – С. 126 – 218, 232 – 244.

3. Гісторыя Беларусі: У 2 ч. Ч. 1: Са старажытных часоў да канца XVIII ст.: Курс лекцый / І.П.Крэнь, І.І.Коўкель, С.В.Марозава, С.Я.Сяльверстава, І.А.Фёдараў. – Мн.: РІВШ БДУ, 2000. – С. 302 – 330, 390 – 481.

4. Гісторыя Беларусі / Пад рэд. Я.К.Новіка і Г.С.Марцуля: У 2 т. – Мн.: Універсітэцкае, 2000. – Т. 1. – С. 137 – 167, 184 – 199, 233 – 256.

5. Нарысы гісторыі Беларусі / Пад рэд. М.П.Касцюка, У.Ф.Ісаенка, Г.В.Штыхава і інш.: У 2 ч. Ч.1. – Мн.: Экаперспектыва, 1991. – С. 166 – 200.

6. Адраджэнне: Гіст. альманах / Навук. рэд. А.П.Грыцкевіч. Вып. 1.– Мн.: Універсітэцкае, 1995. – 359 с.

7. Пилипенко М.Ф. Возникновение Белоруссии: Новая концепция. – М. Изд-во …1991.

8. Этнаграфія беларусаў: гістарыяграфія, этнагенез, этнічная гісторыя. – Мн.: Навука і тэхніка, 1985. – 215 с.

9. Крыванос Х. З варагаў пайшлі суровыя мужы: [Этнічнае паходжанне князяў усходніх славян] //Бел. мінуўшчына. –1993. – № 2. – С.16 – 19.

10. Штыхаў Г. Вытокі беларускай народнасці // Бел. мінуўшчына. 1993. – №2. – С. 13–18.

11. Юхо Я. Фарміраванне тэрыторыі беларусаў // Спадчына. – 1991. – № 6. – С. 2–12.

12. Блинова Т.Б. Иезуиты в Белоруссии. – Мн.: Беларусь, 1990. – 110 с.

13. Мараш Я.Н. Ватикан и католическая церковь в Беларуси (1569–1795). – Мн.: Выш. шк., 1971. – 272 с.

14. Подокшин С.А. Реформация и общественная мысль Белоруссии и Литвы (вторая половина XVI – начало XVII). – Мн.: Наука и техника, 1970. – 224 с.

15. Іванова Л. Рэфармацыйны рух на Беларусі (другая палова XVI – першая палова XVII ст.) // Беларускі гістарычны часопіс. – 1997. – №2. – С. 54 – 72.

16. Шаўцоў Ю. Пратэстанцкі месіянізм Яна Кішкі // Спадчына. – 1995. – №3. – С. 211–249.

17. Лыч Л., Навіцкі У. Гісторыя культуры Беларусі. – Мн.: Экаперспектыва, 1996. – С. 37 – 48.

18. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. – Мн.: БелЭн, 1993. – 2001. – Т.1. – С.58 – 62, 131; Т. 2. – С. 73, 76, 98, 320; Т. 3. – С. 347; Т. 4 С.36, 37, 231.

## Тэмы рэфератаў

1. Навуковыя канцэпцыі паходжання беларускага этнасу і назвы «Белая Русь».
2. Этнічныя меншасці на Беларусі і іх уплыў на фарміраванне беларускай народнасці.
3. Менталітэт беларусаў.
4. Жыццё і дзейнасць С.Буднага.
5. Пратэстанцкія абшчыны Беларусі.
6. Дзейнасць езуітаў на Беларусі.
7. Барацьба вакол царкоўнай уніі ў канцы XVI – пачатку XVII ст.
8. Ф.Скарына – беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар, вучоны, гуманіст і асветнік.
9. Шляхецкае мецэнацтва ў ВКЛ у XV – першай палове XVII ст.

З развіццём вытворчых структур васальна-ленныя адносіны ў Заходняй Еўропе разам з тэрытарыяльнай адасобленасцю прывялі да этнічнай аўтаноміі. Сярэдневяковая Еўропа перажыла шэраг спроб стварэння шматэтнічных палітычных аб'яднанняў. Аднак у канцы развітога сярэднявечча ў Заходняй Еўропе ўзялі верх монаэтнічныя дзяржавы. Паняцце «народ» фактычна не выкарыстоўвалася, прыглушанае саслоўнымі межамі. Да XV ст. заходнееўрапейская цывілізацыя ў цэлым была дастаткова замкнутай, дзе кантакты з суседнімі дзяржавамі былі нерэгулярнымі. Канчаткова народ у Заходняй Еўропе выйшаў на гістарычную сцэну ў перыяд абсалютызму (паразважайце, ці адбывалася вышэйназванае на Беларусі і чым гэта было абумоўлена).

Народнасць – форма моўнай, тэрытарыяльнай, эканамічнай і культурнай супольнасці людзей, якая ўтвараецца гістарычна ў выніку кансалідацыі, зліцця плямён і папярэднічае ўтварэнню нацыі.

Існаванне ВКЛ стварыла новыя ўмовы для складвання беларускай народнасці. Сярод фактараў, якія садзейнічалі гэтаму, неабходна назваць наступныя:

1) палітычныя;
2) эканамічныя;
3) сацыяльныя.

Прыкметы народнасці:

1) дзяржаўна-тэрытарыяльнае адзінства;
2) матэрыяльная і духоўная культура;
3) этнічная самасвядомасць.

Раскрыйце змест кожнага фактару і прыкмет народнасці, звярніцеся да крыніц і карт.

Культура Адраджэння ў Заходняй Еўропе ўяўляла складаную і супярэчлівую з'яву. У ёй захавалася пераемнасць паміж антычнай і сярэдневяковай культурамі, разам з тым нараджаюцца і новыя рысы. Храналагічна Рэнесанс ахоплівае вялікі перыяд з сярэдзіны XIV ст. (пачатак Адраджэння ў Італіі) да XVII ст. Культуры Адраджэння ўласцівы тыпалагічныя рысы, якія праявіліся ва ўсіх еўрапейскіх краінах.

1. У Італіі прадстаўнікі рэнесансавай культуры імкнуліся ўваскрэсіць даўно мінулую эпоху антычнасці.

2. Адраджэнне захавала пераемнасць і з папярэдняй спадчынай хрысціянскага сярэднявечча.

3. З'яўляецца новае бачанне чалавека і акаляючага яго сусвета – рэнесансавы антрапацэнтрызм.

4. Складваюцца навуковыя працы гуманітарных ведаў, якія супрацьпастаўляюцца багаслоўскім дысцыплінам – рэнесансавы гуманізм.

5. Развіваецца вопытнае прыродазнаўства, якое змяніла сярэдневяковыя ўяўленні аб карціне светабудаўніцтва (М.Капернік, Галілео Галілей, І.Кеплер, Сервет і Парацэльс, Джардана Бруна).

6. Адбылося развіццё новага мастацкага зместу выяўленчага мастацтва ва ўсіх краінах Еўропы. Галоўным становіцца жыццепадобнасць – рэнесансавы рэалізм. Тэхнічнымі здабыткамі новага мастацтва з'яўляліся станкавая карціна, павольна стаячая статуя і індывідуальны партрэт.

У II палове XVII ст. пачаліся праяўляцца крызісныя рысы культуры Рэнесанса, што адлюстравалася ў драматычнай напружанасці мастацтва (маньерызм), імкненні паказаць бесцялеснасць гераічных намаганняў чалавека ў барацьбе з рокам, спалучэнне рацыяналізму з утапічнымі пошукамі ідэальнага грамадства («Утопія» Томаса Мора і «Горад сонца» Тамаза Кампанэлы).

Пад уплывам італьянскай культуры рэнесансавыя з'явы пачынаюць развівацца ў іншых краінах Еўропы. Геаграфічнае становішча Вялікага княства Літоўскага, адносна высокі ўзровень культуры абумовілі даволі ранняе пранікненне ў яе ідэй Адраджэння. Блізка да сэрца ўзяла іх беларуская моладзь, што вучылася ва універсітэтах Кракава, Прагі, Кёнігсберга, Лейпцыга, Базеля, Падуі і іншых гарадоў. Садзейнічалі гэтаму працэсу і гандляры, якія вязлі на беларускія землі не толькі тавары, але і літаратуру (прывядзіце прыклады, паразважайце).

Беларускі гісторык Алег Лойка падкрэслівае, што «наш народ займеў і магутнае сваёй героікай, прыгожым пісьменствам, рэлігійным асветніцтвам вельмі прадстаўнічае Адраджэнне», і выдзяляе тры стадыі Рэнесанса на Беларусі.

1. Скарынаўская (10 – 40 г. XVI ст.).

2. Стадыя сувязяў з Рэфармацыяй (дзейнасць С.Буднага і В.Цяпінскага).

3. Позняе Адраджэнне (дзейнасць Л.Сапегі і А.Рымшы).

Агульнымі рысамі Рэнесанса на Беларусі былі народнасць, адкрытасць свету прыроды і гуманізму. Асаблівасці гэтага перыяду на нашай Бацькаўшчыне праявіліся ў поліэтнічным характары культуры (развіцця культуры на беларускай, польскай, лацінскай мовах) і ў тым, што Адраджэнне не было тут звязана з зараджэннем капіталістычных адносін, а з'яўлялася вынікам развіцця культурных сувязей з Захадам.

Ахарактарызуйце кожную стадыю Рэнесанса на Беларусі, паразважайце, падрыхтуйце рэфераты аб славутых дзеячах беларускага Адраджэння.

Перамены ў жыцці заходнееўрапейскага грамадства ў канцы XVI ст. уступалі ў супярэчлівасць з тэорыяй і практыкай артадаксальнага рымскага каталіцызму і парадзілі шырокі грамадскі рух пад лозунгамі неабходнасці пераўтварэння (reformatio) царквы. Асвятляючы гэтае пытанне, мэтазгодна прытрымлівацца наступнага плана.

1. Перадумовы ўзнікнення рэфармацыйнага руху ў Заходняй Еўропе і ВКЛ:

а) эканамічныя;

б) палітычныя;

в) ідэалагічныя.

2. Узнікненне пратэстанцкіх цэркваў у Заходняй Еўропе і асаблівасці гэтага працэсу ў ВКЛ.

3. Характар і сацыяльная база Рэфармацыі.

4. Асноўныя кірункі Контррэфармацыі.

5. Вынікі рэфармацыйнага руху для развіцця еўрапейскай цывілізацыі.

Кажучы аб Рэфармацыі ў ВКЛ, неабходна падкрэсліць, што яна закранула не толькі каталіцкую, але і праваслаўную царкву і не была звязана з развіццём капіталістычных адносін.

Беларуская даследчыца Л.С.Іванова выдзяляе тры этапы беларускай Рэфармацыі:

1) 1553 – 1570 г.;
2) 1570 – 1596 г.;
3) 1596 – сяр. XVII ст.

Ахарактарызуйце кожны этап, дайце яму гістарычную ацэнку.

У дадзенай тэме пажадана выкарыстанне відэафільмаў: «Рэнесанс на Беларусі», «Асноўныя канцэпцыі аб паходжанні беларускага этнасу і назвы «Белая Русь», «Вяртанне бліскучай зоркі (Мікалай Гусоўскі і яго паэма «Песня пра зубра»)», «Культура Беларусі XIV – XVI ст.», «Ф.Скарына – беларускі першадрукар», дыяпазітываў з музычным суправаджэннем: «Францыск Скарына», «Беларуская кніжная графіка XVI – XVII ст.»; кніг з дыяпазітывамі «Народно-прикладное искусство XVI – XVII в.», «Культура Белоруссии в XVI – второй половине XVII в.»; картаў «Европа в XVI – первой половине XVII в.», «Беларускія землі ў складзе Вялікага княства Літоўскага»; нагляднага матэрыялу па гісторыі сусветнай культуры.

## Праверачны тэст

**I.** Дайце тлумачэнне наступных паняццяў:
а) народнасць;
б) саслоўе;
в) мястэчкі;
г) самасвядомасць;
д) рэнесанс;
е) гуманізм;
ж) рэнесансавы антрапацэнтрызм;
з) рэнесансавы рэалізм.

**II.** Ці згодны вы з наступнымі выказваннямі:

1. а) народнасць папярэднічае ўтварэнню нацыі;
б) народнасць уласціва рабаўладальніцкаму і капіталістычнаму ладу;
в) прыкметы народнасці складваюцца паступова, на працягу многіх стагоддзяў.

2. а) У час Рэнесанса ў Еўропе складваецца сістэма гуманітарных ведаў і вопытнага прыродазнаўства;
б) «Дэкамерон» напісаў Петрарка;
в) Іохан Кеплер вызначыў законы абарачэння планет вакол Сонца;
г) Дж.Бруна – стваральнік «філасофіі світання».

**III.** Падбярыце правільны адказ:

1. Працэс фарміравання беларускай народнасці працягваўся:
а) у XV – XVII ст.;
б) у 2-й палове XIII – 1-й палове XVI ст.;
в) у 1-й палове XIV – 1-й палове XVIII ст.

2. Прыхільнікамі «польскай» канцэпцыі этнічнай прыналежнасці беларусаў былі:
а) Л.Галенбоўскі, А.Рыпінскі;
б) В.Ластоўскі, А.Сабалеўскі;
в) А.Рыпінскі, Г.Штыхаў.

3. Канцэпцыя, якая заснавана на ўяўленні, што беларусы – частка вялікарускага этнасу, называецца:
а) польская;
б) балцкая;
в) вялікаруская.

4. Беларускі вучоны, стваральнік працы «Беларусы», у якой даказваецца самастойнасць беларускай мовы:
а) Я.Ф.Карскі;
б) Ф.Скарына;
в) П.Шпілеўскі.

5. Аўтарамі «крывіцкай» канцэпцыі былі:
а) М.Ермаловіч, М.Ткачоў;
б) В.Ластоўскі, А.Шлюбскі;
в) С.Токараў.

6. Тэорыя, згодна з якой змешванне балтаў са славянамі і прывяло да з'яўлення беларускага этнасу:
а) крывіцкая;
б) радзіміцкая;
в) балцкая.

7. Упершыню Рэнесанс з'яўляецца ў сярэдзіне XIV ст. у:
а) Германіі;
б) Італіі;
в) Грэцыі;
г) Швецыі.

8. Рэнесанс на Беларусі праходзіў у:

а) 2 этапы ( XIV – XV ст.,  XV – XVI ст.);

б) 3 этапы (Скарынаўскі, сувязь з Рэфармацыяй, позняе Адраджэнне);

в) 4 этапы (Тураўскі, Скарынаўскі, Гусоўскі, позняе Адраджэнне).

9. Сымон Будны паклаў пачатак друкаванню кніг на беларускай народнай мове на тэрыторыі сучаснай Беларусі ў:

а) 1562 г.;

б) 1713 г.;

в) 1658 г.

10. Распаўсюджванне каталіцызму ў ВКЛ адбывалася ў:

а) 3 этапы ( сяр.  XII – XIII ст.;  2-я палова XIII – XIV ст.; 1-я палова XIV – XVIII ст.);

б) 2 этапы (сяр.  XIII – 1385 г.; канец XIV – 2-я палова XVI ст.);

в) паступова, на працягу XII ст.

11. У канцы XIV ст. каталіцызм быў прыняты:

а) кіруючымі коламі ВКЛ;

б) сялянамі;

в) шляхтай.

12. Канчатковае ўраўнаванне ў правах каталіцкай і праваслаўнай шляхты адбылося ў:

а) 1415 г.;

б) 1385 г.;

в) 1563 г.

13. Царкоўны сабор, які прыняў рашэнне аб стварэнні уніяцкай царквы, праходзіў у:

а) Гародні;

б) Вільні;

в) Бярэсці.

14. Размясціце ў храналагічнай паслядоўнасці асноўныя падзеі царкоўнай уніі:

а) універсал Жыгімонта III аб уніі праваслаўнай і каталіцкай царквы ў ВКЛ;

б) выданне Пятром Скаргай кнігі «Аб адзінстве царквы Божай»;

в) сустрэча праваслаўных епіскапаў у Велзе;
г) царкоўны сабор у Бярэсці;
д) була папы рымскага Клімента.

15. Рэфармацыя ў ВКЛ закранула:
а) каталіцкую царкву;
б) праваслаўную царкву;
в) і каталіцкую, і праваслаўную царкву.

16. Найбольшае распаўсюджанне на тэрыторыі Беларусі атрымала:
а) лютэранства;
б) кальвінізм;
в) цвінгліянства.

17. Пачаткам контррэфармацыі на Беларусі лічыцца:
а) 1570 г.;
б) 1630 г.;
в) 1714 г.

***Адказы***

II 1: а – да; б – не; в – да; 2: а. – да; б – не; в – да; г – да;
III 1 – б; 2 – а; 3 – в; 4 – а; 5 – б; 6 – в; 7 – б; 8 – б; 9 –а; 10 – б; 11 – а; 12 – в; 13 – в; 15 – в.; 16 – б; 17 – а.

ТЭМА 5

# БЕЛАРУСЬ У СКЛАДЗЕ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ (1569 г. – КАНЕЦ XVIII ст.)

## План

1. Пераход ад сярэднявечча да «новага часу»: эканамічныя і палітычныя перамены ў Еўропе ў XVI – XVII ст. Праблема паняцця «новага часу» адносна айчыннай гісторыі.

2. Барацьба за гегемонію ва Усходняй Еўропе. Лівонская вайна. Люблінская унія, утварэнне Рэчы Паспалітай.

3. Грамадска-палітычны лад Рэчы Паспалітай. Дзяржаўна-прававое становішча ВКЛ у яе складзе.

4. Знешнепалітычнае становішча Рэчы Паспалітай у 2-й палове XVI – XVII ст. Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі і іх наступствы.

5. Кантрасты Еўропы XVIII ст.: эпоха Асветніцтва, вайны і рэвалюцыі. Рэч Паспалітая ў еўрапейскіх канфліктах. Беларусь у часы Паўночнай вайны.

6. Палітычны крызіс і заняпад Рэчы Паспалітай. Спробы рэформаў. Падзелы Рэчы Паспалітай і іх гістарычна-прававая ацэнка.

7. Культура Беларусі ў 2-й палове XVII – XVIII ст.

## Крыніцы

1. Белоруссия в эпоху феодализма: Сб. документов и материалов: В 3 т. – Мн.: АН БССР, 1959 – 1979. – Т. 1. – С. 150 – 171.

2. Статут ВКЛ 1588 г. Тэсты, даведнік, каментарыі. – Мн.: Беларуская савецкая энцыклапедыя, 1989. – С. 5 – 547.

## Асноўная літаратура

1. История: Учеб. пособие для вузов. – Ростов-на-Дону: Феникс, 2000. – С. 240 – 275, 276 – 351.

2. Альдебер Ж., Бендер Й., Груша И. и др. История Европы. – Мн.: Выш. шк., 1996. – С. 206 – 251, 255 – 283.

3. Всемирная история: Учебник для вузов // Под ред. Г.Б.Поляка, А.Н. Марковой – М.: 1997. – С. 181 – 207, 231 – 249.

4. Гісторыя Беларусі: У 2 ч. / Пад рэд. Я.К.Новіка, Г.С.Марцуля. – Мн.: Універсітэцкае, 2000. – Ч.1. – С. 169 – 261.

5. Гісторыя Беларусі: У 2 ч. Ч. 1: Са старажытных часоў да канца XVIII ст.: Курс лекцый / І.П.Крэнь, І.І.Коўкель, С.В.Марозава, С.Я.Сяльверстава, І.А.Фёдараў. – Мн.: РІВШ БДУ, 2000. – С. 331 – 356, 496 – 624.

6. Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 ч. Ч. 1 / М.П.Касцюк, У.Ф.Ісаенка, Г.В.Штыхаў і інш. – Минск.: 1994. – С. 201 – 266.

7. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. / Редкал: М.В.Біч і інш. – Мн.: БелЭн, 1993. – Т.1. – С. 211 – 212, 309 – 311; Т.2. – С. 189 – 200, 393 – 401, 405 – 406; Т. 5. – С. 444 – 447.

8. Грицкевич А.П. Частновладельческие города Белоруссии в XVI – XVIII в. – Мн.: Наука и техника, 1975. – 248 с.

9. Козловский П.Г. Крестьяне Белоруссии во второй половине XVII – XVIII в. – Мн.: Наука и техника, 1969. – 201 с.

10. Мальцев А.Н. Россия и Белоруссия в середине XVII в. – М.: Московский университет, 1974. – 256 с.

11. Юхо Я. Уніі Вялікага княства Літоўскага з Польшчай // Полымя. – 1972. – № 1. – С. 207 – 226.

12. Клачоўскі Е., Уроньскі П. Пра Люблінскую унію і унію Еўрапейскую // Спадчына. – 2000. – № 1. – С. 65.

13. Жук Т. Беларусь у другой палове XIII – XVIII ст. // БГЧ. – 2001. – № 2. – С. 81.

14. Ермаловіч М. Беларуская дзяржава ВКЛ [перыяд Рэчы Паспалитай (1569 – 1795)]. – Мн.: Беллітфонд, 2000. – С. 331 – 425.

15. Філатава А. Тры падзелы Рэчы Паспалітай // Крыжовы шлях. – Мн.: Згода, 1993. – С. 96 – 118.

16. Барока ў беларускай культуры і мастацтве. – Мн.: Беларуская навука, 2001. – 304 с.

## Тэмы рэфератаў

1. Лівонская вайна і яе ўплыў на еўрапейскую гісторыю.
2. Люблінскі сойм і яго значэнне.
3. Рэформы ў Рэчы Паспалітай пасля першага падзелу і Канстытуцыя 3 мая 1791 г.
4. Паўстанне 1794 г. на Беларусі.
5. Барока ў беларускай культуры і мастацтве.
6. Асветніцтва ў Еўропе і на Беларусі.

Паняцце «новая гісторыя» з’явілася ў еўрапейскай навуцы ў XV – XVI ст., у эпоху Адраджэння (успомніце, на якія тры эпохі сталі падзяляць гісторыю гуманісты). У заходнееўрапейскай гіста-

рычнай навуцы новы час пачынаецца з падзення Візантыйскай імперыі (1453 г.) і працягваецца да сённяшняга часу. Разам з тым на Захадзе выдзяляюць як асобны перыяд ранні новы час (з канца XV да канца XVIII ст.). Новы час звязваецца з усталяваннем буржуазнай індустрыяльнай цывілізацыі. Як вызначаюць новы час у айчыннай гістарыяграфіі? Паразважайце аб гэтым, улічваючы, што мяжой паміж сярэднявеччам і новым часам мэтазгодна лічыць эпоху першапачатковага накаплення капіталу (канец XV – пачатак XVI ст).

Новы час – гэта эпоха, якая заклала асновы сучаснай цывілізацыі. Раскрываючы жыццё еўрапейскага кантыненту таго часу, прытрымлівайцеся наступнага плана.

1. Развіццё капіталістычнага спосабу вытворчасці, мадэрнізацыя і яе стадыі.

2. Буржуазныя рэвалюцыі ў Еўропе (прычыны, характар, мэты, удзельнікі, вынікі).

3. Развіццё культуры. Эпоха Асветніцтва, яе праявы на Беларусі.

У эканамічным плане ў той час у Еўропе дакладна выдзяляюцца чатыры рэгіёны, кожны з якіх апынуўся ў спецыфічным грамадска-эканамічным стане ў межах сістэмы агульнаеўрапейскіх узаемаадносін.

1. Рэгіён, дзе панаваў раннекапіталістычны ўклад у фазе мануфактурнай вытворчасці (Англія, Галандыя).

2. Рэгіён, дзе раннекапіталістычная фаза была толькі ўкладам, які падпарадкоўваўся пануючай феадальнай структуры вытворчасці (Францыя, частка раёнаў Германіі, Швецыя).

3. Рэгіён, дзе ў XVII ст. адзначаўся сацыяльна-эканамічны рэгрэс (Іспанія, Партугалія, Паўночная Італія, Паўднёва-Заходняя Германія).

4. Рэгіён, дзе замацаваўся прыгонны лад (Чэхія, Венгрыя, Рэч Паспалітая, Прыбалтыка, Расійская імперыя).

Паразважайце аб гэтым падзеле па эканамічнаму развіццю, спыніцеся на кожным рэгіёне, карыстаючыся картамі і вучэбнай літаратурай, выдзеліце агульнае і асаблівае ў станаўленні буржуазнай цывілізацыі ў Еўропе.

Для беларускіх зямель новы час меў і яшчэ адзін бок – з часу Люблінскай уніі 1569 г. да канца XVIII ст. беларускія землі ўвайшлі ў склад новай дзяржавы – Рэчы Паспалітай.

Кажучы аб прычынах уніі, выдзеліце дзве прычыны:

1) знешнюю;

2) унутраную.

Трэба падкрэсліць, што да уніі імкнуліся абедзве дзяржавы, але ўмовы яе заключэння былі для ВКЛ не зусім добрыя. На Люблінскім сойме 1569 г. унія прадугледжвала інкарпарацыю рэшткаў ВКЛ у польскую дзяржаву пад назвай «Рэч Паспалітая» (успомніце, якім чынам і пасля якіх падзей Польшча далучыла да сябе большасць тэрыторыі ВКЛ: Падляшша, Валынь, Падолію, Кіеўшчыну).

На чале дзяржавы стаялі выбраны польскі кароль і вышэйшы заканадаўчы орган – Сейм (параўнайце форму кіравання ў Рэчы Паспалітай з манархіямі Заходняй Еўропы, выдзеліце станоўчае і адмоўнае, дайце гістарычную ацэнку).

Асвятляючы дзяржаўна-прававы стан ВКЛ у складзе новай дзяржавы, спыніцеся на раскрыцці наступных палажэнняў.

Жорсткая барацьба на Люблінскім сойме за незалежнасць і тэрытарыяльную цэласнасць прывяла да:

1) абедзве дзяржавы захавалі свае ранейшыя назвы, свае законы, урады, іншыя органы выканаўчай улады, судовыя сістэмы, мясцовае самакіраванне, фінансы, узброеныя сілы і да канца XVII ст. свае дзяржаўныя мовы;

2) на першым этапе свайго існавання Рэч Паспалітая была федэратыўнай дзяржавай;

3) у ВКЛ дзейнічаў Статут ВКЛ, які рэгуляваў дзяржаўна-прававыя адносіны ў краіне.

Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі XVI – XVIII ст., як і грамадска-палітычнае жыццё, не адзначалася стабільнасцю (растлумачце, чаму так адбывалася, прыгадайце сацыяльныя, этнічныя, рэлігійныя процістаянні, феадальныя міжусобіцы, войны).

Падкрэсліце, што з утварэннем Рэчы Паспалітай геапалітычная сітуацыя ў Еўропе змянілася – на карце Еўропы з’явілася новая буйная і даволі магутная дзяржава. Але войны XVII ст., а потым і XVIII ст. прывялі да таго, што дамінуючая роля ва Усходняй Еўропе перайшла спачатку ад ВКЛ і Рэчы Паспалітай да іх саперніка – Расіі (паразважайце аб прычынах гэтых перамен).

Раскрываючы прычыны сацыяльна-эканамічнага крызісу 2-й паловы XVII – пачатку XVIII ст., мэтазгодна прытрымлівацца наступнага плана.

1. Войны і ўнутраныя канфлікты.

2. Адсутнасць моцнай цэнтралізаванай улады, існаванне «ліберум вета».

3. Амаль поўнае вызваленне ад каралеўскай улады на аснове самакіравання польска-беларуска-літоўскай шляхты.

4. Зніжэнне колькасці насельніцтва.

5. Заняпад гаспадаркі.

6. Барацьба магнацкіх груповак за ўладу і грамадзянская вайна (1700 – 1701 г.).

Падчас Паўночнай вайны Рэч Паспалітая ператварылася ў тэатр ваенных дзеянняў, што паглыбіла крызіс у дзяржаве. З часоў Паўночнай вайны спачатку Расія, потым Прусія і Аўстрыя бяруць пад кантроль знешнюю і ўнутраную палітыку Рэчы Паспалітай (паразважайце аб гэтым, дайце гэтаму гістарычную ацэнку).

Сацыяльна-эканамічны і палітычны крызіс пагражаў існаванню дзяржавы і патрабаваў рэфармавання, што і пачало адбывацца ў пачатку XVIII ст. Назавіце тыя змены, што назіраліся ў пачатку XVIII ст. у Рэчы Паспалітай у эканамічным і палітычным жыцці, выдзеліце наступствы гэтых рэформ.

У XVIII ст. неаднаразова высоўваліся праекты расчлянення Рэчы Паспалітай. Назавіце краіны, якія дзялілі Рэч Паспалітую, чаму так адбывалася. Дайце гістарычна-прававую ацэнку гэтых падзей, укажыце не толькі адмоўныя, але і станоўчыя бакі гэтага гістарычнага факта. Карыстаючыся літаратурай, правядзіце дыскусію аб лёсе беларускіх зямель у складзе Рэчы Паспалітай.

Кажучы аб падзелах Рэчы Паспалітай, спыніцеся на характарыстыцы Канстытуцыі 1791 г. і паўстання пад кіраўніцтвам Т.Касцюшкі.

XVIII ст. увайшло ў гісторыю яшчэ і як эпоха Асветніцтва (дайце характарыстыку еўрапейскаму Асветніцтву, назавіце выдатных дзеячоў той эпохі).

Беларуская культура 2-й паловы XVII – XVIII ст. характарызавалася паланізацыяй і выключэннем з дзяржаўнага справаводства беларускай мовы.

Падкрэсліце, што ўмовы развіцця культуры Беларусі адпаведнага перыяду вызначылі яе спецыфічную рысу – полілінгвістычны характар, растлумачце, у чым гэта найбольш яскрава праявілася.

Вядучым мастацкім кірункам у XVII – XVIII ст. было барока (успомніце, дзе і калі яно ўзнікла, яго асноўныя мастацкія прынцыпы, назавіце помнікі барока на Беларусі).

Ідэі Асветніцтва распаўсюджваюцца на Беларусі ў 2-й палове XVIII ст. Для гэтага перыяду было характэрна суіснаванне розных культурных стыляў – барока, класіцызму, сентыменталізму, ракако. Аднак характар эпохі вызначаў класіцызм (ахарактарызуйце і ацаніце развіццё Асветніцтва на Беларусі, у якой галіне яно правілася найбольш яскрава (прыгадайце дзейнасць Адукацыйнай камісіі)). Ка-

рыстаючыся літаратурай, падрыхтуйце рэфераты аб дзеячах беларускай культуры і навукі эпохі Асветніцтва.

Для больш глыбокага вывучэння тэмы пажадана выкарыстанне відэафільмаў: «Побыт магнатаў, шляхты, гараджан у XVIII – XIX ст.», «Побыт вясковых жыхароў Беларусі ў XVIII ст.»; «Культура Беларусі ў XVII – XVIII ст.», «Адам Міцкевіч і яго час», «Далучэнне Беларусі да Расійскай імперыі», паўстанне Тадэвуша Касцюшкі»; кнігаў з дыяпазітывамі: «Народно-прикладное искусство XVI – XVII в.», «Культура Белоруссии в XIV – второй половине XVII в.»; картаў: «Российская империя с 1775 по 1801 г.», «Европа в начале нового времени», «Европа в XVI – первой половине XVII в.».

## Праверачны тэст

**I.** Дайце тлумачэнне наступных паняццяў:

а) «новы час»;
б) капіталізм;
в) унія;
г) фальваркава-паншчынная сістэма;
д) Статут;
е) «ліберум вета».

**II.** Ці згодны вы з наступнымі выказваннямі:

а) Перад Люблінскай уніяй ВКЛ і Польшча мелі аднолькавы грамадска-палітычны лад;

б) Польшчу засялялі галоўным чынам заходнія славяне, а ВКЛ было поліэтнічнай дзяржавай, дзе мірна ўжываліся ўсходнія славяне з балтамі, яўрэямі, татарамі і інш.;

в) У выніку Люблінскай уніі ўтварылася федэратыўная дзяржава – Рэч Паспалітая;

г) На чале Рэчы Паспалітай стаяў вялікі князь;

д) У Рэчы Паспалітай збіраўся агульны сейм, але не было агульнага ўрада.

**III.** Падбярыце правільны адказ:

1. Лівонская вайна:
а) 1549 – 1558 г.;
б) 1558 – 1583 г.;
в) 1490 – 1510 г.

2. Люблінская унія ВКЛ з Польшчай была падпісана:
а) 1 ліпеня 1569 г.;

б) 2 студзеня 1410 г.;
в) 25 сакавіка 1385 г.

3. У выніку аб'яднання ВКЛ:
а) цалкам захавала адміністрацыйны апарат, заканадаўства, суд, дзяржаўную пячатку, войска;
б) згубіла права мець свае органы кіравання;
в) цалкам было падпарадкавана Польшчы.

4. Польскі кароль, які ў 1579 г. адваяваў у маскоўскіх войскаў Полацк:
а) Жыгімонт III Ваза;
б) Стэфан Баторый;
в) Станіслаў Панятоўскі.

5. Вайна паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай:
а) 1648 – 1654 г.;
б) 1654 – 1667 г.;
в) 1700 – 1721 г.

6. III Статут ВКЛ:
а) 1569 г.;
б) 1696 г.;
в) 1558 г.

7. «Кардынальныя правы» шляхты ў Рэчы Паспалітай (ці «вольнасці шляхецкія») уключалі: права выбару караля, ... (зрабіце пералік).

8. Вядучы мастацкі напрамак у культуры 2-й паловы XVII – XVIII ст.:
а) барока;
б) класіцызм;
в) ракако.

9. Суаднясіце даты і падзеі :

| | |
|---|---|
| а) 1788 – 1792; | 1) Трэці падзел Рэчы Паспалітай; |
| б) 1773 – 1794; | 2) Дзейнасць Вялікага Сойму; |
| в) 1772; | 3) Прыняцце Канстытуцыі 3 мая; |
| г) 1793; | 4) Другі падзел Рэчы Паспалітай; |
| д) 1791; | 5) Дзейнасць Эдукацыйнай камісіі ў Рэчы Паспалітай; |

е) 1795; 6) Паўстанне пад кіраўніцтвам Т.Касцюшкі;
ж) 1794. 7) Першы падзел Рэчы Паспалітай.

***Адказы***

II. а – не; б – да; в – да; г – не; д – да.

III. 1 – б; 2 – а; 3 – а; 4 – б; 5 – б; 6 – в; 7 – «ліберум вета», права на канфедэрацыі і інш.; 8 – а; 9 а) – 2; б) – 5; в) – 7; г) – 4; д) – 3; е) – 1; ж) – 6.

ТЭМА 6

## НАРАДЖЭННЕ ІНДУСТРЫЯЛЬНАЙ ЦЫВІЛІЗАЦЫІ І ЯЕ ЎПЛЫЎ НА БЕЛАРУСЬ (КАНЕЦ XVIII – 1-я ПАЛОВА XIX ст.)

### План

1. Прамысловая рэвалюцыя і палітычная мадэрнізацыя ў краінах Заходняй Еўропы і ЗША:

а) пачатак зацвярджэння «індустрыяльнага грамадства»;

б) барацьба за ліквідацыю саслоўных прывілей, замацаванне асноўных палітычных і грамадзянскіх правоў;

в) нараджэнне ідэалогіі нацыяналізму і лібералізму;

г) рэвалюцыі 1830 – 1831 г. і іх уздзеянне на Беларусь;

д) рускі і германскі шляхі мадэрнізацыі.

2. Палітыка расійскага царызму ў Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XIX ст.

3. Вайна 1812 г. і Беларусь.

4. Грамадска-палітычны рух на Беларусі ў 1-й палове XIX ст.

5. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў 1-й палове XIX ст.

6. Культурнае жыццё Беларусі ў 1-й палове XIX ст.

### Крыніцы

1. Белоруссия в эпоху феодализма: Сборник документов и материалов: В 4 т. – Мн.: Наука и техника, 1979. – Т. 4. – 376 с.

2. История Беларуси в документах и материалах /Автор.-сост. И.Н.Кузнецов, В.Т.Мазец. – Мн.: Амалфея, 2000. – С. 110 – 179.

3. Военные дневники 1812 года. – М.: Мысль, 1990. – 612 с.

4. Восстание декабристов: Документы и материалы – Т. 4. – М.: 1950; Т. 12. – М.: Мысль, 1969.

5. Прамысловыя прадпрыемствы дарэвалюцыйнай Беларусі / Скл. М.Ф.Болбас. – Мн.: БелСЭ,1988. – 324 с.

6. Хрестоматия по истории Белоруссии. С древнейших времен до 1917 г. – Мн.: БГУ, 1977. – С. 163 – 267.

## Асноўная літаратура

1. Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 ч. – Мн.: Беларусь, 1994. – Ч. 1. – С. 267 – 290.

2. Гісторыя Беларускай ССР: У 5 т. – Мн.: Навука і тэхніка, 1972. – Т. 1. – С. 444 – 592.

3. Гісторыя Беларусі: У 2 ч. – Мн.: Універсітэцкае, 1998. – Ч. 1. – С. 263 – 304.

4. Гісторыя Беларусі: З 1795 г. да вясны 1917 г.: Вучэбны дапаможнік / І.І.Коўкель, І.П.Крэнь, Л.У.Бярэйшык і інш.: Рэд. кал.: І.П.Крэнь, І.І.Коўкель. – Мн.: Аверсэв, 2001. – С. 63 – 347.

5. Ковкель И.И., Ярмусик Э.С. История Беларуси. С древнейших времен до нашего времени. – Мн.: Аверсэв, 1998. – С.89 – 126.

6. Эканамічная гісторыя Беларусі: Вучэбны дапаможнік. – Мн.: Экаперспектыва, 1999. – С. 124 – 150.

7. Альдебер Ж., Бендер Й., Груша И. и др. История Европы. – Мн.: Выш. шк., 1996. – С. 287 – 293, 296 – 305.

8. История: Учебное пособие для вузов. – Ростов-на-Дону: Феникс, 2000. – С. 380 – 406.

9. Пономарев М.В., Смирнова С.Ю. Новая и новейшая история стран Европы и Америки: Практ. пособие. – М.: ВЛАДОС, 2000. – Ч. 2. – С. 3 – 104.

10. Хобсбаум Э. Век революции. Европа 1789 – 1848. – Ростов-на-Дону: Феникс, 1999. – С. 43 – 418.

11. Яковец Ю.В. История цивилизации: Учеб. пособие для студентов вузов гуманит. профиля. – 2-е изд, перераб. и доп. – М.: ВЛАДОС, 1997. – С. 164 – 168.

## Тэмы рэфератаў

1. Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі. Пачатак вайны 1812 г.

2. Рэформы П.Д.Кісялёва на Беларусі.

3. Паўстанне 1830 – 1831 г. на Беларусі.

4. Віленскі універсітэт і яго роля ў культурным жыцці Беларусі ў 1-й трэці XIX ст.

З канца XVIII ст. у краінах Заходняй Еўропы і ЗША нараджаецца тэхнагенная, або індустрыяльная, цывілізацыя. Асноўным яе зместам з’яўлялася прамысловая рэвалюцыя, пачатак якой быў пакладзены ў Англіі. Дайце вызначэнне паняццю «прамысловая рэвалю-

цыя (пераварот)», звярнуўшы ўвагу на яе тэхнічныя і сацыяльныя наступствы. Пакажыце асаблівасці гэтай з’явы ў буйных краінах Захаду.

Прамысловая рэвалюцыя суправаджалася карэннымі зменамі ў палітычнай сістэме грамадства: разгортванне рабочага (чартысцкага) руху ў Англіі, рэформы выбарчай сістэмы, пачатак фарміравання палітычных партый. На аснове ідэй французскіх асветнікаў XVIII ст. нараджаецца ідэалогія нацыяналізму і лібералізму. Раскрыйце яе сутнасць.

Цікава прасачыць першую і другую («вясна народаў») хвалі рэвалюцыйнага ўздыму ў Еўропе: 1830 – 1831 і 1848 – 1849 г., выдзяляючы іх асаблівасці ў вядучых краінах Захаду, іх буржуазны прагрэсіўны характар.

У XIX ст. прамысловая рэвалюцыя праз «цольферайн» («мытны саюз») становіцца галоўным інструментам аб’яднання Германіі і згуртавання нямецкіх дзяржаў вакол Прусіі. Прасачыце германскі шлях мадэрнізацыі грамадства і параўнайце яго з расійскім.

Мяжа XVIII – XIX ст. мае вызначальны характар для гісторыі нашай Радзімы. У выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай тэрыторыя Беларусі ўвайшла ў склад Расійскай імперыі. Ахарактарызуйце новы адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел, палітыку царызму ў адносінах да асноўных саслоўяў насельніцтва, каталіцкай і уніяцкай цэркваў. Вызначце станоўчыя і адмоўныя вынікі працэсу далучэння Беларусі да моцнай, цэнтралізаванай дзяржавы.

Пачатак XIX ст. быў азнаменаваны буйной ваеннай навалай – франка-рускай вайной 1812 г. Назавіце яе прычыны. У чым супярэчлівасць напалеонаўскіх войнаў? Дайце характарыстыку ар’ергардных бітваў на тэрыторыі Беларусі і акупацыйнага рэжыму французаў. Як ставіліся да вайны мясцовая шляхта, сяляне? Ці можна лічыць вайну 1812 г. айчыннай для беларусаў?

Пры аналізе грамадскага-палітычнага руху неабходна даць асобную характарыстыку польскаму нацыянальна-вызваленчаму і расійскаму вызваленчаму рухам.

Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў 1-й палове XIX ст. характарызуецца крызісам феадальна-прыгонніцкай сістэмы і развіццём новых капіталістычных элементаў. Вызначце стан развіцця прамысловасці, гандлю і гарадоў. Чаму вотчынная прамысловасць пераважала над гарадской?

Дакажыце, што феадальныя адносіны і прыгоннае права перашкаджалі развіццю аграрнага сектара, фарміраванню рынку свабоднай працоўнай сілы, накапляльнасці капіталу і г.д. Чаму рэформы П.Кісялёва насілі поліятыўны характар? Якія формы сялянскага руху ў 1-й палове XIX ст. можна вызначыць?

Глыбокія перамены назіраліся ў развіцці культуры Беларусі. Падумайце, якія новыя рысы з'явіліся ў духоўным жыцці. Прасачыце дзве рэформы асветы, ролю расійскіх навукоўцаў у вывучэнні Беларусі, развіццё этнаграфіі, археалогіі, фальклорыстыкі, літаратуры, выяўленчага мастацтва.

Мэтазгодна выкарыстанне відэафільмаў: «Побыт магнатаў, шляхты, гараджан у XVIII – XIX ст.», «Культура Беларусі першай паловы XIX ст.», «Асвета і культура Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст.», «Побыт вясковых жыхароў Беларусі ў XIX ст.», кнігаў з дыяпазітывамі «Беларускія мастакі XIX ст.», «Живопись Белоруссии XIX в.», «Архитектура Белоруссии XIX в.»; картаў: «Российская империя во второй половине XVIII – начале XIX в.», «Европа с 1815 по 1848 г.», «Европа с 1815 по 1848 г.»

## Праверачны тэст

**I.** Падбярыце правільныя адказы:

1. Пра захаванне рыс феадалізму ў беларускай эканоміцы 1-й паловы XIX ст. сведчаць:

а) панаванне памешчыцкага землеўладання;
б) захаванне прыгоннага права;
в) павелічэнне грашовага абарачэння на кірмашах;
г) нязначная роля прамысловасці ў эканоміцы краіны;
д) продаж памешчыкамі і сялянамі сваёй прадукцыі на рынку.

2. Што можна разглядаць як новыя рысы эканамічнага і сацыяльнага развіцця краіны ў 1-й палове XIX ст.:

а) выкарыстанне наёмнай працы на мануфактурах;
б) перавага сельскага насельніцтва;
в) павелічэнне тавараабмену паміж горадам і вёскай;
г) экспарт сельскагаспадарчай прадукцыі;
д) выкарыстанне машын.

3. Таварыства філаматаў было арганізавана па ініцыятыве:

а) І.Дамейкі;
б) Ю.Яжоўскага;
в) Н.Орды;
г) А.Міцкевіча;
д) Т.Зана.

4. Першы музей на Беларусі быў створаны ў Лагойску Яўстафіем Тышкевічам:

а) у 1842 г.;
б) у 1855 г.;
в) у 1861 г.

**II.** Падбярыце абагульняльныя паняцці да наступных сцвярджэнняў:

1. А.Міцкевіч, Т.Зан, Ю.Яжоўскі, М.Рукевіч – гэта ...;

2. М.Бабpoўcкi, А.Кіркор, Т.Нарбут, І.Даніловіч, І.Ярашэвіч, З.Даленга-Хадакоўскі, І.Грыгаровіч – гэта ... .

**III.** Ці згодны вы з наступнымі сцвярджэннямі:

1. Удзельнікі тайных таварыстваў філаматаў і філарэтаў заклікалі да ліквідацыі самадзяржаўя ў краіне;

2. Вайна 1812 г. была для беларускага народа грамадзянскай вайной;

3. «Бабруйскі план паўстання» прадугледжваў арышт цара, абвяшчэнне рэспублікі, паход паўстанцаў на Маскву і паўстанне ў Санкт-Пецярбургу;

4. Тайнае таварыства «Заране» існавала ў Беластоцкай і Свіслацкай гімназіях у 1823 – 1826 г.

**IV.** Выявіце недакладнасці ў наступных сцвярджэннях:

1. «Таварыства ваенных сяброў», «Дэмакратычнае таварыства», «Братні саюз літоўскай моладзі» («Саюз свабодных братоў»), «Таварыства з’яднаных славян» – рэвалюцыйныя арганізацыі 20 – 30-х гадоў XIX ст.

2. А.Трусаў, Ф.Савіч, Ш.Канарскі, Г.Каніскі – дзеячы нацыянальна-вызваленчага руху ў Польшчы, Літве, на Беларусі.

3. З 1801 года тэрыторыя Беларусі ўваходзіла ў склад Гродзенскай, Гомельскай, Мінскай, Літоўскай, Віленскай, Магілёўскай, Віцебскай губерній.

**V.** Адкажыце на наступныя пытанні:

1. Якому органу падпарадкоўваліся ў 1812 г. Віленскі, Мінскі, Гродзенскі і Беластоцкі дэпартаменты:

а) Віленскаму цэнтральнаму паўстанцкаму камітэту;
б) Часоваму ўраду ВКЛ.

2. У якім беларускім горадзе Напалеон пакінуў сваю армію і ад’ехаў у Парыж:

а) у Смаргоні;
б) у Барысаве;
в) у Гародні.

3. Пасля якой гістарычнай падзеі царскі ўрад правёў на тэрыторыі Беларусі наступныя палітычныя акцыі: спыненне дзейнасці на тэрыторыі Беларусі Статута ВКЛ 1588 г., перавод бяднейшай шляхты ў стан аднадворцаў, закрыццё Віленскага універсітэта, акт аб ліквідацыі уніяцкай царквы.

**VI.** Падбярыце да кожнай падзеі адпаведную дату:
а) закрыццё Віленскага універсітэта;
б) утварэнне таварыства філаматаў;
в) забарона дзейнасці ордэна езуітаў;
г) адкрыццё Віленскай археаграфічнай камісіі;
д) ліквідацыя уніяцкай царквы;
е) спыненне дзейнасці Статута ВКЛ на беларускіх землях.

Даты:
а) 1817 г.;
б) 1820 г.;
в) 1832 г.;
г) 1839 г.;
д) 1855 г.;
е)1840 г.

**VII.** Размясціце ў храналагічнай паслядоўнасці факты, звязаныя з вайной 1812 г.:
а) бітва каля вёскі Студзёнка;
б) ар’ергардныя баі каля Віцебска;
в) Барадзінская бітва;
г) бітва каля вёскі Салтанаўка;
д) Смаленская бітва;
е) змаганне за Полацк;
ж) бітва пад Малаяраслаўцам;
з) Маладзечанскі бой.

**VIII.** Пра каго вядзецца гаворка: заснавальнікі навуковай археалогіі на Беларусі, гісторыкі, этнографы і краязнаўцы.

**IX.** Закончыце думку ў наступных сказах:
1. Беларускай Жанай д’Арк назвалі ... ;
2. Для кіраўніцтва паўстаннем на Беларусі і Літве напачатку 1831 г. быў створаны ... ;
3. Земляробчы інстытут заснаваны ў 1840 г. у Горы-Горках, а першы беларускі гістарычна-археалагічны музей – у ..., «Беларускі архіў старажытных грамат» сабраў і выдаў ... .

*Адказы*

I. 1 – а, б, г; 2 – а, в, г, д; 3 – б, г, д; 4 – а.
II. 1 – філаматы; 2 – вучоныя, якія вывучалі гісторыю ВКЛ.
III. 1 – не; 2 – так; 3 – так; 4 – так.
IV. 1 – «Дэмакратычнае таварыства»; 2 – Г. Каніскі; 3 – Гомельская, Літоўская губерні.
V. 1 – б; 2 – а; 3 – пасля паўстання 1830 – 1831 г.
VI. – а – в; б – а; в – б; г – д; д – г; е – е.
VII. г, б, е, д, в, ж, а, з.
VIII. Яўстафій і Канстанцін Тышкевічы.
XIX. 1 – Эмілію Плятэр; 2 – Віленскі цэнтральны паўстанцкі камітэт; 3 – Лагойску, І.Грыгаровіч.

ТЭМА 7

# БЕЛАРУСЬ У ПЕРЫЯД СТАНАЎЛЕННЯ БУРЖУАЗНАГА ГРАМАДСТВА (2-я ПАЛОВА XIX ст. – ЛЮТЫ 1917 г.)

## План

1. Тэндэнцыі гістарычнага развіцця краін Заходняй Еўропы і ЗША ў 2-й палове XIX – пачатку XX ст. Рэвалюцыя Мэйдзі ў Японіі.
2. Расійскія рэформы 1860 – 1880-х г. і асаблівасці іх рэалізацыі на Беларусі. Паўстанне 1863 г. у Беларусі.
3. Контррэформы 80 – 90-х г. XIX ст. Палітычныя саюзы, партыі і рэвалюцыйныя арганізацыі на Беларусі ў 2-й палове XIX ст.
4. Беларусь у пачатку XX ст.:
а) рэвалюцыя 1905 – 1907 г. і яе ход на Беларусі;
б) сталыпінскія рэформы;
в) першая сусветная вайна і Беларусь;
г) падзеі Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. на Беларусі.
5. Культурнае жыццё Беларусі ў 2-й палове XIX – пачатку XX ст.

## Крыніцы

1. Белоруссия в эпоху капитализма. Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии: Сборник документов и материалов / Сост. В.И.Мелешко, З.Е.Абезгауз, Т.А.Воробьёва и др. – Мн.: Наука и техника, 1983. – Т. 1. – 272 с.
2. Белоруссия в эпоху капитализма. Развитие капитализма в промышленности, положение промышленных рабочих и рабочее движе-

ние в Белоруссии: Сборник документов и материалов / Сост. З.Е.Абезгауз, Н.Л.Рябцевич. – Мн.: Наука і тэхника, 1990. – Т. 2. – 336 с.

3. Восстание в Литве и Белоруссии 1863 – 1864 г.: Материалы и документы. – М.: Наука, 1965. – 584 с.

4. Документы и материалы по истории Белоруссии (1900 – 1917 г.). – Мн.: АН БССР, 1953. – 1020 с.

5. История Белоруссии в документах и материалах. – Мн.: Амалфея, 2000. – С.180 – 250.

6. Крестьянское движение в Белоруссии после отмены крепостного права (1861 – 1862 г.): Документы и материалы. – Мн.: Госиздат БССР, 1959. – 449 с.

7. Революционное движение в Белоруссии 1905 – 1907 г.: Документы и материалы. – Мн.: АН БССР, 1985. – 746 с.

8. Хрестоматия по истории Белоруссии. С древнейших времен до 1917 г. – Мн.: БГУ, 1977. – С. 268 – 432.

## Асноўная літаратура

1. Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 ч. / М.П.Касцюк, У.Ф.Ісаенка, Г.В.Штыхаў і інш. – Мн.: Беларусь, 1994. – Ч. 1. – С. 304 – 464.

2. Гісторыя Беларускай ССР: У 5 т. – Мн.: Наука и техника, 1972. – Т. 2. – С.15 – 645.

3. Гісторыя Беларусі: У 2 ч. – Мн.: Універсітэцкае, 1998. – Ч. 1. – С. 305 – 401.

4. Гісторыя Беларусі: З 1795 г. да вясны 1917 г.: Вучэбны дапаможнік / І.І.Коўкель, І.П.Крэнь, Л.У.Бярэйшык і інш.: Рэд. кал.: І.І.Крэнь, І.І.Коўкель. – Мн.: Аверсэв, 2001. – С.147 – 179, 202 – 230, 250 – 338.

5. Эканамічная гісторыя Беларусі. – Мн.: Экаперспектыва, 1999. – С. 151 – 215.

6. Ковкель И.И., Ярмусик Э.С. История Беларуси. С древнейших времен до нашего времени. – Мн.: Аверсэв, 1998. – С. 127 – 271.

7. Альдебер Ж., Бендер Й., Груша И. и др. История Европы. – Мн.: Выш. шк., 1996. – С. 287 – 327.

8. Пономарев М.В., Смирнова С.Ю. Новая и новейшая история стран Европы и Америки: Практическое пособие: В 3 ч. – М.: ВЛАДОС, 2000. – Ч. 2. – С. 105 – 284.

9. Хобсбаум Э. Век капитала. 1848 – 1875. – Ростов-на-Дону: Феникс, 1999. – 480 с.

10. Хобсбаум Э. Век империи. 1875 – 1914. – Ростов-на-Дону: Феникс, 1999. – 512 с.

# Тэматыка рэфератаў

1. Сельская гаспадарка Беларусі ў 2-й палове XIX ст.
2. Прамысловасць і гарады Беларусі ў 2-й палове XIX ст.
3. Фарміраванне беларускай нацыі.
4. Беларускае адраджэнне ў пачатку XX ст.

У другой палове XIX ст. краіны Заходняй цывілізацыі цвёрда становяцца на шлях буржуазнага развіцця. Прасачыце тэндэнцыі іх палітычнага, ідэйнага, сацыяльна-эканамічнага, духоўнага развіцця. Звярніце ўвагу на супярэчлівасць грамадскіх працэсаў: станаўленне парламентарызму, «эру рабочага заканадаўства» і рэвалюцыі. Як адбылося аб'яднанне Германіі і Італіі? У чым сакрэт папулярнасці сацыял-дэмакратычнай ідэі?

Менавіта ў гэты перыяд былі закладзены асновы будучага ўзлёту Японіі праз «рэфармацыю Мэйдзі» і фінансава-эканамічнай магутнасці ЗША, якія пазналі вострае грамадзянскае супрацьстаянне паміж Поўначчу і Поўднем (грамадзянская вайна). У чым своеасаблівасць японскага шляху мадэрнізацыі? Чаму перыяд гістарычнага развіцця ЗША ў 2-й палове XIX ст. лічыцца «сярэбраным»?

На мяжы стагоддзяў назіраецца скачок у развіцці вытворчых сіл грамадства (чым гэта было выклікана?), што прывяло да ўзмацнення канцэнтрацыі вытворчасці і ўзнікнення манаполій. Пералічыце асноўныя іх формы. Капіталістычныя краіны здзейснілі пераход на новую стадыю развіцця –імперыялістычную, для вызначэння якой У.І.Ленін вылучыў пяць прыкмет. Назавіце іх.

Бадай, самай галоўнай падзеяй XIX ст. у гісторыі Расіі і Беларусі з'яўляюцца рэформы 60 – 80-х г. Асноўнай была адмена прыгоннага права – эканамічная або сялянская рэформа 1861 г., якая выклікала шэраг палітычных і духоўных рэформаў. Разглядзіце прычыны адмены прыгоннага права, падрыхтоўку рэформы і яе правядзенне. Пакажыце асаблівасці правядзення рэформы ў беларускіх губернях. У чым яе гістарычнае значэнне?

Паўстанне 1863 г. неабходна вывучаць, пачынаючы з аналізу дзвюх асноўных плыняў польскага нацыянальна-вызваленчага руху: «белых» і «чырвоных». Параўнайце іх па наступнаму плану: мэта, задачы, сацыяльны склад, праграма. Чаму К.Каліноўскага, В.Урублеўскага, Ф.Ражанскага лічаць рэвалюцыянерамі-дэмакратамі? Які ўплыў аказаў К.Каліноўскі і яго «Мужыцкая праўда» на станаўленне беларускага нацыянальнага руху? Раскажыце аб ходзе паўстання вясной – летам 1863 г. Чаму яно пацярпела паражэнне?

Рэформы Аляксандра II («Вызваліцеля») змяняюцца контррэформамі Аляксандра III, якія былі не толькі адказам на тэрарыстычны акт, здзейснены 1 сакавіка 1881 г., але і формай нежадання арыстакратычных колаў краіны праводзіць курс на фарміраванне буржуазнай манархіі. Ахарактарызуйце контррэформы. У чым іх адыход ад папярэдніх пераўтварэнняў? Звярніце ўвагу на абмежавальныя законы супраць яўрэяў і палякаў.

Асноўную ролю ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі 2-й паловы XIX ст. адыгрывалі народніцкі і сацыял-дэмакратычны рухі. Зрабіце іх аналіз. Пры гэтым адзначце асаблівасць ідэалогіі народнікаў, утапізм іх поглядаў. Пакажыце ўплыў агульнарасійскіх арганізацый «Зямля і воля», «Чорны перадзел», «Народная воля» на дзейнасць беларускіх народнікаў. У чым спецыфіка поглядаў пецярбургскай групы «Гоман»?

З актывізацыяй рабочага руху ўзрастае роля марксізму, прапаганду якога са Швейцарыі актыўна распачала група «Вызваленне працы». Прасачыце працэс арганізацыі марксісцкіх гурткоў у Беларусі. Чаму яны былі нешматлікімі і не мелі цеснай сувязі з пралетарыятам? Якое значэнне мела брашура А.Крэмера «Аб агітацыі»? Дайце характарыстыку палітычных партый, дзейнасць якіх ахоплівала і беларускія губерні. Важна адзначыць актывізацыю сіянісцкага руху ў Беларусі на мяжы XIX – XX ст. Што такое сіянізм? Дайце характарыстыку яго станоўчых і адмоўных бакоў. Як мяняліся адносіны царызма да яго? Падумайце, чаму ў пачатку XX ст. распаўсюджваецца такая з’ява, як «паліцэйскі сацыялізм». Пацвердзіце яе характарыстыкай дзейнасці Яўрэйскай незалежнай рабочай партыі.

Першую рускую рэвалюцыю 1905 – 1907 г. мэтазгодна аналізаваць па плану: прычыны, зачэпка, рухаючыя сілы, характар, ход, вынікі, значэнне. Ход падзей рэвалюцыі можна раскрыць па трох этапах: студзень – жнівень 1905 г. – пачатак і ўздым рэвалюцыі, кастрычнік – снежань 1905 г. – найвышэйшы ўздым, 1906 – 3 чэрвеня 1907 г. – спад і паражэнне рэвалюцыі. Звярніце ўвагу на чаргаванне палітычных і эканамічных выступленняў пралетарыяту ў беларускіх губернях, адносіны мясцовых палітычных сіл да «булыгінскай» Думы. Пакажыце дыферэнцыяцыю грамадска-палітычных сіл пасля выдання Мікалаем II Маніфеста ад 17 кастрычніка 1905 г. Прасачыце за дзейнасцю дэпутатаў беларускіх губерняў у I-й і II-й Дзяржаўных думах.

Абвастрэнне аграрнага пытання ў пачатку XX ст. выклікала актыўны ўдзел сялянства ў рэвалюцыі 1905 – 1907 г. і шматлікія дыскусіі паміж фракцыямі ў Думе. Вынік быў знойдзены ў рэалізацыі ўрадавай праграмы – сталыпінскай аграрнай рэформы. Вызначце яе характар. Дайце ацэнку асобе П.А.Сталыпіна.

Вывучэнне падзей першай сусветнай вайны на Беларусі неабходна пачаць з аналізу яе прычын, характару, ходу ваенных дзеянняў. Раскажыце аб «Свянцянскім прарыве», «Нарачанскай» і «Баранавічскай» аперацыях. Як паўплывала вайна на палітычныя, эканамічныя і сацыяльныя абставіны ў Беларусі?

Лютаўская буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя 1917 г. стала вынікам абвастрэння супярэчнасцяў у грамадстве ва ўмовах сусветнай вайны. Яна прывяла да ліквідацыі манархіі і ўсталявання двоеўладдзя. Прасачыце рэвалюцыйныя падзеі ў Мінску, Віцебску, Магілёве, Гомелі, на Заходнім фронце. Чаму перыяд сакавік – красавік 1917 г. называюць «часам з'ездаў»? Калі і з якой мэтай быў створаны Беларускі нацыянальны камітэт на чале з Р.Скірмунтам?

У канцы XIX ст. пачынаецца працэс фарміравання беларускай нацыі, абумоўлены развіццём капіталізму. Пакажыце асаблівасці новага этапу этнічнай гісторыі. Дайце характарыстыку асноўных кірункаў развіцця культуры Беларусі.

Пажадана выкарыстанне відэафільмаў: «Паўстанне 1863 г. на Беларусі», «Беларускі нацыянальна-вызваленчы рух у перыяд 1905-1907 г.», «Культура Беларусі ў пачатку XX ст.»; дыяфільма «Крестьянская реформа 1861 г.»; дыяпазітываў: «Первая революция в России», кнігаў з дыяпазітывамі: «Архитектурные памятники XX в. в Белоруссии», «Литература Белоруссии второй половины XIX – начала XX в.», «Живопись Белоруссии XIX в.», «Беларускія мастакі XIX ст.»; картаў: «Россия после реформы 1861 –1900 г.», «Россия в XIX – начале XX в.», «Первая русская революция 1905 – 1907 г.», «Россия с 1907 по 1914 г.», «Территориально-политический раздел мира с 1876 по 1914 г.», «Первая мировая война 1914 – 1918 г.».

## Праверачны тэст

**I.** Падбярыце правільныя адказы:

1. Пасля абнародвання Маніфеста 19 лютага 1861 г. становішча сялян змянілася:

а) сяляне былі ўраўнаваны ў правах з прадстаўнікамі іншых саслоўяў;

б) сяляне атрымалі асабістую свабоду;

в) сяляне атрымалі зямлю ў прыватную ўласнасць;

г) былыя прыгонныя былі надзелены зямлёю без выкупу.

2. 1 сакавіка 1881 г. народнікі забілі цара Аляксандра II. Гэта было:

а) заслужанай карай самадзержцу;

б) палітычным забойствам;
в) актам, які замарудзіў дэмакратычнае абнаўленне краіны;
г) актам, які садзейнічаў паскоранаму развіццю расійскага грамадства;
д) безадказнай і злачыннай акцыяй.

3. Міравы суд па рэформе 1864 г.:
а) складаўся з прысяжных засядацеляў;
б) мог прыгаварыць да смяротнага пакарання;
в) разглядаў дробныя крымінальныя і грамадзянскія справы.

4. Вынікам прамысловага перавароту на Беларусі з'яўляецца:
а) павелічэнне колькасці рамесніцкіх майстэрняў;
б) рост гарадоў;
в) шырокае будаўніцтва чыгунак;
г) колькасць фабрых і заводаў павялічылася з 1860 г. да канца XIX ст. у 15 разоў.

5. Выканаўчую ўладу ў Расійскай імперыі на пачатку XX ст. ажыццяўляў:
а) Сенат;
б) Дзяржаўны Савет;
в) Савет Міністраў;
г) Дзяржаўная дума.

**II.** Падбярыце абагульняльныя словы да кожнага сказа ў наступных пераліках:
1. К.Каліноўскі, В.Урублеўскі, З.Серакоўскі, А.Звяждоўскі, М.Чэрняк – кіраўнікі ...;
2. Браты А. і І.Луцкевічы, В.Іваноўскі, А.Пашкевіч былі ...;
3. «Крывавая нядзеля», « курлоўскі растрэл», кастрычніцкая палітычная стачка, Снежаньскае ўзброенае паўстанне – асноўныя падзеі ...;
4. С.Кавалік, М.Судзілоўскі, Р.Ісаеў, І.Грынявіцкі, А.Бонч-Асмалоўскі, А.Марчанка, Х.Ратнер, К.Брэшка-Брашкоўская, Р.Гершуні – вядомыя ... .

**III.** Расшыфруйце наступныя абрэвіятуры:
1. СДКПіЛ, Бунд, РСДРП;
2. ПСР, ППС, БСГ.

**IV.** Ці згодны вы з наступнымі сцвярджэннямі:

1. Па Маніфесту 17 кастрычніка 1905 г. Дзяржаўная дума надзялялася законадарадчымі правамі;

2. «Курлоўскі растрэл» у Мінску быў выкліканы хваляваннямі салдат Мінскага гарнізона;

3. Цэнтральны нацыянальны камітэт у Варшаве ўзначаліў К.Каліноўскі;

4. Аграрны крызіс 80 – 90-х г. XIX ст. захаваў збожжавую спецыялізацыю Беларусі;

5. Імперыялізм – новая форма арганізацыі масавай вытворчасці, заснаваная на выпуску стандартызаванай прадукцыі.

**V.** Знайдзіце недакладнасці ў наступных сцвярджэннях:

1. Ф.Ражанскі, Э.Заблоцкі, К.Каліноўскі, В.Урублеўскі, А.Трусаў, М.Мураўёў – кіраўнікі паўстання 1863 г. у Літве і на Беларусі.

2. «Народная воля», «Чорны перадзел», група «Вызваленне працы», «Гоман» – рэвалюцыйныя арганізацыі народнікаў.

3. Сталыпінская аграрная рэформа прадугледжвала:

а) стварэнне на вёсцы моцнай апоры для самадзяржаўя з заможных уласнікаў;

б) спрыянне ўтварэнню адрубных і хутарскіх гаспадарак;

в) разбурэнне сельскай абшчыны;

г) стварэнне Сялянскага банка;

д) перасяленне малазямельных сялян з еўрапейскіх губерняў у Сібір.

**VI.** Прадоўжыце пералік у наступных сказах:

1. Рэформы 60 –80-х г. у Расійскай імперыі: адмена прыгоннага права, ...;

2. Дзяржаўныя думы Расійскай імперыі існавалі: 1-я – красавік-ліпень 1906 г., II-я – ..., III-я ..., IV-я ... ;

3. У рэдакцыю газеты «Наша ніва» ўваходзілі А.Уласаў, ... ;

4. Значным укладам у развіццё беларусазнаўства і вялікае значэнне для абуджэння нацыянальнай свядомасці мелі выданні лемантара (буквара) А.Аскеркам у 1862 г., «Слоўніка беларускай мовы» («Словарь белорусского наречия») ..., даследавання «Беларусы» ... .

**VII.** Падбярыце да кожнай падзеі адпаведную дату:

Падзеі:

а) утварэнне РСДРП;

б) стварэнне группы «Гоман»;

в) адмена прыгоннага права;
г) стварэнне Бунда;
д) акупацыя заходніх раёнаў Беларусі кайзераўскімі войскамі;
е) абвяшчэнне сталыпінскай аграрнай рэформы.
Даты:
а) 1861 г.;
б) 1884 г.;
в) 1897 г.;
г) 1898 г.;
д) 1906 г.;
е) 1915 г.

**VIII.** Размясціце ў храналагічнай паслядоўнасці падзеі Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. у Мінску:
а) стварэнне рабочых дружын;
б) утварэнне «грамадскіх камітэтаў парадку»;
в) вызваленне палітвязняў з турмы;
г) прызначэнне камісара з Петраграда;
д) утварэнне Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў і народнай міліцыі;
е) весткі па радыё аб перамозе рэвалюцыі ў Петраградзе.

**IX.** Суаднясіце прозвішчы беларускіх вучоных, даследчыкаў і падарожнікаў з іх дзейнасцю.
Прозвішчы:
а) К.Семяновіч;
б) М.Пачобут-Адляніцкі;
в) Ш.Казырэўскі;
г) І.Дамейка;
д) Я.Наркевіч-Едка;
е) Я.Чэрскі;
ж) М.Судзілоўскі;
з) І.Капіеўскі.

Дзейнасць:
а) вядомы геолаг, рэктар універсітэта ў г. Санцьяга, народны герой Чылі;
б) інжынер і тэарэтык артылерыі XVII ст.;
в) заснавальнік астранамічнай школы ў Вільні;
г) вядомы піяніст, урач, вынаходнік радыё;
д) даследчык Курыльскіх астравоў і правіцель Камчаткі;

е) асветнік, пісьменнік, энцыклапедыст, распрацаваў грамадзянскі шрыфт;

ж) філосаф, хірург, грамадска-палітычны дзеяч, падарожнік, сенатар і прэзідэнт на Гавайскіх астравах;

з) геолаг і географ, даследчык Усходняй Сібіры і Далёкага Усходу, узнагароджаны трыма залатымі медалямі рускага Імператарскага геаграфічнага Таварыства. Яго імем названы сістэма горных храбтоў у Якуціі і хрыбет у Забайкаллі.

**X.** Запоўніце пропускі ў наступных сказах:

Праект мунiпалізацыі зямлі прапаноўвала фракцыя меншавікоў, праект сацыялізацыі зямлі–партыя ..., патрабавала нацыяналізацыі зямлі фракцыя ... .

**XI.** Дайце тлумачэнні наступным паняццям:

а) заходнерусізм – гэта ...;

б) шавінізм – гэта ... ;

в) сіянізм – гэта ... .

***Адказы***

I. 1 – б; 2 – б, в ; 3 – в; 4 – б, в, д; 5 – в.

II. 1 – паўстанне 1863 г. на Беларусі і Літве; 2 – заснавальнікі БСГ; 3 – рэвалюцыі 1905 – 1907 г.; 4 – беларускія народнікі.

III. 1 – Сацыял – дэмакратыя Каралеўства Польскага і Літвы, Усеагульны яўрэйскі рабочы саюз у Літве, Польшчы і Расіі, Расійская сацыял – дэмакратычная рабочая партыя; 2 – Партыя сацыялістаў – рэвалюцыянераў, Польская сацыялістычная партыя, Беларуская сацыялістычная грамада.

IV. 1 – не; 2 – не; 3 – не; 4 – не; 5 – не.

V. 1 – М. Мураўёў; 2 – група «Вызваленне працы»; 3 – г.

VI. 1 – земская, судовая, гарадская, ваенная, школьная, цэнзурная; 2 – люты – чэрвень 1907 г., 1907 – 1912 г., 1912 – 1917 г.; 3 – браты І. і А.Луцкевічы, В.Ластоўскі, Ядвігін Ш., Янка Купала; 4 – І.Насовічам, Я.Карскім.

VII. а – г; б – б; в – а; г – в; д – е; е – д.

VIII. е, в, а, д, б, г.

IX. а – б; б – в; в – д; г – а; д – г; е – з; ж – ж; з – е.

X. – эсэраў, бальшавікоў.

XI. а – палітыка расійскіх шавіністаў, якая адмаўляла беларусаў як самастойны этнас і лічыла іх адгалінаваннем рускага народа;

б – палітыка, накіраваная на ўзвышэнне якой-небудзь нацыі;

в – нацыянальна-вызваленчы рух яўрэяў.

ТЭМА 8

# БЕЛАРУСЬ У ПЕРЫЯД КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ 1917 г. і ГРАМАДЗЯНСКАЙ ВАЙНЫ

## План

1. Абвастрэнне палітычнай сітуацыі ў Расіі і на Беларусі ў красавіку-верасні 1917 г.

2. Падзеі Кастрычніцкай рэвалюцыі на Беларусі.

3. Беларускі нацыянальны рух у 1917 – 1918 г.:

а) I з'езд беларускіх нацыянальных партый і арганізацый;

б) II з'езд беларускіх нацыянальных партый і арганізацый;

в) I Усебеларускі кангрэс;

г) абвяшчэнне БНР.

4. Падрыхтоўка і абвяшчэнне БССР. Утварэнне Літоўска-Беларускай ССР.

5. Версальска-Вашынгтонская сістэма міжнародных адносін. Савецка-польская вайна і яе вынікі.

## Крыніцы

1. Документы и материалы по истории Белоруссии. Из истории установления Советской власти в Белоруссии и образования СССР. – Мн.: АН БССР, 1954. – 516 с.

2. История Беларуси в документах и материалах / Авт.-сост. И.Н.Кузнецов, В.Г.Мазец. – Мн.: Амалфея, 2000. – С. 252 – 396.

3. По воле народа: из истории образования БССР и создания КПБ: Документы и материалы. – Мн.: Беларусь, 1988. – С. 15 – 24, 37 – 39, 43, 47 – 48, 56 – 61, 69 – 70, 73 – 76, 83 – 133.

4. Хрестоматия по истории БССР (1917 – 1983). – Мн.: Университетское, 1984. – С. 6 – 118.

## Асноўная літаратура

1. Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 ч. / М.П.Касцюк, І.М.Ігнаценка, У.І.Вышынскі і інш. – Мн.: Беларусь, 1995. – Ч. 2. – С. 8 – 76.

2. Гісторыя Беларускай ССР: У 5 т. – Мн.: Навука і тэхніка, 1973. – Т. 3. – С. 13 – 252.

3. Гісторыя Беларусі: У 2 ч. / Вучэбны дапаможнік / Пад рэд. Я.К.Новіка, Т.С.Марцуля. – Мн.: Універсітэцкае, 1998. – С. 7 – 106.

4. Ковкель И.И., Ярмусик Э.С. История Беларуси. С древнейших времён до нашего времени. – Мн.: Аверсэв, 1998. – С. 271 – 392.
5. Эканамічная гісторыя Беларусі . – Мн.: Экаперспектыва, 1999. – С. 216 – 232.
6. Альдебер Ж., Бендер Й., Груша И. и др. История Европы. – Мн.: Выш. шк., 1996. – С. 327.
7. Пономарёв М.В., Смирнова С.Ю. Новая и новейшая история стран Европы и Америки: Практ. пособие: В 3 ч. – М.: ВЛАДОС, 2000. – Ч. 2. – С. 175 – 179.
8. История: Учебное пособие для вузов. – Ростов-на-Дону: Феникс, 2000. – С. 484 – 574.
9. Палітычныя партыі Беларусі: Дапам. для вывучаючых гісторыю Беларусі. – Мн.: Згода, 1994. – 262 с.
10. Палітычныя партыі і грамадска-палітычныя рухі Беларусі. Выпуск Зах. – Мн.: АН Беларусі (Беларусістыка, № 25), 1994. – 500 с.
11. Беларусь на мяжы тысячагоддзяў. – Мн.: БелЭн, 2000. – С. 111 – 124.

## Тэмы рэфератаў

1. Умацаванне Савецкай улады ў Беларусі (кастрычнік 1917 – люты 1918 г.).
2. Мяцеж корпуса Доўбар-Мусніцкага.
3. Акупацыйны рэжым кайзераўскай Германіі на тэрыторыі Беларусі ў 1918 г.
4. Палітыка і тактыка беларускіх палітычных партый і арганізацый ва ўмовах польскай акупацыі.
5. Акупацыйны рэжым польскіх інтэрвентаў на часова захопленай тэрыторыі Беларусі (1919 – 1920 г.).

Тэма ахоплівае шырокі спектр пытанняў гісторыі Беларусі 1917 – 1920 г. Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 г. была выклікана папярэднім ходам гістарычнага развіцця. Раскажыце аб тэндэнцыях грамадска-палітычнага жыцця ва ўмовах двоеўладдзя: палярызацыя сіл унутры расійскай сацыял-дэмакратыі, супрацьстаянне «кадэты – бальшавікі», першы і другі крызісы Часовага ўрада і інш. Чаму ў ліпені 1917 г. двоеўладдзе было ліквідавана? Як ажыццяўлялася барацьба з карнілаўскім мецяжом на тэрыторыі Беларусі? Дакажыце, што ў верасні-кастрычніку краіну ахапіў агульнанацыянальны крызіс.

Другое пытанне неабходна пачынаць разглядаць з падзей у Петраградзе. Паспрабуйце вызначыць сваю пазіцыю па праблеме Кас-

трычніцкай рэвалюцыі: гэта «пераварот», здзейснены партыяй бальшавікоў ці вынік вострых палітычных і сацыяльна-эканамічных супярэчнасцяў, ахапіўшых тагачаснае грамадства. Ахарактарызуйце рашэнні II Усерасійскага з’езда Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў.

Разглядзіце падзеі гэтай рэвалюцыі на неакупаванай (ішла першая сусветная вайна) тэрыторыі Беларусі. Сканцэнтруйце асноўную ўвагу на падзеях у Мінску. Як было ліквідавана супраціўленне «Камітэта выратавання рэвалюцыі»? Чаму, на думку бальшавіка Альмінскага, лёс рэвалюцыі вырашаўся ў Магілёве? Дакажыце гэта.

Прасачыце сацыяльна-эканамічныя і культурныя пераўтварэнні дыктатуры пралетарыяту на аснове першых дэкрэтаў Савецкай улады. Што ўяўляла палітыка «ваеннага камунізму»? Якія існуюць погляды сярод гісторыкаў адносна яе характару?

Адным з важнейшых пытанняў тэмы з’яўляецца праблема беларускага нацыянальнага руху і абвяшчэння беларускай дзяржавы ў 1918 – 1919 г. Згодна з прапанаваным планам раскажыце аб этапах падрыхтоўкі гэтага працэсу, звязаўшы са складанай знешнепалітычнай абстаноўкай (перамовы ў Брэст-Літоўску і іх зрыў, наступленне кайзераўскіх войск на тэрыторыі Беларусі і яе акупацыя (Брэсцкі мір)). Ці можна лічыць БНР суверэннай дзяржавай? Як вы ацэньваеце дзейнасць Рады БНР, 4-ю і 5-ю ўстаўныя граматы? Ці аказала БНР уплыў на стварэнне беларускай савецкай дзяржаўнасці?

Курс на незалежнасць Беларусі цвёрда праводзілі беларускія секцыі пры ЦК РКП(б) і Беларускі нацыянальны камітэт, аб чым сведчаць рэзалюцыі канферэнцый і з’ездаў беларускіх бежанцаў і інш. Якую пазіцыю займаў Аблвыкамзах? Абаснуйце яе. Прасачыце працэс утварэння БССР. Чаму У.І.Ленін згадзіўся на стварэнне ССРБ? Чаму было прынята рашэнне аб арганізацыі «буфернай» краіны – ЛітБелССР? Як гэта адбылося?

Раскажыце аб выніках першай сусветнай вайны, абапіраючыся на ход Парыжскай і Вашынгтонскай мірных канферэнцый. Звярніце ўвагу на нежаданне краін Антанты разглядаць «беларускае» пытанне і супярэчлівасць Версальска–Вашынгтонскай сістэмы міжнародных адносін.

Беларусь у 1918 – 1920 г. зведала дзве акупацыі: нямецкую (кайзераўскую) і польскую. Ахарактарызуйце і параўнайце іх. Пакажыце пазіцыю Ю.Пілсудскага па беларускаму пытанню, яго ўзаемаадносіны з Радай БНР. Чаму адбыўся яе раскол? Пры аналізе савецка-польскай (або польска-савецкай) вайны 1920 г. звярніце ўвагу на ўплыў ідэалагічнага фактару – ідэі сусветнай рэвалюцыі. Калі і ў якіх межах адбылося другое абвяшчэнне БССР? Калі і на якіх умовах быў заключаны Рыжскі мірны дагавор?

Што датычыцца культурнай спадчыны БССР у 20 – 30-я г. XX ст., то мэтазгодна падзяліць гэты перыяд на два этапы. Першы – культурнае жыццё ў перыяд ажыццяўлення палітыкі «беларусізацыі», другі – у перыяд усталявання каманднa-адміністрацыйнай сістэмы. Параўнайце іх па асноўных кірунках духоўнага жыцця. Зрабіце адпаведныя высновы.

Мэтазгодна выкарыстаць дыяфільм «Великая Октябрьская социалистическая революция (июль–октябрь 1917 г.)»; карты: «Подготовка Великой Октябрьской социалистической революции», «Великая Октябрьская социалистическая революция и триумфальное шествие Советской власти», «Великая Октябрьская социалистическая революция и гражданская война», «Иностранная интервенция и гражданская война 1919 – 1920 г.».

## Праверачны тэст

**1.** Падбярыце правільны адказ:

А. Аблвыкамзах з'яўляўся:

а) часовым органам улады на перыяд усталявання Савецкай улады на Беларусі;

б) органам ваеннай улады Заходняй вобласці і фронту;

в) вышэйшым органам Савецкай улады на Беларусі ў 1917 – 1918 г.;

Б. Абвяшчэнне незалежнасці БНР адбылося:

а) 21 лютага 1918 г.;

б) 9 сакавіка 1918 г.;

в) 25 сакавіка 1918 г.

В. Першы ўрад Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусь узначальваў:

а) А.Мяснікоў;

б) А.Чарвякоў;

в) З.Жылуновіч;

г) В.Кнорын.

**2.** Падбярыце абагульняльныя словы да наступных сказаў:

А. М.В.Рагозінскі, А.Ф.Мяснікоў, А.М.Дайнэка, І.Я.Алібегаў, М.І.Крывашэін – члены ...

Б. А.Аўсянік, А.Бурбіс, Я.Варонка, К.Езавітаў, В.Захарка, Л.Заяц, П.Крэчэўскі, Я.Серада, А.Смоліч – члены ...

В. А.Ф.Мяснікоў, М.І.Калмановіч, В.Р.Кнорын, А.Ф.Пярно, В.С.Селязнёў, З.Ф.Жылуновіч складалі ...

**3.** Ці згодны вы з наступнымі сцвярджэннямі:

А. 2–3 лютага 1919 г. паміж Расіяй і Польшчай была створана буферная дзяржава – Літоўска-Беларуская Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка (ЛітБел).

Б. Другое абвяшчэнне БССР адбылося 31 ліпеня 1920 г. у ходзе савецка-польскай вайны.

В. Аблвыкамзах адстойваў пытанне аб нацыянальным самавызначэнні беларусаў.

Г. ППС і БСДП выступалі за федэрацыю Беларусі, Літвы і Украіны з Польшчай.

**4.** Выявіце недакладнасці ў наступных сцвярджэннях:

А. Я.Варонка, П.Крэчэўскі, А.Смоліч, П.Бадунова, Т.Грыб, К.Езавітаў, Я.Серада, Л.Заяц, Б.Кнорын з'яўляліся актыўнымі палітычнымі дзеячамі, якія стваралі БНР.

Б. А.Чарвякоў, В.Ластоўскі, Я.Адамовіч, Б.Багуцкі, У.Ігнатоўскі, А.Славінскі, А.Хацкевіч, Ш.Ходаш былі членамі ўрада Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі.

В. БСГ раскалолася на Беларускую сацыял-дэмакратычную партыю (БСДП), Беларускую партыю сацыялістаў-федэралістаў (БПС-Ф), Беларускую партыю сацыялістаў-рэвалюцыянераў (БПС-Р), Хрысціянска-дэмакратычную злучнасць (ХДЗ).

**5.** Прадоўжыце пералік у наступных сцвярджэннях:

А. Лёс Кастрычніцкай рэвалюцыі, як зазначыў вядомы публіцыст М.С.Альмінскі, вырашаўся ў трох цэнтрах: ...

Б. У Бюро нелегальнай работы пры ЦК КП (б) ЛітБела ўваходзілі ...

В. Палітыка «ваеннага камунізму» прадугледжвала ...

**6.** Падбярыце да кожнай падзеі адпаведную дату:

Падзеі:

А. Утварэнне БССР.

Б. Другое абвяшчэнне БССР.

В. І Усебеларускі кангрэс.

Г. Брэсцкі мір.

Д. Рыжскі мір.

Даты:

а) 1917 г.;

б) 1918 г.;

в) 1919 г.;

г) 1921 г.;
д) 1920 г.

**7.** Пра каго вядзецца гаворка: «Беларускі гісторык і грамадскі дзеяч, народны камісар асветы БССР, старшыня Інбелкульта, першы прэзідэнт Беларускай акадэміі навук».

**8.** Запоўніце пропускі ў наступных сказах:

А. У 1919 г. тэрыторыя БССР была скарочана да ... паветаў ... губерні.

Б. Выканаўчым органам Заходняй вобласці і фронту стаў ... на чале з ... .

В. Падчас германскай акупацыі БПС-Р стала на шлях арганізацыі сялянскіх дружын, якія пазней былі аб’яднаны ў ...

Г. 13 снежня 1919 года адбыўся раскол Рады БНР на ... Раду БНР (лідэр – ...) і на ... Раду БНР (лідэр ...).

***Адказы***

1. А – б ; Б – в ; В – в.
2. А – Аблвыкамзаха ; Б – Народнага сакратарыята БНР ; В – Цэнтральнае бюро КП(б)Б.
3. А – так ; Б – так ; В – не ; Г – так.
4. А – В.Кнорын ; Б – В.Ластоўскі ; В – ХДЗ.
5. А – Петраградзе, Маскве, Магілёве ;

Б – В.Міцкявічус – Капсукас, В.Кнорын, В.Багуцкі ;

В – харчразвёрстку, арганізацыю камітэтаў беднаты, усеагульную нацыяналізацыю прамысловасці, забарону свабоднага гандлю, размеркаванне прадметаў масавага спажывання па картачнай сістэме; адмену платы за жыллё і камунальныя паслугі, усеагульную працоўную павіннасць.
6. А – в ; Б – д ; В – а ; Г – б ; Д – г.
7. У.М.Ігнатоўскі.
8. А – 6 паветаў Мінскай губерні ;

Б – Савет Народных Камісараў Заходняй вобласці і фронту на чале з К.І.Ландэрам;

В – «Сувязь беларускага працоўнага сялянства»;

Г – Найвышэйшую (Я.Лёсік), Народную (П.Крэчэўскі).

## ТЭМА 9

# БЕЛАРУСЬ У МІЖВАЕННЫ ЧАС

## План

1. Асноўныя тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага, палітычнага, ідэйнага і культурнага развіцця свету ў міжваенны час.

2. Пераход да НЭПа і яго рэалізацыя ў Беларусі.

3. Нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва ў БССР у 1921 – 1928 г. Удзел БССР ва ўтварэнні Саюза ССР.

4. Грамадска-палітычнае жыццё ў БССР у канцы 20-х – пачатку 40-х г. ХХ ст.:

а) завяршэнне ўнутрыпартыйнай барацьбы;

б) разгром беларускага нацыянал-дэмакратызма;

в) фарміраванне культу асобы І.В.Сталіна. Канстытуцыя БССР 1937 г.;

г) узмацненне рэпрэсіўных функцый дзяржавы. Палітычныя рэпрэсіі ў БССР у 30-я г.

5. Заходняя Беларусь у складзе Польшчы (1921 – 1939 г.):

а) тэрыторыя і насельніцтва;

б) адміністрацыйна–тэрытарыяльны падзел і органы кіравання;

в) сацыяльна–эканамічнае і палітычнае становішча насельніцтва;

г) заходнебеларуская культура ў 20 – 30-я г.

6. Культурнае жыццё ў БССР у 20 – 30-я г.

## Крыніцы

1. Идеологическая деятельность Компартии Белоруссии: В 2 ч. – Мн.: Беларусь, 1990. – Ч. 1 – С. 61 – 333.

2. Индустриализация Белорусской ССР (1926 – 1941 г.): Сборник документов и материалов. – Мн.: Беларусь, 1975. – С. 29 – 424.

3. История Беларуси в документах и материалах. – Мн.: Амалфея, 2000. – С. 398 – 500.

4. Хрестоматия по истории БССР (1917 – 1983). – Мн.: Университетское, 1984. – С. 119 – 248.

## Асноўная літаратура

1. Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 ч. / М.П.Касцюк, І.М.Ігнаценка, У.І.Вышынскі і інш. – Мн.: Беларусь, 1995. – Ч. 2. – С. 77 – 264.

2. Гісторыя Беларускай ССР: У 5 т. – Мн.: Навука і тэхніка, 1973. – Т. 3. – С. 225 – 640.

3. Гісторыя Беларускай ССР: У 5 т. – Мн.: Навука і тэхніка, 1975. – Т. 4. – С. 53 – 115.

4. Гісторыя Беларусі: Вучэбны дапаможнік: У 2 ч. / Пад рэд. Я.К.Новіка, Т.С.Марцуля. – Мн.: Універсітэцкае, 1998. – Ч. 2. – С. 108 – 216.

5. Ковкель И.И., Ярмусик Э.С. История Беларуси. С древнейших времён до нашего времени. – Мн.: Аверсэв, 1998. – С. 392 – 498.

6. Эканамічная гісторыя Беларусі. – Мн.: Экаперспектыва, 1999. – С. 232 – 318.

7. Альдебер Ж., Бендер Й., Груша И. и др. История Европы. – Мн.: Выш. шк., 1996. – С. 328 – 341.

8. История Отечества: люди, идеи, решения. Очерки истории Советского государства. – М.: Политиздат, 1991. – С. 42 – 253.

9. Страницы истории КПСС. Факты. Проблемы. Уроки. – М.: Высш. шк., 1989. – С. 212 – 346, 450 – 459.

10. Пономарёв М.В., Смирнова С.Ю. Новая и новейшая история стран Европы и Америки: Практ. пособие: В 3 ч. – М.: ВЛАДОС, 2000. – Ч. 2. – С. 180 – 184, 281 – 284; Ч. 3. – С. 68 – 81.

11. Касцюк М.П. Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі (1917 – 1994 г.) – Мн.: Экаперспектыва, 2000. – С. 59 – 212.

12. Беларусь на мяжы тысячагоддзяў. – Мн.: БелЭн, 2000. – С. 125 – 179.

## Тэмы рэфератаў

1. Палітычны бандытызм у Беларусі (1921 – 1925 г.).
2. Прычыны згортвання НЭПа і яго ўрокі.
3. Палітыка беларусізацыі ў БССР.
4. Нацыянал-дэмакратызм у Беларусі. Справа СВБ.
5. Палітычныя рэпрэсіі ў Беларусі ў канцы 20-х – пачатку 40-х г. XX ст.
6. Першыя пяцігадовыя планы ў БССР і іх выкананне.
7. Суцэльная калектывізацыя ў БССР і ліквідацыя кулацтва як класа.
8. Дзейнасць БСРГ (1925 – 1927 г.).
9. Дзейнасць ТБШ (1921 – 1938 г.).

Міжваенны час у сусветнай гісторыі ахоплівае перыяд ад першай сусветнай да пачатку другой сусветнай вайны. Гэта цікавы і супярэчлівы этап у развіцці сусветнай цывілізацыі: эканамічны ўздым (1924 – 1928 г.) і сусветны эканамічны крызіс (1929 – 1933 г.), умацаванне сацыялізму ў СССР і з’яўленне фашысцкай ідэа-

логіі ў Еўропе, далейшае развіццё буржуазнай дэмакратыі ў краінах Захаду і фарміраванне таталітарызму і г.д. Менавіта ў міжваенны час Еўропа знаёміцца з «амерыканскім вобразам жыцця», актыўна разгортваецца феміністкі рух, з'яўляюцца новыя формы духоўнага жыцця, масавая культура. Прасачыце тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага, палітычнага, ідэйнага і культурнага развіцця свету і ахарактарызуйце іх.

Вывучэнне новай эканамічнай палітыкі (1921 – 1928 г.) мэтазгодна пачаць з выяўлення яе перадумоў. Звярніце ўвагу на спалучэнне эканамічнага, сацыяльнага крызісаў у Савецкай краіне і РКП(б). Прычым яны ўскладніліся прыгранічным становішчам Беларусі (кантрабанда, бандытызм і г.д.). Раскажыце аб асноўных кірунках НЭПа, лагічна пабудаваўшы адказ па схеме: сельская гаспадарка – фінансавая сфера – прамысловасць і яе асаблівасцях у БССР. Якія вынікі мела новая эканамічная палітыка?

Новая эканамічная палітыка садзейнічала дэмакратызацыі грамадства і ажыццяўленню нацыянальна-культурнага будаўніцтва, якое атрымала назву «беларусізацыі». Гэтую палітыку падзяляюць на два этапы: неафіцыйны (1919 – 1924 г.) і афіцыйны (15 ліпеня 1924 – 1928 г.). Ахарактарызуйце кожны з іх. Што такое «каранізацыя»? Якія перашкоды меліся на шляху беларусізацыі? Калі і чаму гэтая палітыка была згорнута?

Агульнавядома, што БССР адна з першых увайшла ў склад СССР. Якія былі падыходы ў ЦК РКП(б) да праблемы Саюза? Чаму не быў прыняты план «аўталізацыі» І.В.Сталіна? Раскрыйце працэс падрыхтоўкі да ўтварэння СССР. Хто ўвайшоў у склад дэлегацыі, накіраванай у Маскву? Якія рашэнні прыняў І Усесаюзны з'езд Саветаў 30 снежня 1922 г.? Вызначце сваю пазіцыю ў дылеме: СССР – унітарная ці федэратыўная краіна. Раскажыце аб двух узбуйненнях тэрыторыі БССР у 1924 і 1926 г.

Дастаткова складаным пытаннем з'яўляецца грамадска-палітычнае жыццё Беларусі ў канцы 20-х – пачатку 40-х г. ХХ ст. На аснове падзей 3-х этапаў унутрыпартыйнай барацьбы за ўладу пакажыце пачатак фарміравання культу асобы І.В.Сталіна ў палітычнай сістэме грамадства. Дайце характарыстыку паняццю «таталітарны рэжым» (або «камандна-адміністрацыйная сістэма») і раскрыйце яго прыкметы. Што азначае «справа СВБ»? Хто такія «нацыянал-дэмакраты»?

Аналізуючы грамадска-палітычнае жыццё, неабходна разглядзець асноўныя артыкулы і характар Канстытуцыі БССР 1937 г. Чаму гісторыкі яе называюць «канстытуцыяй перамогшага сацыялізму»? Параўнайце яе з Канстытуцыяй БССР 1927 г.

Неад'емнай рысай таталітарнага палітычнага рэжыму з'яўляюцца масавыя рэпрэсіі, якія ў БССР разгарнуліся пасля рэйду камісіі партыйнага кантролю з Масквы ў 1929 г. Паспрабуйце даць іх разгорнутую характарыстыку па плану: дата, назва справы, яе вынікі. Дарэчы, па падліках многіх даследчыкаў, у БССР былі рэпрэсіраваны больш за 600 тысяч чалавек.

Вывучэнне тэмы патрабуе гістарычнага аналізу становішча Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы (II-й Рэчы Паспалітай) у 1921 – 1939 г. Раскажыце аб адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзеле і геаграфічным акрэсленні рэгіёну «Заходняя Беларусь», нацыянальным складзе насельніцтва. Асобна звярніце ўвагу на сацыяльна-эканамічную палітыку, накіраваную на пераўтварэнне Заходняй Беларусі ў аграрна-сыравінны прыдатак цэнтральных раёнаў Польшчы. Дайце ацэнку аграрным рэформам 1919 – 1925 г., параўнайце іх са сталыпінскімі пераўтварэннямі. Што такое парцэляцыя, камасацыя? Як ажыццяўлялася ліквідацыя сервітутаў? Хто такія асаднікі?

Польскія афіцыйныя колы не імкнуліся развіваць эканоміку Заходняй Беларусі не толькі па фінансавых прычынах (адсутнасць інвестыцый, агульнага эканамічнага плана, высокія ваенныя расходы і інш.), але і палітычных. Палітыка паланізацыі выклікала ўздым нацыянальна-вызваленчага руху. Дакажыце гэта на прыкладзе дзейнасці камуністычных, буржуазна-дэмакратычных і асветніцкіх беларускіх арганізацый (КПЗБ, КСМЗБ, БСРГ, БХД, ТБШ і інш.). Які ўдар па нацыянальна-вызваленчаму руху Заходняй Беларусі быў нанесены рашэннем Камінтэрна ў 1938 г.?

Завяршыце пытанне аналізам асноўных рысаў заходнебеларускай культуры. Прасачыце дзейнасць ТБШ, БСРГ, дэпутацкага клуба «Змаганне», накіраваную на развіццё асветы, Беларускага навуковага таварыства ў Вільні. Раскажыце аб творчым шляху П.Пестрака, М.Танка, В.Таўлая, М.Васілька і інш. Які след пакінулі ў заходнебеларускім мастацтве Я.Драздовіч, П.Сергіевіч, Я.Горыц?

Пажадана выкарыстанне відэафільмаў: «Палітыка беларусізацыі ў 20-я гады XX ст.», «Культура Беларусі ў канцы 20 – 30-я г. XX ст.», «Беларускай песні ўладар (Янка Купала)», карты «Европа с 1924 по 1939 г.».

## Праверачны тэст

**1.** Падбярыце правільны адказ:

А. Камісію ЦВК БССР па ажыццяўленню палітыкі беларусізацыі ўзначальваў:

а) У.М.Ігнатоўскі;
б) А.Л.Бурбіс;
в) А.І.Хацкевіч.

Б. У 1921 г. для пераходу савецкай прамысловасці на гаспадарчы разлік былі створаны:

а) карцелі;
б) кааператывы;
в) трэсты.

В. Беларускі дзяржаўны універсітэт быў адкрыты:

а) у 1919 г.;
б) у 1921 г.;
в) у 1927 г.

Г. Аўтарам першага беларускага рамана «Сокі цаліны» з'яўляўся:

а) С.Грахоўскі;
б) К.Чорны;
в) Ц.Гартны.

**2.** Згодна з якім прынцыпам створаны пералік:

А. 1928/1929 – 1932/1933; 1933 – 1937; 1938 – чэрвень 1941 г.;
Б. Б.Тарашкевіч , І.Дварчанін, С.Рак-Міхайлоўскі;
В. 11 красавіка 1927 г., 15 лютага 1937 г.;
Г. Г.Малчанаў, Б.Берман, А.Наседкін;
Д. Д.Ф.Прышчэпаў, Я.Лабаноўскі, Г.Гарэцкі.

**3.** Ці згодны вы з наступнымі сцвярджэннямі:

А. У выніку адміністрацыйна-тэрытарыяльнай рэформы 1925 г. БССР падзялялася на акругі, раёны і сельскія саветы.

Б. Падчас НЭПа ў БССР склалася аднапартыйная сістэма.

В. Каранізацыя – гэта ўцягненне ў кіраванне краінай толькі беларусаў.

Г. За гады індустрыялізацыі ў БССР было пабудавана і рэканструявана 1863 прадпрыемствы.

Д. Галоўнай формай непрымання сялянамі калектывізацыі ў Беларусі была іх узброеная барацьба.

**4.** Выявіце недакладнасці ў наступных сцвярджэннях:

А. Харчпадатак, кааперацыя, арэнда, камуны, крызіс збыту.

Б. У.М.Ігнатоўскі, З.Ф.Жылуновіч, А.Л.Бурбіс, К.В.Гей, А.В.Баліцкі, П.В.Ільючонак.

В. М.Ф.Гікала, П.К.Панамарэнка, А.Р.Чарвякоў, М.М.Галадзед.

**5.** Прадоўжыце пералік у наступных сцвярджэннях:

А. У склад СССР у 1922 г. уваходзілі: ...

Б. Асноўнымі формамі кааперацыі ў савецкай вёсцы з'яўляліся: ...

В. Нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі быў прадстаўлены наступнымі партыямі і арганізацыямі ...

**6.** Падбярыце да кожнай падзеі адпаведную дату.

Падзеі:

А. Х з'езд РКП(б).

Б. «Самаліквідацыя» эсэраўскага руху.

В. Дэкрэт аб вольным выбары форм землекарыстання.

Г. Самароспуск Рады БНР у Берліне.

Д. Справа СВБ.

Е. Прыняцце Прыкладнага Статута сельскагаспадарчай арцелі.

Ж. Адкрыццё Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі.

Даты:

а) 1921 г.;

б) 1922 г.;

в) 1924 г.;

г) 1925 г.;

д) 1931 г.;

е) 1932 г.;

ж) 1936 г.

**7.** Пра каго вядзецца гаворка:

«Адзін са стваральнікаў і старшыня БСГ, кіраўнік ТБШ, акадэмік, літаратар, аўтар першай «Беларускай граматыкі для школ». Ён двойчы арыштоўваўся польскімі ўладамі. Ахвяра сталінскіх рэпрэсій: растраляны ў 1938 г. як «польскі шпіён»?

**8.** Запоўніце пропускі ў наступных сказах:

А. У 1924 г. тэрыторыя БССР павялічылася на ... паветаў ..., ..., ... губерняў, а ў 1926 г. БССР былі перададзены ... і ... паветы.

Б. У ... годзе ў Ленінградзе была створана кінастудыя мастацкіх фільмаў «Савецкая Беларусь».

В. Стваральнікам першага беларускага мастацкага фільма ... з'яўляецца кінарэжысёр ...

Г. Драматург ... стварыў першую п'есу на беларускай мове ...

Д. Аўтарам Дзяржаўнага гімна БССР з'яўляецца кампазітар ...

***Адказы***

1. А – в; Б – в; В – б; Г – в.

2. А – першая, другая і трэцяя пяцігодкі; Б – кіраўнікі нацыянальна-вызваленчага руху Заходняй Беларусі; В – даты прыняцця Канстытуцый БССР; Г – наркамы НКУС БССР; Д – прадстаўнікі «правага ўхілу» ў БССР.

3. А – так; Б – так; В – не; Г – так; Д – не.

4. А – камуны; Б – К.В.Гей; В – П.К.Панамарэнка.

5. А – РСФСР, ЗСФСР, БССР, УССР; Б – ТАЗы, камуны, арцелі; В – КПЗБ, КСМЗБ, БСРГ, ТБШ, БХД, Віленскі БНК.

6. А – а; Б – в; В – б; Г – г; Д – д; Е – ж; Ж – е.

7. Б. А.Тарашкевіч.

8. А – 16 паветаў Віцебскай, Гомельскай і Смаленскай губерняў; Гомельскі і Рэчыцкі; Б – 1928 г.; В – «Лясная быль»; Ю.В.Тарыч; Г – Е.А.Міровіч; «Машэка»; Д – Н.Ф.Сакалоўскі.

## ТЭМА 10
## БЕЛАРУСЬ У ГАДЫ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

### План

1. Абвастрэнне міжнародных адносін у канцы 30-х г. XX ст. Пачатак другой сусветнай вайны.
2. Уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР.
3. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны. Абарончыя баі на тэрыторыі Беларусі летам 1941 г.
4. Нямецка-фашысцкі акупацыйны рэжым у Беларусі.
5. Падпольны і партызанскі рух на Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.
6. Карэнны пералом у ходзе вайны. Вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.
7. Перамога над Германіяй. Заканчэнне другой сусветнай вайны.

### Крыніцы

1. Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941-1945: Энцыклапедыя. – Мн.: БелСЭ, 1990. – 680 с.

2. Белорусские остарбайтеры. Угон населения Беларуси на принудительные работы в Германию: Документы и материалы: В 2 кн. – Мн.: 1996.

3. В июне 1941 г.: Воспоминания участников первых боёв на Гродненщине. – Гродно: 1997. – 287с.

4. История Беларуси в документах и материалах / Авт.-сост. И.Н.Кузнецов, В.Г.Мазец. – Мн.: Амалфея, 2000. – С. 502 – 584.

5. Комсомол Белоруссии в Великой Отечественной войне: Документы и материалы. – Мн.: Беларусь, 1988. – 496 с.

6. Партизанские формирования Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 – июль 1944 г.) / [Манаенков А.Л., Горелик Е.Т., Маркова А.Ф. и др.]. – Мн.: Беларусь, 1983. – 765 с.

7. Подпольные партийные органы Компартии Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (1941 – 1944). – Мн.: Беларусь, 1975. – 272 с.

8. Подпольные комсомольские органы Белоруссии в годы Великой Отечественной войны ( 1941 – 1944). – Мн.: Беларусь, 1976. – 320 с.

9. Хрестоматия по истории БССР (1917 – 1983). – Мн.: Университетское, 1984. – С. 248 – 307.

## Асноўная літаратура

1. Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 ч. / М.П.Касцюк, І.М.Ігнаценка, У.І.Вышынскі і інш. – Мн.: Беларусь, 1995. – Ч. 2. – С. 265 – 323.

2. Гісторыя Беларускай ССР: У 5 т. / Пад рэд. І.С.Краўчанкі (гал. рэд.). – Мн.: Навука і тэхніка, 1975. – Т. 4. – С. 84 – 543.

3. Гісторыя Беларусі: Вучэбны дапаможнік: У 2 ч. /Пад рэд. Я.К.Новіка, Т.С.Марцуля. – Мн.: Універсітэцкае, 1998. – Ч. 2. – С. 217 – 278.

4. Ковкель И.И., Ярмусик Э.С. История Беларуси. С древнейших времён до нашего времени. – Мн.: Аверсэв, 1998. – С. 498 – 542.

5. Эканамічная гісторыя Беларусі. – Мн.: Экаперспектыва, 1999. – С. 319 – 335.

6. Альдебер Ж., Бендер Й., Груша И. и др. История Европы. – Мн.: Выш. шк., 1996. – С. 342 – 347.

7. Страницы истории советского общества: Факты, проблемы, люди. – М.: Политиздат, 1989. – С. 254 – 313.

8. Пономарёв М.В., Смирнова С.Ю. Новая и новейшая история стран Европы и Америки: Практ. пособие: В 3 ч. – М.: ВЛАДОС, 2000. – Ч. 3. – С. 82 – 86, 115 – 119.

9. Беларусь на мяжы тысячагоддзяў. – Мн.: БелЭн, 2000. – С. 180 – 190.

## Тэмы рэфератаў

1. Заходняя асабовая ваенная акруга напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны.
2. Рэпрэсіі супраць камандавання Заходняга фронту (чэрвень – ліпень 1941 г.).
3. Дзейнасць АК і АУН на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.
4. Беларускія калабарацыяністы.
5. Аперацыя «Багратыён».

Другая сусветная вайна (1939 – 1945 г.) – адна з самых значных падзей сусветнай гісторыі, пераломны рубеж у гісторыі цывілізацыі. Яе аналіз неабходна пачаць з разгляду міжнароднага становішча ў канцы 30-х г. Гэта дазволіць вызначыць прычыны вайны. Раскажыце аб пашырэнні фашызму ў Еўропе. Пакажыце на прыкладах парушэнне Германіяй умоў Версальскага міру. Чаму не склалася сістэма калектыўнай бяспекі ў Еўропе?» Што такое «палітыка ўміратварэння агрэсара»? Хто яе праводзіў? Чаму былі спынены перамовы ваенных місій Англіі, Францыі і Савецкага Саюза ў Маскве? Прааналізуйце пакт аб ненападзе ад 23 жніўня 1939 г. і сакрэтны пратакол да яго.

Другая сусветная вайна пачалася 1 верасня 1939 г. з нападу Германіі на Польшчу. Першы этап вайны ахоплівае перыяд да 22 чэрвеня 1941 г. і ўключае «сідзячую» вайну ў Еўропе, захоп Германіяй Даніі, Нарвегіі, часткі Францыі, стварэнне плацдарма для нападу на СССР у Паўднёва-Усходняй Еўропе. Ахарактарызуйце гэтыя падзеі і зрабіце выснову.

У верасні-лістападзе 1939 г. адбылося ўз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР. Раскажыце аб паходзе Чырвонай Арміі, адносінах да яе мясцовага насельніцтва, фарміраванні новых органаў улады, Народным сходзе ў Беластоку. Якія палітычныя, сацыяльна-эканамічныя і культурныя пераўтварэнні адбыліся ў Заходняй Беларусі ў 1940 – 1-й палове 1941 г.? Параўнайце стан заходніх абласцей БССР з перыядам 1921 – 1939 г. Вызначце ўласную пазіцыю па праблеме ўваходжання Заходняй Беларусі ў склад БССР і СССР: гэта было далучэнне ці ўз'яднанне?

Вялікая Айчынная вайна (22.06.1941 – 09.05.1945) з'яўляецца складальнай часткай другой сусветнай вайны. Прааналізуйце суадносіны сіл паміж Германіяй і Савецкім Саюзам, звярнуўшы ўвагу на ваенна-стратэгічны патэнцыял Заходняй асабовай ваеннай акругі. Ці можна лічыць напад фашысцкай Германіі нечаканым і нечаспадзяваным?

Раскажыце аб прыгранічных баях, «беластоцкім» і «навагрудскім» катлах акружэння савецкіх войскаў, абароне Мінска, Магілёва, Гомеля. Якое значэнне мела бітва за Магілёў? Ці апраўдана быў абвінавачаны ў здрадзе Радзіме генерал Д.Паўлаў? Якія меры прынялі Камуністычная партыя і Савецкі ўрад па пераводу эканомікі краіны на ваенны лад, мабілізацыі сіл на адпор ворагу? Напрыканцы адказу вызначце прычыны першапачатковых няўдач Чырвонай Арміі.

З канца жніўня 1941 г. на тэрыторыі Беларусі ўсталёўваецца жорсткі нямецка-фашысцкі акупацыйны рэжым, які атрымаў назву «новы парадак». Прасачыце новы адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел, рэжым генацыду і тэрору, эканамічную палітыку акупантаў. Дайце характарыстыку беларускіх калабарацыяністаў, выкажыце свае адносіны да іх дзейнасці.

Важным пытаннем тэмы з'яўляецца падпольны і партызанскі рух на акупаванай тэрыторыі Беларусі. Пажадана даць ацэнку першапачаткова падпольнаму, а затым партызанскаму рухам. Прычым мэта-згодна выдзяляць асаблівасці народнага супраціўлення захопнікам.

Вызваленне тэрыторыі Беларусі звязана з карэнным пераломам у ходзе Вялікай Айчыннай вайны. Савецкая і айчынная сучасная гістарыяграфія суадносяць яго са Сталінградскай бітвай, якая паклала пачатак пераходу стратэгічнай ініцыятывы да Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандуючага, і бітвай на Курскай дузе, якая завяршыла гэты працэс. Пакажыце гістарычнае значэнне акружэння і разгрому нямецка-фашысцкіх войскаў пад Сталінградам. Чаму праваліўся фашысцкі план «Цытадэль» на Курскай дузе?

Аперацыя «Багратыён» – адна з самых буйных ваенна-стратэгічных аперацый Чырвонай Арміі ў 1944 г. Яе непасрэднай падрыхтоўкай кіраваў Г.Жукаў. Што такое «беларускі балкон»? Які быў стратэгічны намер савецкага камандавання? Якія былі  суадносіны сіл? Раскажыце аб ходзе аперацыі, яе двух этапах. У чым гістарычнае значэнне аперацыі «Багратыён»?

Завяршальны этап другой сусветнай вайны звязаны з разгромам фашысцкай Германіі (Вісла-Одэрская, Усходне-Пруская, Берлінская і Пражская аперацыі), Патсдамскай канферэнцыяй кіраўнікоў краін антыгітлераўскай кааліцыі, разгромам мілітарысцкай Японіі. Ахарактарызуйце гэтыя падзеі. У заканчэнні пакажыце страты Беларусі ў вайне, удзел беларусаў у ваенных дзеяннях, уклад беларускага народа ў разгром фашызму.

Найбольш поўна можна раскрыць дадзеную тэму, спалучыўшы выкарыстанне прапанаваных крыніц і літаратуры з відэафільмамі: «За-

ложники обороны (первые дни Великой Отечественной войны)», «Абарона Брэсцкай крэпасці», «Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны», «Пачатак Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Беларусі», «Вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў»; з дыяпазітывамі «Великая Отечественная война 1941–1945 г.» і фотаматэрыяламі па гісторыі другой сусветнай вайны; картамі: «Вторая мировая война 1939–1945 г.», «Великая Отечественная война 1941–1945 г.», «Освобождение Белоруссии», тэматычнымі экскурсіямі.

## Праверачны тэст

**1.** Падбярыце правільны адказ:

А. Беларускім штабам партызанскага руху ў гады Вялікай Айчыннай вайны кіраваў:

а) П.Панамарэнка;
б) М.Зімянін;
в) М.Калінін;
г) П.Машэраў.

Б. Першымі героямі Савецкага Саюза з удзельнікаў партызанскага руху сталі:

а) Ф.Паўлоўскі;
б) М.Шмыроў;
в) Б.Казлоў;
г) Ц.Бумажкоў.

В. Першым Беларускім фронтам у час аперацыі «Багратыён» камандаваў:

а) Г.Жукаў;
б) К.Ракасоўскі;
в) Г.Захараў;
г) А.Чарняхоўскі.

**2.** Згодна з якім прынцыпам створаны пералік:

А. І.Кавалёў, І.Матусевіч, І.Казінец.

Б. 29 чэрвеня 1941 г., 18 ліпеня 1941 г., 30 мая 1942 г.

В. Пачатак жніўня – сярэдзіна верасня 1943 г., сярэдзіна верасня – пачатак лістапада 1943 г.; 20 чэрвеня–ліпень 1944 г.

Г. ЗША, СССР, Кітай, Вялікабрытанія, Аўстралія, Францыя, Галандыя, Новая Зеландыя, Канада.

**3.** Ці згодны вы з наступнымі сцвярджэннямі:

А. У 1942 г. партызаны Беларусі паспяхова правялі аперацыі «Рэйкавая вайна» і «Канцэрт».

Б. Польскі рух Супраціўлення, які разгарнуўся ў Літве і Заходняй Беларусі ў час другой сусветнай вайны, атрымаў назву асаднiцтва.

В. Генеральны план «Ост» прадугледжваў каланізацыю Беларусі, германізацыю і знішчэнне яе народа.

Г. Вызваленне Беларусі пачалося восенню 1943 г. пасля перамогі Чырвонай арміі пад Курскам.

Д. 28 ліпеня 1944 г. завяршылася аперацыя «Багратыён».

Е. 1 студзеня 1942 г. у Вашынгтоне прадстаўнікі 26 дзяржаў падпісалі Дэкларацыю Аб’яднаных Нацый.

**4.** Выявіце недакладнасці ў наступных сцвярджэннях:

А. «Тайфун», «Цытадэль», «Аверлорд», «Блаў».

Б. В.Кубэ, А.Розэнберг, фон Готберг.

В. І.Зубачоў, Я.Фамін, Д.Паўлаў, А.Качанаў.

**5.** Прадоўжыце пералік у наступных сцвярджэннях:

А. Абарончыя баі Чырвонай Арміі на тэрыторыі Беларусі летам 1941 г. адбыліся пад ...

Б. Арганізацыі беларускіх калабарантаў: ...

В. Найбольш буйныя гета на тэрыторыі Беларусі знаходзіліся ў ...

Г. Самы вялікі партызанскі край знаходзіўся ў чатырохкутніку: ...

**6.** Падбярыце да кожнай падзеі адпаведную дату.

Падзеі:

А. Пачатак аперацыі «Багратыён».

Б. Утварэнне Цэнтральнага штаба партызанскага руху.

В. Разрыў адносін паміж савецкім і польскім лонданскім урадамі.

Г. Выхад першага нумара газеты «Звязда» – друкаванага органа Мінскага падпольнага гаркома КП(б)Б.

Д. Першае выкарыстанне рэактыўных мінамётаў («кацюш») у бітве пад Оршай.

Даты :

а) 18 мая 1942 г.;

б) 23 чэрвеня 1944 г.;

в) 30 мая 1942 г.;

г) 14 ліпеня 1941 г.;

д) вясна 1943 г.

**7.** Размясціце ў храналагічнай паслядоўнасці падзеі аперацыі «Багратыён»:

а) распрацоўка генеральным штабам Савецкай Арміі плана аперацыі;

б) вызваленне Гомеля і Мазыра ў ходзе восенска-зімовага наступлення савецкіх войск 1943 г.;

в) вызваленне Брэста ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў;

г) партызанскі парад у Мінску;

д) пачатак наступальнай аперацыі «Багратыён»;

е) вызваленне Гродна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў;

ж) утварэнне «Мінскага катла»;

з) утварэнне «Аршанскага катла»;

і) вызваленне Мінска;

к) утварэнне «Віцебскага катла».

**8.** Пра каго вядзецца гаворка:

«Удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны ў Іспаніі, работнік Пінскага абкома КП(б)Б, стваральнік партызанскага атрада, які потым пераўтварыўся ў партызанскую брыгаду. Ужо ў час баявых дзеянняў атрымаў воінскае званне генерал-маёра. У пасляваенны час – міністр лясной гаспадаркі БССР»?

**9.** Запоўніце пропускі ў наступных сказах:

А. Удар групы армій «Цэнтр» прынялі на сябе арміі ...

Б. Акупацыйны рэжым нямецка-фашысцкіх захопнікаў атрымаў назву ... .

В. Партыю беларускіх фашыстаў узначальваў ...

Г. Трэцяе месца па колькасці знішчаных чалавек у сістэме лагераў фашысцкай Германіі займаў ...

Д. У беларускім падполлі змагаліся ... тысяч чалавек, а ў складзе ... партызанскіх атрадаў налічвалася ... тысяч чалавек.

***Адказы***

1. А – в; Б – а, г; В – б.
2. А – кіраўнікі Мінскага падполля;
   Б – асноўныя дырэктывы па арганізацыі партызанскага руху;
   В – этапы «рэйкавай» вайны;
   Г – краіны, прадстаўнікі якіх падпісалі акт аб капітуляцыі Японіі.
3. А – не; Б – не; В – так; Г – так; Д – не; Е – так.
4. А – «Аверлорд»; Б – А.Розэнберг; В – Д.Паўлаў.
5. А – Брэстам, Мінскам, Барысавам, Оршай, Магілёвам, Гомелем;

Б – Беларуская краёвая абарона, Беларуская народная самапомач, Саюз беларускай моладзі, Беларуская цэнтральная рада;

В – Мінску, Брэсце, Баранавічах, Гродне, Гомелі; Г – Олеўск – Оўруч – Мазыр – Тураў.

6. А – б; Б – в; В – д; Г – а; Д – г.
7. б, а, д, к, з, ж, і, г, е, в.
8. В.З.Корж.
9. А – ЗахАВА; Б – «новы парадак»; В – Ф.Акінчыц; Г – Трасцянец; Д – 70, 1255, 374.

ТЭМА 11

## БЕЛАРУСЬ ВА ЎМОВАХ СУПРАЦЬСТАЯННЯ СУСВЕТНЫХ ЗВЫШКРАІН (2-я ПАЛОВА 40-х – 1-я ПАЛОВА 80-х г. XX ст.)

### План

1. Выхад Беларускай ССР на міжнародную арэну. «Халодная вайна» паміж заходнім і сацыялістычным лагерамі.
2. Асаблівасці палітычнага і сацыяльна-эканамічнага развіцця краін Захаду і Азіі ў 50 – 80-я г. XX ст.
3. Аднаўленне і развіццё народнай гаспадаркі і культуры Беларусі (жнівень 1944 г. – 1-я палова 50-х г.).
4. Сацыяльна-эканамічнае развіццё БССР у другой палове 50-х – 1-й палове 80-х г.
5. Грамадска-палітычнае жыццё БССР у 2-й палове 40-х – 1-й палове 80-х г.
6. Культура Беларусі ў 2-й палове 50-х – 1-й палове 80-х г.

### Крыніцы

1. История Беларуси в документах и материалах / Авт.–сост. И.Н.Кузнецов, В.Г.Мазец. – Мн.: Амалфея, 2000. – С. 585 – 625.
2. Хрестоматия по истории БССР (1917 – 1983). – Мн.: Университетское, 1984. – С. 307 – 422.

### Асноўная літаратура

1. Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 ч. /М.П.Касцюк, І.М.Ігнаценка, У.І.Вышынскі і інш. – Мн.: Беларусь, 1995. – Ч. 2. – С. 324 – 419.
2. Гісторыя Беларускай ССР: У 5 т. / Пад рэд. І.С.Краўчанкі (гал. рэд.) – Мн.: Навука і тэхніка, 1975. – Т. 4. – С. 544 – 573.
3. Гісторыя Беларускай ССР: У 5 т. / Пад рэд. А.А.Філімонава (гал. рэд.) – Мн.: Навука і тэхніка, 1975. – Т. 5. – С. 11 – 719.

4. Гісторыя Беларусі: Вучэбны дапаможнік: У 2 ч. /Пад рэд. Я.К.Новіка, Г.С.Марцуля. – Мн.: Універсітэцкае, 1998. – Ч. 2. – С. 280 – 369.

5. Ковкель И.И., Ярмусик Э.С. История Беларуси. С древнейших времён до нашего времени. – Мн.: Аверсэв, 1998. – С. 543 – 569.

6. Эканамічная гісторыя Беларусі. – Мн.: Экаперспектыва, 1999. – С. 335 – 400.

7. Альдебер Ж., Бендер Й., Груша И. и др. История Европы. – Мн.: Выш. шк., 1996. – С. 351 – 375.

8. Страницы истории советского общества: Факты, проблемы, люди. – М.: Политиздат, 1989. – С. 351 – 374.

9. Актуальныя пытанні гісторыі БССР (сав. перыяд) / Склад. В.М.Фамін і інш.: Пад рэд. У.Сідарцова. – Мн.: Нар. асвета, 1991. – С. 121 – 149.

10. Пономарёв М.В., Смирнова С.Ю. Новая и новейшая история стран Европы и Америки: Практ. пособие: В 3 ч. – М.: ВЛАДОС, 2000. – Ч. 3. – С. 87 – 107, 263 – 277, 374 – 379.

11. История: Учебное пособие для вузов. – Ростов-на-Дону: Феникс, 2000. – С. 574 – 597.

12. Беларусь на мяжы тысячагоддзяў. – Мн.: БелЭн, 2000. – С. 191 – 203.

## Тэмы рэфератаў

1. Чацвёрты пяцігадовы план і яго выкананне ў БССР.
2. Эканамічныя рэформы 1956 і 1965 г. і іх вынікі.
3. П.М.Машэраў: палітычны партрэт.
4. Знешнепалітычная дзейнасць БССР у ААН.
5. Развіццё культуры Беларусі ў сярэдзіне 40-х – сярэдзіне 80-х г. XX ст.

Перыяд з 2-й паловы 40-х г. да сярэдзіны 80-х г. XX ст. азнаменаваны эканамічным ростам, умацаваннем сацыяльнай сферы, далейшым развіццём культуры. З другога боку, у гэты перыяд абвастрыліся супярэчнасці, найперш у палітычнай сістэме грамадства. Эканамічная мадэль, якая сфарміравалася ў 20 – 30-я гады, страціла эфектыўнасць і патрабавала рэфармавання.

На завяршаючым этапе другой сусветнай вайны назіраецца выхад Беларускай ССР на міжнародную арэну ў якасці краіны-заснавальніцы ААН. Чаму заходнія краіны згадзіліся на прадастаўленне самастойнага голасу для БССР? Хто прадстаўляў нашу рэспубліку ў ААН? Дайце характарыстыку беларуска-польскіх пагад-

ненняў 1944 – 1945 г., раскажыце аб удзеле БССР у рабоце Парыжскай мірнай канферэнцыі. Звярніце ўвагу на дзейнасць Амерыканскай адміністрацыі дапамогі пацярпелым ад вайны (ЮНРРА) у Беларусі і ліквідацыю яе місіі ў Мінску з прычыны распачатай «халоднай вайны».

У вывучаемы перыяд назіраецца супадзенне і разыходжанне сацыяльна-эканамічнага, палітычнага развіцця савецкага грамадства з астатнім светам. Мэтазгодна выдзеліць асноўныя тэндэнцыі гістарычнага шляху краін Захаду і Азіі ў пасляваеннае трыццацігоддзе. Раскажыце аб дэмакратызацыі палітычнага жыцця краін Заходняй цывілізацыі, праблемах грамадскага жыцця. Што ўяўляла эканамічная мадэль «масавай вытворчасці і масавага спажывання»? Якую ролю адыгрывала кейнсіянства? Пакажыце сутнасць «эканамічнага цуда» (германскага, італьянскага, японскага).

Аднаўленчы перыяд у гісторыі Беларусі ахоплівае тэрмін са жніўня 1944 г. па 1955 г. Умоўна яго можна падзяліць на тры этапы: 1944 – 1945 г. – аднаўленчыя работы на завяршаючым этапе вайны, 1946 – 1950 г. – IV пяцігадовы план, 1951 – 1955 г. – V пяцігодка. Раскрыйце змест кожнага з іх. Дакажыце, што галоўная ўвага надавалася развіццю прамысловасці тавараў групы «А». Звярніце ўвагу на масавую калектывізацыю сельскай гаспадаркі ў заходніх абласцях БССР (1949 – 1952 г.) і параўнайце яе з адпаведным працэсам канца 20-х – 30-х гадоў.

Сацыяльна-эканамічнае развіццё рэспублікі з сярэдзіны 50-х гадоў характарызуецца ўкараненнем дасягненняў НТР у індустрыяльную вытворчасць, якое ажыццяўлялася ў форме механізацыі, аўтаматызацыі і канвеерызацыі вытворчасці. Раскрыйце гэты працэс. Якое значэнне мела рэформа кіравання народнай гаспадаркай 1957 г.? Чаму кіраўніцтва краіны прыняло 7-гадовы план (1959 – 1965 г.)? Як развівалася прамысловая вытворчасць БССР у гэты перыяд? Чаму ўзнікла патрэба ў правядзенні эканамічнай рэформы?

Неабходна зрабіць аналіз стану аграрнай вытворчасці. Як вядома, карэнны паварот да праблем вёскі і сялянства зрабіў М.С.Хрушчоў на Вераснёўскім (1953 г.) Пленуме ЦК КПСС. Якія на ім былі прыняты рашэнні? Сельская гаспадарка развівалася экстэнсіўна, аб чым сведчыць асваенне цалінных і залежных зямель. Вызначце станоўчыя і адмоўныя рысы гэтай падзеі. Раскажыце аб умацненні матэрыяльна-тэхнічнай базы сельскай гаспадаркі ў 2-й палове 50-х гадоў. Як праводзілася рэарганізацыя МТС і чаму?

Звярніце ўвагу на нестабільнасць аграрнай палітыкі, адносіны М.С.Хрушчова да прысядзібных гаспадарак, пасеваў кукурузы і г.д. Назавіце прычыны харчовых цяжкасцяў у пачатку 60-х гадоў.

Цікавым гістарычным вопытам з'яўляецца эканамічная рэформа 1965 г. Раскажыце аб ёй. Ці лічыце вы яе ўдалай? Чаму VIII пяцігодку (1966 – 1970 г.) эканамісты лічаць «залатой»? Прааналізуйце працэс інтэграцыі навукі і вытворчасці ў 70-я г. Як узмацніўся вытворчы патэнцыял рэспублікі за IX – XI пяцігодкі?

Дакажыце, што аграрная вытворчасць у рэспубліцы захоўвала рэнтабельны характар. Пакажыце яе поспехі і праблемы. Ці згодны вы з меркаваннем, што эканоміка БССР развівалася экстэнсіўна? Адказ абаснуйце.

Грамадска-палітычнае жыццё БССР можна падзяліць на тры этапы: 1944 – 1953 г. – захаванне таталітарнага палітычнага рэжыму, 1953 – 1964 г. – «хрушчоўская адліга», 1964 – 1985 г. – «застой». Прасачыце асноўныя падзеі ў кожным з іх. Вызначце асаблівасці. Цікавасць выклікае гістарычная постаць П.М.Машэрава. Складзіце яго палітычны партрэт.

Дакажыце, што духоўнае жыццё беларусаў у 2-й палове 50-х – 1-й палове 80-х г. насіла супярэчлівы характар. Як развівалася народная асвета рэспублікі? Раскрыйце асноўную тэматыку і жанры беларускай літаратуры. Назавіце здабыткі айчыннага мастацтва.

Мэтазгодна выкарыстанне відэафільма «Грамадска-палітычнае жыццё БССР ў сярэдзіне 40 – 50-х г. XX ст.», картаў «Народное хозяйство СССР в 1945 – 1958 г.», «Народное хозяйство СССР в 1959 – 1975 г.», «Культурное строительство за годы Советской власти».

## Праверачны тэст

**1.** Падбярыце правільны адказ:

А. План Маршала з'яўляўся праграмай:

а) аднаўлення і развіцця эканомікі еўрапейскіх краін;
б) развіцця заходнееўрапейскай інтэграцыі;
в) стварэння адзінага еўрапейскага рынку.

Б. На Парыжскай мірнай канферэнцыі беларускую дэлегацыю ўзначальваў:

а) П.К.Панамарэнка;
б) К.В.Кісялёў;
в) І.Я.Палякоў.

В. У 1962 г. удзельная вага прамысловасці БССР у валавым грамадскім прадукце складала:

а) 46 %; б) 50 %; в) 52 %; г) 57 %.

Г. Харчовая праграма прадугледжвала:

а) хімізацыю і меліярацыю сельскай гаспадаркі;

б) стварэнне буйных жывёлагадоўчых комплексаў;
в) арганізацыю АПК.

**2.** Згодна з якім прынцыпам створаны пералік:

А. П.К.Панамарэнка, М.І.Гусараў, М.С.Патолічаў, К.Т.Мазураў, П.М.Машэраў, Ц.Я.Кісялёў, М.М.Слюнькоў.

Б. Комплексная аўтаматызацыя, хімізацыя, спецыялізацыя, канцэнтрацыя, кааператыванне, камбінаванне прадпрыемстваў.

В. Н.Я.Наталевіч, В.І.Казлоў, С.В.Прытыцкі, Ф.А.Сурганаў, І.Я.Палякоў, Г.С.Таразевіч.

**3.** Ці згодны вы з наступнымі сцвярджэннямі:

А. Міжнародная дзейнасць БССР у 2-й палове 40-х – 1-й палове 80-х г. ХХ ст. насіла абмежаваны характар.

Б. Эканамічная рэформа 1965 г. перавяла народную гаспадарку на інтэнсіўны шлях развіцця.

В. У 70-я г. ХХ ст. у прамысловасці БССР назіралася раўнамернае развіццё галін групы «А» (вытворчасць сродкаў вытворчасці) і групы «Б» (вытворчасць прадметаў спажывання).

Г. Будаўнічая сфера рэспублікі развівалася пераважна за кошт фізічнага росту яе матэрыяльна-тэхнічнай базы і павелічэння колькасці будаўнічых рабочых.

Д. Ліквідацыя ў 1958 г. МТС садзейнічала ўмацаванню матэрыяльна-тэхнічнай базы калгасаў і саўгасаў.

Е. Выбары ў Саветы дэпутатаў працоўных насілі дэмакратычны характар і праводзіліся на альтэрнатыўнай аснове.

Ж. Сацыялістычнае спаборніцтва давала магчымасць інтэнсіфікаваць працу рабочых і канцэнтраваць іх намаганні на выкананне планаў і вытворчых заданняў.

**4.** Выявіце недакладнасці ў наступных сцвярджэннях:

А. ЮНЕСКА, МАП, МСЭ, НАТА, МАГАТЭ.

Б. А.Філіпаў, К.Гуцін, Н.Раманоўская, І.Бельскі, І.Кітаеў.

В. М.В.Бірыла, П.П.Шуба, П.В.Стэцка, К.І.Шабуня, М.С.Васілеўскі.

Г. «Жураўліны крык», «Альпійская балада», «Абеліск», «Вайна пад стрэхамі».

**5.** Прадоўжыце пералік у наступных сцвярджэннях:

А. Індустрыяльны воблік рэспублікі вызначаюць наступныя галіны вытворчасці: ...

Б. Галоўнымі відамі транспарту ў Беларусі з'яўляюцца ...

В. Гістарычна-рэвалюцыйную тэму ў выяўленчым мастацтве распрацоўвалі ...

Г. Дасягненнем беларускай скульптуры з'явіліся работы ...

**6.** Падбярыце да кожнай падзеі адпаведную дату.

Падзеі:

А. Першыя пасляваенныя выбары ў Вярхоўны Савет БССР.

Б. Пуск 1-й чаргі Мінскага метрапалітэна.

В. XX з'езд КПСС.

Г. Дагавор паміж СССР і Польшчай аб змене савецка-польскай дзяржаўнай мяжы.

Д. Увод савецкіх войск у Афганістан.

Е. Замена галіновага кіраўніцтва эканомікай тэрытарыяльна-галіновым.

Ж. Створаны Беларускі рэспубліканскі савет прафсаюзаў.

З. Прыняцце новай (4-й) Канстытуцыі БССР.

Даты:

а) 1946 г.;

б) 1947 г.;

в) 1948 г.;

г) 1956 г.;

д) 1957 г.;

е) 1978 г.;

ж) 1979 г.;

з) 1984 г.

**7.** Пра каго ідзе гаворка:

«Яго выбранне на пасаду Першага сакратара ЦК КПБ не ўваходзіла ў планы вышэйшага кіраўніцтва ЦК КПСС, але партыйны актыў Беларусі не падтрымаў кандыдатуру «зверху» і прагаласаваў за вядомага ім партыйнага дзеяча, для якога былі характэрны такія якасці, як даступнасць, прастата, дэмакратызм, увага да людзей. Вялікай павагай ён карыстаўся сярод камуністаў як удзельнік партызанскай барацьбы і як Герой Савецкага Саюза»?

**8.** Запоўніце пропускі ў наступных сказах:

А. Перыяд глабальнага саперніцтва СССР і ЗША, у якое былі ўцягнуты практычна ўсе дзяржавы, гісторыкі называюць ...

Б. Перыяд гісторыі савецкага грамадства з сярэдзіны 60-х да 1-й паловы 80-х г. XX ст. лічыцца эпохай «…».

*Адказы*

1. А – а; Б – б; В – в; Г – в.

2. А – першыя сакратары ЦК КПБ; Б – характарыстыка новага этапа развіцця эканомікі рэспублікі ва ўмовах НТР; В – старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР.

3. А – так; Б – не; В – не; Г – так; Д – так; Е – не; Ж – так.

4. А – НАТА; Б – І.Бельскі; В – К.І.Шабуня; Г – «Вайна пад стрэхамі».

5. А – энергетыка, машынабудаванне і прыборабудаванне, хімія і нафтахімія, электроніка і радыёэлектроніка, вытворчасць мінеральных угнаенняў і сінтэтычных валокнаў;

Б – чыгуначны, аўтамабільны, водны і паветраны;

В – М.Савіцкі, А.Шыбнёў, Н.Воранаў, Ф.Дарашэвіч, К.Касмачоў, Я.Зайцаў, Р.Кудрэвіч, А.Гугель, В.Цвірка;

Г – З.Азгура, А.Грубэ, А.Бембеля, А.Глебава, В.Цыгаля, С.Селіханава.

6. А – б; Б – з; В – г; Г – а; Д – ж; Ж – в; З – е.

7. П.М.Машэраў.

8. А – «халоднай вайной»;
Б – застою.

ТЭМА 12

# БЕЛАРУСЬ У ПЕРЫЯД КРЫЗІСУ І РАСПАДУ СССР ЯК УНІТАРНАЙ ДЗЯРЖАВЫ ( 1985 – 1991 г. )

## План

1. Палітыка «перабудовы» ў СССР. Дэмакратычныя перамены ў краінах Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропы.
2. Дэмакратызацыя грамадска-палітычнага жыцця ў БССР.
3. Абвастрэнне сацыяльна-эканамічнага і палітычнага крызісу ў канцы 80-х г. Прычыны крызісу перабудовы.
4. Беларусь на міжнароднай арэне:
   а) кампетэнцыя саюзных рэспублік у галіне знешняй палітыкі;
   б) прадстаўніцтва БССР у ААН;
   в) статус БССР у садружнасці краін свету;
   г) гандлёва-эканамічныя і культурныя сувязі БССР.
5. Пачатак нацыянальна-культурнага адраджэння.

## Крыніцы

1. Горбачёв М.С. Октябрь и перестройка: революция продолжается. 1917 – 1987 г. – М.: Политиздат, 1987. – 62 с.

2. Горбачёв М.С. Революционной перестройке – идеологию обновления. – М.: Политиздат, 1988. – 48 с.

3. Дэкларацыя Вярхоўнага Савета БССР аб дзяржаўным суверэнітэце БССР 27 ліпеня 1990 г. // Звязда. – 1990. – 29 ліпеня.

4. Закон БССР «О языках в Белорусской ССР» // Советская Белоруссия. – 1990. – 13 февраля.

5. История Беларуси в документах и материалах / Авт.-сост. И.Н.Кузнецов, В.Г.Мазец. – Мн.:Амалфея, 2000. – С. 626 – 639.

6. Первая сессия Верховного Совета Белорусской ССР XII созыва: Стенографический отчёт // Советская Белоруссия. – 1990. – 26 – 29 июня.

7. Соглашение о создании Содружества Независимых Государств // Советская Белоруссия. – 1992. – 8 декабря.

## Асноўная літаратура

1. Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 ч. / М.П.Касцюк, І.Ф.Ігнаценка, У.І.Вышынскі і інш. – Мн.: Беларусь, 1995. – Ч. 2. – С. 420 – 427, 429 – 432, 434 – 438, 446 – 449, 455 – 456, 466 – 469.

2. Гісторыя Беларусі: Вучэбны дапаможнік: У 2 ч. /Пад рэд. Я.К.Новіка, Г.С.Марцуля. – Мн.: Універсітэцкае, 1998. – Ч. 2 – С. 370 – 378.

3. Актуальныя пытанні гісторыі БССР: (Сав. перыяд) / Склад. В.М.Фамін і інш.: Пад рэд. У.Н.Сідарцова. – Мн.: Нар. асвета, 1991. – С. 149 – 190.

4. Ковкель И.И., Ярмусик Э.С. История Беларуси. С древнейших времён до нашего времени. – Мн.: Аверсэв, 1998. – С. 570 – 589.

5. Страницы истории советского общества: Факты, проблемы, люди. – М.: Политиздат, 1989. – С. 375 – 430.

6. Эканамічная гісторыя Беларусі. – Мн.: Экаперспектыва, 1999. – С. 401 – 414.

7. Альдебер Ж., Бендер Й., Груша И. и др. История Европы. – Мн.: Выш. шк., 1996. – С. 376 – 379.

8. Алпеев Н. От застоя к перестройке: Развитие индустрии БССР в 70 – 80-е годы. – Мн.: 1990.

## Тэмы рэфератаў

1. Станаўленне шматпартыйнасці ў палітычнай сістэме БССР.
2. Аграрная палітыка ў БССР на этапе «перабудовы» (1985 – 1991 г.).

3. Пошук шляхоў пераходу да рыначнай эканомікі.
4. Міжнацыянальныя адносіны ў час «перабудовы».
5. Выбары ў Вярхоўны Савет рэспублікі XII склікання.
6. Стварэнне і дзейнасць Беларускага фонду культуры.

Тэма ахоплівае невялікі, але вельмі важны ў гісторыі савецкага грамадства перыяд – час перабудовы (1985 – 1991 г.). Менавіта тады пачаліся перамены, якія вызначылі «сучасны твар» грамадства, які сфарміраваўся на постсавецкай прасторы. «Перабудова» – няўдалая спроба рэфармавання савецкай мадэлі сацыялізму, якая прывяла да распаду СССР. Дарэчы, гэта пошукі шляхоў выйсця з эканамічнага, сацыяльнага, палітычнага, нацыянальнага крызісу, ахапіўшага савецкую краіну.

Прапануецца разгляд тэмы, зыходзячы з чатырох этапаў перабудовы. Першы (красавік 1985 – 1986 г.) – курс на паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, другі (1987 – 1988 г.) – выпрацоўка новай канцэпцыі перабудовы на аснове палітыкі галоснасці, акрэсленне рэформы палітычнай сістэмы, трэці (1989 – 1990 г.) – разгортванне далейшай дэмакратызацыі савецкага грамадства на фоне жорсткага эканамічнага крызіса, нарастання нацыянальных праблем і лавіравання М.С.Гарбачова, чацвёрты (1991 г.) – крызіс палітыкі М.С.Гарбачова, распад СССР і ўтварэнне СНД. Раскажыце аб змесце кожнага этапу. «Перабудова» садзейнічала дэмакратызацыі знешняй палітыкі Савецкага Саюза, што выклікала хвалю дэмакратычных пераменаў у краінах Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропы. Прааналізуйце па схеме: «прычыны, ход, асаблівасці, вынікі», «кастрычніцкую» рэвалюцыю ў ГДР, «пяшчотную» ў Чэхаславакіі, «крывавую» ў Румыніі. Чаму распалася сусветная сістэма сацыялізму? Адказ абгрунтуйце фактамі.

Пры вывучэнні другога пытання асноўную ўвагу сканцэнтруйце на двух момантах: выбарах і дзейнасці Вярхоўнага Савета БССР XII склікання і развіццю шматпартыйнасці ў нашай рэспубліцы. Адзначце тое новае, што было характэрна выбарам 1990 г. Што ўяўляла на той час апазіцыя? Паспрабуйце прасачыць працэс узнікнення палітычных партый у БССР і даць ім класіфікацыю па групах: правыя, левыя, цэнтрысцкія. Што азначае тэрмін «дыванныя партыі»?

Дагматычныя ўяўленні аб сацыялізме не дазволілі кіраўніцтву СССР здзейсніць эфектыўныя крокі па стварэнню новай эканамічнай мадэлі. Выхад быў знойдзены ў складанні шэрагу праграм («500 дзён» М.І.Рыжкова і інш.), якія насілі палавінчаты характар. Страх перад рыначнай эканомікай паглыбіў і захаваў экана-

мічны крызіс у СССР. Як вы ставіцеся да паняцця «сацыялізм з чалавечным тварам»? Ці можна стварыць планава-рыначную мадэль эканомікі?

Асаблівую вастрыню набыло нацыянальнае пытанне, якое старанна замоўчвалася на працягу існавання СССР. Паспрабуйце вызначыць перадумовы нацыянальнай праблемы. Як вы разумееце пазіцыю М.С.Гарбачова: «моцны цэнтр» – «моцныя рэспублікі»? Раскажыце аб «парадзе суверэнітэтаў».

Сакавіцкі (1991 г.) рэферэндум, Нова-агароўскія пагадненні, заключаныя паміж М.С.Гарбачовым і кіраўнікамі 9 рэспублік СССР, выбранне Б.М.Ельцына Прэзідэнтам РФ – усё гэта сведчыла аб слабасці СССР і неабходнасці перазаключэння саюзнага дагавора 1922 г. Але жнівеньскія падзеі 1991 г. паскорылі распад Савецкага Саюза. Раскрыйце прычыны крызісу «перабудовы».

Тэма патрабуе раскрыць ролю Беларускай ССР на міжнароднай арэне. Рэкамендуецца на аснове гістарычнага матэрыялу паказаць фармальны характар знешнепалітычнай самастойнасці Беларусі. Акцентуйце ўвагу на дзейнасці прадстаўніцтва БССР у ААН, развіцці сувязяў з краінамі Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропы ў межах Савета Эканамічнай Узаемадапамогі.

У гады «перабудовы» назіраюцца карэнныя перамены ў духоўным жыцці беларускага народа. У чым іх супярэчлівы характар? Як пачалося нацыянальна-культурнае адраджэнне ў БССР? Хто быў яго ініцыятарам?

Мэтазгодна выкарыстанне відэафільма «Распад СССР. Віскулі».

## Праверачны тэст

**1.** Падбярыце правільны адказ.

А. Вярхоўны Савет БССР прыняў Дэкларацыю аб суверэнітэце БССР:

а) 27 ліпеня 1990 г.;
б) 25 жніўня 1991 г.;
в) 19 верасня 1991 г.

Б. Рэзалюцыя «Аб галоснасці» была прынята на:

а) XXVI з’ездзе КПСС;
б) XIX Усесаюзнай канферэнцыі КПСС;
в) XXXI з’ездзе КПБ.

В. Першым старшынёй Прэзідыума Вярхоўнага Савета XII склікання быў абраны:

а) С.С.Шушкевіч;
б) А.А.Малафееў;
в) М.І.Дземянцей.

**2.** Згодна з якім прынцыпам створаны пералік:

А. А.М.Якаўлеў, Э.А.Шэварнадзэ, М.С.Гарбачоў.

Б. З.Пазняк, Л.Баршчэўскі, У.Заблоцкі, А.Трусаў.

В. Праграма М.І.Рыжкова, праграма Шаталіна-Яўлінскага, праграма М.С.Гарбачова.

Г. «Цукровы крызіс», «крызіс мыючых сродкаў», «чайны крызіс», «тытунёвы крызіс».

**3.** Ці згодны вы з наступнымі сцвярджэннямі:

А. Курс на паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця выліўся ў масавыя кампаніі па барацьбе з п'янствам і алкагалізмам, з непрацоўнымі прыбыткамі.

Б. Першы і апошні прэзідэнт СССР быў абраны на ІІ з'ездe народных дэпутатаў СССР.

В. Закон СССР «Аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі» выклікаў размежаванне перыядычных выданняў.

Г. Альтэрнатыўныя выбары ва ўмовах аднапартыйнасці прывялі да прынцыповых перамен у Вярхоўным Савеце БССР.

Д. У лютым 1991 г. адбыўся першы з'езд Беларускай сялянскай партыі.

Е. Рэспубліканская комплексная праграма «Інтэнсіфікацыя» павінна была забяспечыць пераход на агульнарэспубліканскі гаспадарчы разлік.

Ж. З 1985 г. эканамічная сітуацыя ў БССР набыла крызісны характар.

З. Знешнепалітычная канцэпцыя СССР на этапе перабудовы атрымала назву «палітыка новага мыслення».

**4.** Выявіце недакладнасці ў наступных сцвярджэннях:

А. Г.Х.Папоў, А.А.Сабчак, Е.К.Лігачоў, Б.М.Ельцын.

Б. «Дэмакратычная платформа ў КПСС», КПБ, «Марксісцкая платформа ў КПСС».

В. Закон «Аб арэндзе», «Кодэкс Беларускай ССР аб зямлі», Закон «Аб прыватызацыі», Закон «Аб сялянскай (фермерскай) гаспадарцы».

Г. У рэферэндуме па праблеме захавання СССР прынялі ўдзел жыхары рэспублік: Расійскай Федэрацыі, Беларусі, Украіны,

Азербайджана, Казахстана, Туркменістана, Таджыкістана, Кыргызстана, Узбекістана, Малдовы.

**5.** Прадоўжыце пералік у наступных сцвярджэннях:

А. У Дзяржаўны камітэт па надзвычайнаму становішчу ўваходзілі ...

Б. На V з'ездзе народных дэпутатаў СССР са складу СССР выйшлі ...

В. 26 жніўня 1991 г. Вярхоўны Савет рэспублікі прыняў Закон ... , 19 верасня 1991 г. ... , ... .

Г. ... , 18 кастрычніка 1991 г. – ... .

**6.** Падбярыце да кожнай падзеі адпаведную дату.

Падзеі:

А. XXVII з'езд КПСС.

Б. XXXI з'езд КПБ.

В. Аварыя на Чарнобыльскай АЭС.

Г. Выбары дэпутатаў на З'езд народных дэпутатаў СССР.

Д. Выбары ў Вярхоўны Савет БССР XII склікання.

Е. XIX Усесаюзная канферэнцыя КПСС.

Ж. Утварэнне СНД.

Даты:

а) люты-сакавік 1986 г.;

б) красавік 1986 г.;

в) чэрвень-ліпень 1988 г.;

г) 1989 г.;

д) сакавік 1990 г.;

е) снежань 1990 г.;

ж) снежань 1991 г.

**7.** Пра каго ідзе гаворка:

«Дзяржаўны дзеяч Беларусі, кандыдат эканамічных навук. У 1-й палове 80-х г. знаходзіўся на партыйнай рабоце, з 1985 г. выконваў абавязкі намесніка Старшыні Савета Міністраў БССР. З'яўляўся народным дэпутатам СССР у 1989 – 1991 г. У 1990 г. быў прызначаны Старшынёй Савета Міністраў БССР»?

**8. Запоўніце пропускі ў наступных сказах:**

А. Найбольш яркай постаццю ў гісторыі дэмакратычнага руху ў СССР быў акадэмік ...

Б. На ... месцаў у Вярхоўным Савеце БССР прэтэндавалі ... кандыдатаў ад тэрытарыяльных акруг ... дэпутатаў увайшлі ў Вярхоўны Савет рэспублікі ад чатырох грамадскіх арганізацый.

В. Партыі «левага» кірунку : ...

Г. Партыі «правага» кірунку : ...

***Адказы***

1. А – а; Б – б; В – в.
2. А – рэфарматарскае крыло ў КПСС; Б – лідары фракцыі БНФ; В – планы пераходу да рыначнай эканомікі (1990 г.); Г – нарастанне крызісу ў забеспячэнні насельніцтва таварамі шырокага спажывання.
3. А – так; Б – не; В – так; Г – не; Д – так; Е – так; Ж – не; З – так.
4. А – Я.К.Лігачоў; Б – КПБ; В – Закон «Аб прыватызацыі»; Г – Малдова.
5. А – Г.Янаеў, В.Паўлаў, Б.Пуга, У.Кручкоў, Д.Язаў, А.Бакланаў, В.Старадубцаў, А.Цізякоў; Б – Эстонія, Латвія, Літва; В – «Аб забеспячэнні палітычнай і эканамічнай самастойнасці БССР», «Аб назве Беларускай ССР», «Аб грамадзянстве РБ».
6. А – а; Б – е; В – б; Г – г; Д – д; Е – в; Ж- ж.
7. В.Ф.Кебіч.
8. А – А.Д.Сахараў; Б – 310, 1769, 50; В – Партыя камуністаў Беларусі, Беларуская сацыялістычная партыя, Ліберальна-дэмакратычная партыя Беларусі, Рэспубліканская партыя працы і справядлівасці; Г – Беларускі народны фронт «Адраджэнне», Беларуская хрысціянска-дэмакратычная злучнасць, Беларуская нацыянальная партыя, народна-дэмакратычная партыя Беларусі.

## ТЭМА 13

## РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ У 1991 – 2001 г.

### План

1. Грамадска-палітычнае жыццё Рэспублікі Беларусь:

а) дзейнасць Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь XII склікання;

б) Канстытуцыя РБ 1994 г.;

в) першыя прэзідэнцкія выбары ў Беларусі;

г) рэферэндумы 1995 і 1996 г.;

д) выбары ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага Сходу РБ (восень 2000 г.);

е) другія прэзідэнцкія выбары ў Беларусі.

2. Сацыяльна-эканамічнае развіццё РБ.

3. Змены ў духоўным і культурным жыцці беларускага народа ў 90-я г. XX ст.

4. Рэспубліка Беларусь у сусветным супольніцтве.

## Крыніцы

1. Закон РБ «Аб выбарах прэзідэнта РБ» // Звязда. – 1994. – 6 красавіка.

2. Закон РБ «Аб нацыянальных меншасцях у РБ» // Звязда. – 1992. – 19 чэрвеня.

3. История Беларуси в документах и материалах / Авт.-сост. И.Н.Кузнецов, В.Г.Мазец. – Мн.: Амалфея, 2000. – С. 640 – 657.

4. Канстытуцыя (Асноўны закон) Рэспублікі Беларусь // Звязда. – 1994. – 30 красавіка.

5. Основные направления социально-экономического развития Республики Беларусь на 1996 – 2000 годы. – Мн.: 1996.

## Асноўная літаратура

1. Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 ч. / М.П.Касцюк, І.М.Ігнаценка, У.І. Вышынскі. – Мн.: Беларусь, 1995. – Ч. 2. – С. 427 – 429, 432 – 434, 438 – 442, 449 – 451, 456 – 465, 469 – 487.

2. Гісторыя Беларусі: Вучэбны дапаможнік: У 2 ч. / Пад рэд. Я.К.Новіка, Г.С.Марцуля. – Мн.: Універсітэцкае, 1998. – Ч. 2. – С. 378 – 455.

3. Ковкель И.И., Ярмусик Э.С. История Беларуси. С древнейших времён до нашего времени. – Мн.: Аверсэв, 1998. – С. 570 – 589.

4. Эканамічная гісторыя Беларусі. – Мн.: Экаперспектыва, 1999. – С. 414 – 429.

5. Кто есть кто в Республике Беларусь (о деятелях национальной культуры, образования, науки). – Мн.: 1999.

6. Лыч Г.И. Рыночное реформирование экономики Беларуси: итоги и перспективы. – Мн.: 2000.

7. Раманоўскі І. Сучасныя палітычныя партыі на Беларусі // Беларускі гістарычны часопіс. – 1998. – № 1. – С. 31 – 37.

8. Беларусь на мяжы тысячагоддзяў. – Мн.: БелЭн, 2000. – С. 227 – 426.

## Тэмы рэфератаў

1. Палітычныя партыі ў РБ: гісторыя стварэння і дзейнасць.

2. Саюз Беларусі і Расіі: стан і перспектывы развіцця.

3. Прадпрымальніцтва ў Рэспубліцы Беларусь.

4. Фермерства на Беларусі.

5. Нацыянальна-культурнае адраджэнне ў Рэспубліцы Беларусь: дасягненні і супярэчнасці.

6. Канфесійная сітуацыя ў Рэспубліцы Беларусь.

7. Рэформа агульнаадукацыйнай школы ў Рэспубліцы Беларусь.

8. Усебеларускія народныя сходы 1996 і 2001 г.

Вывучэнне тэмы патрабуе ад студэнтаў больш глыбокай падрыхтоўкі з выкарыстаннем дадатковага матэрыялу перыядычнага друку. Гэта дапаможа зрабіць грунтоўны аналіз сучаснага развіцця краіны.

Беларусь атрымала незалежнасць і поўны суверэнітэт у выніку распаду СССР, а не шырокага нацыянальнага руху, як адбылося, напрыклад, у прыбалтыйскіх рэспубліках. Прасачыце жнівеньскія падзеі 1991 г. у Маскве і адносіны да іх партыйнага кіраўніцтва БССР. Якія рашэнні прыняла 5-я нечарговая сесія Вярхоўнага Савета БССР? У чым іх гістарычнае значэнне? Вызначальнай падзеяй на шляху да незалежнасці стала 6-я нечарговая сесія ВС БССР, якая адбылася ў верасні 1991 г. Пракаменціруйце яе рашэнні.

Вывучэнне грамадска-палітычнага жыцця Рэспублікі Беларусь мэтазгодна пачаць з аналізу законатваральнай дзейнасці Вярхоўнага Савета XII склікання. Дайце характарыстыку Канстытуцыі РБ, прынятай 15 сакавіка 1994 г.

Пераход да суверэнітэту выклікаў стварэнне новых органаў дзяржаўнай улады. Раскрыйце гэты працэс на прыкладзе сілавых ведамстваў, банкаўскай сістэмы і іншых устаноў.

Важнейшай падзеяй грамадскага жыцця рэспублікі сталі першыя прэзідэнцкія выбары (чэрвень 1994 г.). Колькі было кандыдатаў? Хто атрымаў перамогу на другім туры? Раскажыце біяграфію першага Прэзідэнта РБ А.Р.Лукашэнкі.

Падзеі 1995 – 1996 г. азнаменаваліся вострым супрацьстаяннем заканадаўчай і выканаўчай галін улады. Гэта прывяло да правядзення двух рэферэндумаў – майскага 1995 г. і лістападаўскага 1996 г. Ахарактарызуйце іх. Якія змены былі ўнесены ў Канстытуцыю РБ? Раскрыйце новую структуру палітычнай сістэмы, якая ўсталявалася ў краіне. Акцэнтуйце ўвагу на дзейнасці Нацыянальнага Сходу РБ, які прыняў больш за 400 законаў, у т.л. 18 кодэксаў.

У кастрычніку 2000 г. адбыліся выбары ў Палату прадстаўнікоў РБ, а ў верасні 2001 г. – другія прэзідэнцкія выбары. Раскажыце аб ходзе гэтых падзей.

Асаблівую вастрыню ў апошняе дзесяцігоддзе XX ст. набыло сацыяльна-эканамічнае пытанне. Якія шляхі выхаду з крызіса былі прапанаваны Прэзідэнтам РБ А.Р.Лукашэнкам у верасні 1994 г.? У верасні 1996 г.? Зрабіце іх аналіз. Раскрыйце станоўчыя перамены ў сацыяльна-эканамічным развіцці рэспублікі на сучасным этапе. Што ўяўляе «беларуская» мадэль эканомікі? Выкарыстоўваючы пасланне Прэзідэнта парламенту Беларусі ў 2002 г., вызначце перспектывы айчыннай эканомікі.

Галоўнай рысай духоўнага і культурнага жыцця беларускага грамадства ў 90-я гады XX ст. стала нацыянальнае адраджэнне. Раскажыце аб вяртанні да гістарычных каранёў, адраджэнні беларускай мовы, стварэнні сістэмы нацыянальнай адукацыі, развіцці беларускай літаратуры, тэатра, жывапісу.

Аналіз міжнароднага становішча РБ неабходна пачаць з характарыстыкі «Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР» і яе асноўных прынцыпаў. Як пашырылася дзейнасць нашай краіны ў сусветным супольніцтве пасля 1991 года? Раскажыце аб вывадзе ядзернай зброі з тэрыторыі рэспублікі і далучэнні да ліку безядзерных дзяржаў. Прасачыце ўдзел РБ у дзейнасці сусветных і еўрапейскіх арганізацый. Як змяніліся ўзаемаадносіны з заходнімі краінамі пасля 1996 г. і чаму?

Звярніце ўвагу на інтэграцыйныя працэсы на постсавецкай прасторы. Прасачыце этапы складвання беларуска-расійскага саюза. Як вы бачыце яго перспектывы? Вызначце перашкоды на гэтым шляху.

## Праверачны тэст

**1.** Падбярыце правільны адказ:

А. Дзень Незалежнасці РБ адзначаецца як свята:
- а) 3 ліпеня;
- б) 27 ліпеня;
- в) 25 жніўня.

Б. Дагавор аб Саюзе Беларусі і Расіі падпісалі ў Маскве Прэзідэнты РБ А.Р.Лукашэнка і РФ Б.М.Ельцын:
- а) 2 сакавіка 1996 г.;
- б) 15 мая 1995 г.;
- в) 2 красавіка 1997 г.;
- г) 24 лістапада 1996 г.

В. Дзяржаўнымі сімваламі Рэспублікі Беларусь з’яўляюцца:
- а) Канстытуцыя РБ;
- б) Дзяржаўны герб;
- в) Дзяржаўны сцяг;
- г) Дзяржаўны гімн.

Г. Згодна з Законам «Аб дзяржаўных узнагародах Рэспублікі Беларусь» вышэйшай ступенню адзнакі з'яўляецца:

а) Ордэн Кастуся Каліноўскага;
б) Ордэн Францыска Скарыны;
в) медаль «Герой Беларусі»;
г) медаль «За адвагу».

**2.** Згодна з якім прынцыпам створаны пералік:

А. С.Шушкевіч, М.Грыб, С.Шарэцкі.

Б. А.Дубко, В.Кебіч, А.Лукашэнка, В.Новікаў, З.Пазняк, С.Шушкевіч.

В. В.Кебіч, М.Чыгір, С.Лінг, У.Ярмошын.

Г. РБ, Казахстан, Кыргызстан, РФ.

**3.** Ці згодны вы з наступнымі сцвярджэннямі:

А. Абвяшчэнне Рэспублікі Беларусь стала вынікам шырокага нацыянальна-вызваленчага руху ў рэспубліцы.

Б. Паглыбленне эканамічнага крызісу на Беларусі ў 1-й палове 90-х г. XX ст. было выклікана дэзінтэграцыйнымі працэсамі на постсавецкай прасторы.

В. Афіцыйнае двухмоўе ў Рэспубліцы Беларусь абвясціла Канстытуцыя РБ 1994 г.

Г. Згодна з лістападаўскім рэферэндумам 1996 г. змянілася структура палітычнай сістэмы Беларусі.

Д. Мэтай эканамічных рэформ, праводзімых у Беларусі напрыканцы XX ст., з'яўляецца пабудова сацыяльна-арыентаванай рыначнай эканомікі.

Е. У знешнепалітычным курсе Рэспубліка Беларусь прытрымліваецца нейтралітэту і безядзернасці.

**4.** Выявіце недакладнасці ў наступных сцвярджэннях:

А. В.Чыкін, С.Калякін, В.Новікаў.

Б. АГП, БСДГ, БСДП (НГ), ПКБ.

В. А.Малафееў, П.Шыпук, С.Шарэцкі.

Г. С.Гайдукевіч, У.Ганчарык, С.Домаш, А.Лукашэнка.

**5.** Прадоўжыце пералік у наступных сцвярджэннях:

А. У сумеснай кампетэнцыі Прэзідэнта і Нацыянальнага Сходу знаходзіцца прызначэнне вышэйшых службовых асоб ...

Б. 14 мая 1995 г. па ініцыятыве Прэзідэнта РБ адбыўся агульнарэспубліканскі рэферэндум, на якім разглядаліся наступныя пытанні: ...

В. Лідэры Вярхоўнага Савета XIII склікання ...

Г. Для рэалізацыі мэтаў Саюзнай дзяржавы РБ і РФ ствараюцца ...

**6.** Падбярыце да кожнай падзеі адпаведную дату.

Падзеі:

А. Дагавор аб стварэнні Саюзнай дзяржавы.
Б. Падпісанне РБ Хельсінкскага заключнага акта.
В. Другія прэзідэнцкія выбары.
Г. Прыняцце Палатай прадстаўнікоў выбарчага кодэкса.
Д. 1-ы Усебеларускі народны сход.
Е. 2-і Усебеларускі народны сход.
Ж. Прыняцце Канстытуцыі РБ.

Даты:

а) 26 лютага 1992 г.;
б) 15 сакавіка 1994 г.;
в) кастрычнік 1996 г.;
г) 8 снежня 1999 г.;
д) студзень 2000 г.;
е) май 2001 г.;
ж) 9 верасня 2001 г.

**7.** Пра каго ідзе гаворка:

«Ураджэнка Гродзеншчыны. У 1967 г. пасля заканчэння БДУ працавала ў Гродне ў гаркоме камсамола, на абласным тэлебачанні. Была галоўным рэдактарам літаратурна-драматычных перадач Беларускага тэлебачання, рэдактарам часопіса «Спадчына», штотыднёвіка «Культура». У 2001 г. была абрана старшынёй Саюза беларускіх пісьменнікаў»?

**8.** Запоўніце пропускі ў наступных сказах:

А. Заканадаўчым органам улады Рэспублікі Беларусь з лістапада 1996 г. з'яўляецца ... , які складаецца з ... палат: ... і ... . Вышэйшым выканаўчым органам улады з'яўляецца ... на чале з ... . Кіраўнік дзяржавы – ... .

Б. У выніку перарэгістрацыі партый, грамадскіх рухаў і арганізацый, праведзенай у пачатку 1999 г., у РБ дзейнічаюць ... палітычных партый, ... рэспубліканскіх прафсаюзаў, ... міжнародныя і рэспубліканскія грамадскія арганізацыі.

В. Да канца 1999 г. у Беларусі было зарэгістравана ... прадпрыемстваў з замежным капіталам з ... краін.

## *Адказы*

1. А – а; Б – в; В – б, в, г; Г – в.

2. А – старшыні Вярхоўнага Савета РБ; Б – кандыдаты ў прэзідэнты РБ падчас першых прэзідэнцкіх выбараў; В – старшыні Савета Міністраў РБ; Г – краіны – удзельніцы Мытнага саюза.

3. А – не; Б – так; В – не; Г – так; Д – так; Е – так.

4. А – В.Чыкін; Б – ПКБ; В – С.Шарэцкі; Г – Л.Сініцын.

5. А – прэм'ер-міністра, старшыню Канстытуцыйнага, Вярхоўнага, Вышэйшага і Гаспадарчага судоў, старшыні праўлення Нацыянальнага банка, генеральнага пракурора Рэспублікі; Б – «Ці згодны Вы з наданнем рускай мове статуса, роўнага з беларускай?», «Ці падтрымліваеце Вы прапанову пра ўстанаўленне новых Дзяржаўнага сцяга і Дзяржаўнага герба РБ?», «Ці падтрымліваецце Вы дзеянні Прэзідэнта РБ, скіраваныя на эканамічную інтэграцыю з Расійскай Федэрацыяй?», «Ці згодны Вы з неабходнасцю ўнясення змен у Канстытуцыю РБ, якія прадугледжваюць магчымасць датэрміновага спынення паўнамоцтваў ВС Прэзідэнтам РБ у выпадках сістэматычнага або грубага парушэння Канстытуцыі?»; В – С.Шарэцкі, С.Багданкевіч, А.Лябедзька, В.Ганчар, С.Калякін; Г – Вышэйшы Дзяржаўны Савет, парламент, Савет Міністраў, Суд, Падліковая палата.

6. А – г; Б – а; В – ж; Г – д; Д – в; Е – е; Ж – б.

7. В.М.Іпатава.

8. А – Нацыянальны Сход РБ, 2, Палаты прадстаўнікоў Савета Рэспублікі, Савет Міністраў РБ, прэм'ер-міністрам, Прэзідэнт РБ;
Б – 17, 38, 644;
В – 2400, 68.

ЗМЕСТ

Прадмова....................................................................................3

Тэма 1. Спадчына старажытнага свету і яе ўплыў на Беларусь..........................................................................5

Тэма 2. Беларусь у час станаўлення хрысціянскіх цывілізацый...........................................................................9

Тэма 3. Вялікае княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае, яго роля і месца ў гісторыі Еўропы (2-я палова XIII – 1-я палова XVI ст.)............................................15

Тэма 4. Кансалідацыя беларускай народнасці. Рэлігія і культура Беларусі ў XVI – 1-й палове XVII ст...........................................26

Тэма 5. Беларусь у складзе Рэчы Паспалітай (1569 – канец XVIII ст.)...............................................35

Тэма 6. Нараджэнне індустрыяльнай цывілізацыі і яе ўплыў на Беларусь (канец XVIII – 1-я палова XIX ст.).................42

Тэма 7. Беларусь ў перыяд станаўлення буржуазнага грамадства (2-я палова XIX ст. – люты 1917 г.)............48

Тэма 8. Беларусь у перыяд Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. і грамадзянскай вайны.................................................57

Тэма 9. Беларусь у міжваенны час...........................................63

Тэма 10. Беларусь у гады другой сусветнай вайны......................69

Тэма 11. Беларусь ва ўмовах супрацьстаяння сусветных звышкраін (2-я палова 40-х – 1-я палова 80-х г. XX ст.)...........................................................76

Тэма 12. Беларусь у перыя крызісу і распаду СССР як унітарнай дзяржавы (1985-1991г.)................................82

Тэма 13. Рэспубліка Беларусь у 1991-2001 г..................................88

Вучэбнае выданне

**ТЭМАТЫКА І МЕТАДЫЧНЫЯ ПАРАДЫ ПА КУРСЕ «ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ»**
для студэнтаў негістарычных спецыяльнасцей

Складальнікі:

**Крэнь** Іван Платонавіч
**Белазаровіч** Віктар Аляксандравіч
**Сілава** Святлана Уладзіміраўна і інш.

Рэдактар Н.П.Дудко
Камп'ютарная вёрстка: Т.А.Каваленка

Здадзена ў набор 12.08.2002. Падпісана да друку 21.10.2002.
Фармат 60x84/16. Папера афсетная №1.
Друк афсетны. Гарнітура Таймс.
Ум.друк.арк.5,58. Ул.-выд.арк.6,25. Тыраж экз. Заказ .

Установа адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы».
ЛВ №96 ад 02.12.97. Вул. Пушкіна, 39, 230012, Гродна.

Надрукавана на тэхніцы выдавецкага аддзела Установы адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы».
ЛП №111 ад 29.12.97. Вул. Пушкіна, 39, 230012, Гродна.